Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

# ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 23 (4466) 6 чэрвеня 2008 г.

## У нумары:

**Любіць і чытаць сваё**

Планы часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Нёман» і «Всемирная литература» на II паўгоддзе і радуюць, і па-добраму ўражваюць.

Стар. 4

**Жыццяпіс паэта і мастака**

Аўтары кніг паэзіі і графікі «Нетры» і «Палын. Чарнобыль» — прэтэндэнты на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Стар. 5

**Вяртанне**

Раман-хроніка М. Елянеўскага «Время пастыря» — у шэрагу лепшых на тэму праваслаўя.

Стар. 7

**Жыццё — без тыдня 45 гадоў**

Месца знаходжання магілы Максіма Гарэцкага дагэтуль невядома.

Стар. 12

**«Ён дбае пра сваю публічнасць»**

Пісьменнікі вачыма іхніх жонак.

Стар. 13

**ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.**

***Для індывідуальных падпісчыкаў:*** 1 месяц — 6720 руб. Падпісны індэкс — 63856

***Ведамасная падпіска:*** 1 месяц — 8710 руб. Падпісны індэкс — 638562

***Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў:*** другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63815

***Льготная падпіска:*** 1 месяц — 6820 руб. Падпісны індэкс — 63880

***Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!***

# Наша святая заступніца

**Напярэдадні свята ўшанавання памяці беларускай першаасветніцы, найпадобнай Еўфрасінні Полацкай — Дня 5 чэрвеня — наш карэспандэнт звярнуўся з шэрагам пытанняў да пісьменніцы Валянціны Коўтун, творчыя набыткі якой, асабліва раман-жыціе "Пакліканыя", надрукаваны сёлета выдавецтвам "Мастацкая літаратура", а таксама кінараман "Спасам пакліканыя" і драматычная містэрыя "Крыж ігуменні" (часопісы "Полымя" і "Маладосць"), цесна звязаны з імем святой Апякункі беларускага народа.**

*— І першае пытанне штотыднёвіка: якое месца займае святая ігумення з Полацка ў беларускай гістарычнай рэальнасці?*

— Няма безыменнай гісторыі. На яе старонках накрэслены чалавечыя імёны. І нярэдка гэта — імя Жанчыны, якая, пачынаючы з XI —XII стст., паказвае свету свой цудоўны і трагічны, як на фрэсках Спаса-Еўфрасіннеўскага сабора ў Полацку, унутраны свет. І — свой велічны Дух, без дзейства якога немагчыма ўявіць разгортвання ў прасторы і часе катэгорыі святасці. Пра тое думалася многім з маіх каляжанак яшчэ ў 1993 годзе падчас стварэння Усебеларускага жаночага фонду Святой Еўфрасінні Полацкай, дзякуючы якому праз год, пры падтрымцы ўладыкі Філарэта, у Беларусі распачалося святкаванне 5 чэрвеня як Агульнанароднага дня Святой Еўфрасінні Полацкай.

Што да дня ўшанавання памяці нябеснай Апякункі беларусаў, то ён быў задуманы, і затым штогод спраўджваўся як дзень яднання народа, перасякаючы нацыянальныя, палітычныя, рэлігійныя бар'еры. Адразу ж было відавочна, што 5 чэрвеня стане, па сутнасці, святам Беларускай Жанчыны-асветніцы. Дарэчы, невыпадкова і тое, што першы маршрут Лампады з Благадатным Агнём кіраваўся, праз Жыровічы, менавіта ў Полацк да мошчаў слыннай Апякункі. Гэта была справа папулярызацыі і ўслаўлення спадчыны нашай велічнай зямлячкі. Дзеля таго, каб увайшла святая ігумення ў кожную беларускую сям'ю. І не толькі як кананізаваная асоба, але, адпаведна, як найпершая памочніца ва ўсіх каардынатах быцця і жыцця, наша дабрадзейная спарадніца і ахоўніца, вялікая малельніца за народ і кожнага з нас.

*— Аднак, колькі слоў пра гісторыю жыцця святой Еўфрасінні.*

— Ад раннефеадальнай Полацкай дзяржавы, прарадзімы беларусаў, нас аддзяляюць болей васьмі стагоддзяў, але менавіта з XII, "яко луна солнечная", пранізвае гістарычныя пласты святло, без якога немагчыма ўявіць наш спрадвечны духоўны і культурны росквіт. Гэта святло дзейнасці дачкі полацкага князя Святаслава-Георгія, першаасветніцы сярэднявечча Еўфрасінні (свецкае імя Прадслава; 1102 (?) — 23. 05.1173), адной з самых адукаваных жанчын свайго часу, пакліканай і абранай Госпадам Слова на служэнне. Адна з першых жанчын-палітыкаў, умелы дыпламат і міратворца, Еўфрасіння ўмела быць не толькі міласэрнай да тых, хто пакутуе, але таксама спыняць міжусобныя княжаскія войны, стаўшы сімвалам духоўнага абнаўлення чалавека. Пра гэта, вядома, думалася мне не толькі ў самай першай паездцы з Лампадай, дзе цепліўся агонь ад Дамавіны Гасподняй, у Полацк разам з Марыяй Захарэвіч і руплівіцай хрысціянскай справы Нінай Загорскай, але і ў наступныя нашы паломніцтвы.

*— А як разгортвалася мастацкае мысленне пісьменніцы?*

— Доўгія гады Свята-Еўфрасіннеўскай працы для мяне асабіста завяршыліся ўрэшце творчай з'явай: напісаннем першага ў Беларусі рамана-жыція "Пакліканыя". Гэта яна, святая апякунка наша, гэта яе велічная асветніцкая думка, магутная вера, яе касмічная малітоўнасць пасёння напаўняюць людскія сэрцы духоўнай моцай, прасвятляючы геаграфічную і часавую прастору Беларусі асаблівай святасцю Будучыні і патрабуюць ад кожнага новага асэнсавання і таго, што зроблена, і таго, што маем зрабіць.

*— У гэтай сувязі — вашы асабістыя спадзяванні?*

— У сувязі з выхадам Свята-Еўфрасіннеўскага рамана, а таксама надрукаваннем драматычнага твора і маіх кінаматэрыялаў, прысвечаных Еўфрасінні Полацкай, дарэчы, не толькі ў часопісах, але і ў штотыднёвіку "ЛіМ", хочацца верыць, што асоба ігуменні знойдзе годнае высокамастацкае ўвасабленне на тэатральнай сцэне і ў кіно.

**Валянціна МІКАЛАЕВА**

# Душа Грузіі

**Выстаўка твораў выдатнага грузінскага мастака Ніко Пірасмані адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Яна прадстаўляе дваццаць чатыры найбольш вядомыя работы з тых ста шасцідзесяці, што захоўваюцца ў Нацыянальным музеі Грузіі. Унікальная экспазіцыя прабудзе ў Мінску да сярэдзіны жніўня.**

Яго карціны рэдка пакідаюць Тбілісі. У сярэдзіне 1980-х гадоў яны экспанаваліся на вядомай выстаўцы "Масква — Парыж". Залетась буйная выстаўка яго работ ладзілася ў Кіеве, плануецца экспазіцыя ў Парыжы. Так што беларускія гледачы атрымалі сапраўды рэдкасны падарунак — дзякуючы дамоўленасці галоўных мастацкіх скарбніц дзвюх краін і падтрымцы Банка Грузіі.

Творцу-самавука, народжанага ў сялянскай сям'і — народжанага маляваць! — называлі "геніем наіўнага мастацтва", "мастаком з анёлам на пэндзлю". Яго ставілі поруч з Анры Русо, з Іванам Генералічам, але хутка заўважалі недарэчнасць такога параўнання. Бо "прымітыўны", "наіўны" жывапіс апантанага маляваннем грузіна, выхаванага на старажытных царкоўных фрэсках ды літаграфіях з іранскіх кніжак, на лубочных рускіх карцінках ды часопісных ілюстрацыях, на ўроках вандроўных мастакоў, якія распісвалі шыльды ў Тыфлісе, ды першых фатаграфіях, што вывешваліся ў гарадскіх дамах, — гэты жывапіс вылучаецца сярод вышыняў інсітнага мастацтва сваёй непараўнальнасцю і неразгаданасцю.

Выстаўка Пірасмані, як падкрэсліў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Грузіі ў нашай краіне Давід Залкаліяні, — першая ластаўка ў развіцці двухбаковых адносін Беларусі і Грузіі. Культурныя сувязі, на яго думку, — галоўнае ў нашых стасунках, і таму вялікую ўвагу грузінскія партнёры будуць надаваць супрацоўніцтву ў культурнай і духоўнай сферах. Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір Пракапцоў падкрэсліў, што з адкрыццём гэтай выстаўкі аднаўляюцца міжмузейныя кантакты дзвюх краін. Ужо ёсць дамоўленасць з дырэктарам Нацыянальнага музея Грузіі не толькі развіваць міжмузейныя кантакты, але і праводзіць абменныя выстаўкі сучасных мастакоў.

Дабрыня, адкрытасць, шчырасць і светлая смуга выяў стварае ў выставачнай зале асабліву атмасферу. Гледачы блукаюць па крузе, углядаючыся ў вабныя і таямнічыя вочы сялян, мяшчан, каўказскіх прыгажунь, дзяцей, рахманых жывёл... Класік грузінскай літаратуры казаў: "Бачыш Пірасмані — і разумееш Грузію".

**Святлана БЕРАСЦЕНЬ**

***На здымку: пасол Грузіі Д. Залкаліяні і заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі У. Тоўсцік.***

***Фота аўтара***

З нагоды

# Вітанне балгарскім сябрам

З Саюза балгарскіх пісьменнікаў прыйшоў ліст за подпісам старшыні Мікалая Пецева і вядомага балгарскага паэта Любаміра Леўчава. Вось што пішуць сябры з сонечнай краіны: "У духу і традыцыях новай балгарскай духоўнай гісторыі ў нашай краіне праводзяцца міжнародныя сустрэчы выдатных пісьменнікаў, паэтаў і крытыкаў усяго свету з даказаным асабістым творчым і грамадскім укладам у справу развіцця сучаснай цывілізацыі. Відаць, вы ўспамінаеце, што і ў гады "халоднай вайны" Міжнародныя пісьменніцкія сустрэчы, якія праводзіліся ў Сафіі пад агульнай ідэяй "Мір — надзея планеты", у многім з'яўляліся адным з мастоў, што па-сапраўднаму звязвалі пісьменнікаў усяго свету. Чарговы такі форум пад агульнай тэмай "Сіла і слабасць слоў у эпоху інфармацыі" адбудзецца з 7 па 13 чэрвеня ў Сафіі і Варне пад патранатам Прэзідэнта Рэспублікі Балгарыя Георгія Парванава..."

Напрыканцы 2006 года прадстаўнічая балгарская дэлегацыя ўдзельнічала ў з'ездзе Саюза пісьменнікаў Беларусі. Вітаў беларускіх сяброў з трыбуны з'езда Мікалай Пецеў. У рабочых сустрэчах прынялі ўдзел дзіцячая пісьменніца Мая Дылгічава, публіцыст, вучоны Дзмітрый Генчаў. Сустрэча з балгарскімі літаратарамі прынесла новыя планы, надала новы імпульс балгарска-беларускім літаратурным стасункам. Перакладаюцца на беларускую мову казкі Маі Дылгічавай. Яна, між іншым, — і леташні госць Беларусі. Удзельнічала ў "круглым стале", які Міністэрства інфармацыі краіны арганізавала разам з часопісам "Всемирная литература" ў рамках Дня беларускага пісьменства. У адным з беларускіх выдавецтваў падрыхтавана да друку вострая публіцыстычная кніга Мікалая Пецева.

Вітаючы балгарскіх сяброў з нагоды выключна важнага творчага форуму, хацелася б заўважыць наступнае. Сафійская сустрэча пісьменнікаў — яшчэ адно выразнае спадзяванне на тое, што мастацкая літаратура, слова здольны супрацьстаяць разбурэнню духоўнасці, знішчэнню маралі і гуманізму. Цывілізацыя чалавецтва — і гэта заўсёды дэкларыравалі сафійскія сустрэчы пад ідэяй "Мір — надзея планеты" — павінна рухацца да пазітыўнай будучыні. Вопыт папярэдніх стагоддзяў, многія палітычныя і сацыяльныя катаклізмы пераконваюць: вельмі лёгка аказацца на мяжы, за якой — цемрашальства, духоўнае гібенне, страта маральнага і следам фізічнага здароўя народаў і нацый.

...Заўтра, у самы пярэдадзень высокай сустрэчы, госці і гаспадары ўскладуць кветкі да магілы сусветна вядомага балгарскага пісьменніка Івана Вазава. А ў суботу, следам за вітаннем Прэзідэнта Рэспублікі Балгарыя Георгія Парванава, пачнецца першае пасяджэнне. І ў гэты ж дзень пісьменнікі ўскладуць кветкі да помніка Аляксандру Пушкіну ў Сафіі. У праграме пісьменніцкай сустрэчы — спецыяльныя даклады ў гонар юбілею Аніз Кольц, прэзідэнта Еўрапейскай паэтычнай акадэміі, і ў знак ушанавання памяці Алена Боске.

...Перамаўляючыся ў гэтыя дні са старшынёю Саюза балгарскіх пісьменнікаў, я запытаў у Мікалая Пецева, што ён чакае ад Міжнароднай пісьменніцкай сустрэчы ў Сафіі. І вось што пачуў у адказ:

— Мы вырашылі сабрацца пісьменніцкай грамадой, каб на ўвесь голас нагадаць свету, што шлях разбурэнняў, канфліктаў — гэта дэканструктыўны шлях. Развіццё цывілізацыі, прагрэсу магчымыя толькі ў міры і згодзе. І дзеля іх умацавання пісьменніцкае слова можа зрабіць многае.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**

**У Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя пад назвай "Сучасная беларуская літаратура і працэсы славянскага культурна-цывілізацыйнага ўзаемадзеяння", якую ладзіў Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.**

# Літаратура — складнік нацыянальнай культуры

Распачынаючы пленарнае пасяджэнне, дырэктар інстытута Аляксандр Лукашанец адзначыў, што мерапрыемства прысвечана актуальным праблемам развіцця беларускай літаратуры і беларускага літаратуразнаўства, разнастайным аспектам міжславянскага культурнага і літаратурнага ўзаемадзеяння. Выбар менавіта такой тэматыкі невыпадковы.

Па-першае, правядзенне навуковых канферэнцый з'яўляецца адным з галоўных паказчыкаў навуковага ўзроўню арганізацыі і яе аўтарытэту. Такія канферэнцыі раней ладзіліся ў былым Інстытуце

літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі. Аляксандр Аляксандравіч выказаў спадзяванне, што яны стануць традыцыйнымі і ў аб'яднаным інстытуце.

Па-другое, на працягу мінулага XX стагоддзя развіццё беларускай літаратуры было настолькі імклівым і інтэнсіўным, што яна заняла дастойнае месца і атрымала прызнанне не толькі ў славянскім культурна-літаратурным абшары, але і ў сусветным літаратурным працэсе. Творы айчынных празаікаў, драматургаў і паэтаў перакладзены на шматлікія мовы свету. Іх ведаюць і чытаюць далёка за межамі нашай краіны. А даследаванні нашых літаратуразнаўцаў вядомыя і карыстаюцца аўтарытэтам у замежных навукоўцаў. І ў сённяшні складаны і супярэчлівы час літаратурнае жыццё не затухае, а наадварот шырыцца і развіваецца, набывае новыя рысы, фарміруе новыя напрамкі. Усё гэта дазваляе разглядаць сучасную беларускую літаратуру не як вузкую нацыянальна-культурную з'яву, а як частку сусветнага літаратурнага працэсу. Менавіта гэта акалічнасць дае магчымасць даследаваць родную літаратуру не ізалявана, а ва ўзаемадзеянні з іншымі славянскімі і неславянскімі літаратурамі. Гэтым была абумоўлена і праблематыка навукова-практычнай канферэнцыі, якая засведчыла, што беларуская літаратура развіваецца ў адпаведнасці з сучасным сусветным літаратурным працэсам.

Па-трэцяе, канферэнцыя арганізавана ў год святкавання 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, што вельмі сімвалічна, бо менавіта ў гэтай установе пачалі праводзіцца паслядоўныя навуковыя даследаванні маладой беларускай літаратуры, гістарычнай літаратурнай спадчыны. Менавіта тут сфарміравалася ядро беларускага літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі, а таксама навуковыя школы, якія ў значнай ступені вызначылі і напрамкі развіцця літаратурнага працэсу.

На сучасным этапе развіцця грамадства філалагічная навука набывае новы змест і значэнне. Гэта абумоўлена перш за ўсё працэсамі міжнароднай інтэграцыі і глабалізацыі, якія ў сваю чаргу параджаюць адваротны працэс, скіраваны на захаванне нацыянальнай адметнасці, нацыянальных моў і культур. А нацыянальная літаратура, як вядома, складае найважнейшую частку нацыянальнай культуры, раскрывае менталітэт народа, яго светабачанне, фарміруе нацыянальны твар дзяржавы. Гэты аспект беларускай гуманітарнай навукі асабліва актуалізуецца на пачатку XXI стагоддзя, на сучасным этапе інтэнсіўнага будаўніцтва нашай незалежнасці. Таму што толькі з выразным, нацыянальна адметным абліччам наша краіна можа разлічваць на дастойнае месца ў сусветнай супольнасці.

Паказальна, што сёння патрабуюцца новыя падыходы да вывучэння беларускай літаратуры, да асэнсавання яе ролі ў фарміраванні асобы, якая жыве ў шматкультурным сучасным свеце і разам з тым ведае сваю гісторыю, сваю культуру, выразна ўсведамляе нацыянальныя прыярытэты і валодае высокай нацыянальнай свядомасцю. Усё гэта накладвае адказнасць як на сучасных літаратараў, так і на даследчыкаў нашай літаратурнай спадчыны і бягучага літаратурнага працэсу. У гэтых адносінах у першую чаргу перад акадэмічным літаратуразнаўствам паўстаюць актуальныя праблемы новага погляду на сучасную беларускую літаратуру, на яе месца ў культурна-выхаваўчым працэсе.

Рэаліі моўнай сітуацыі, якія склаліся ў XX стагоддзі, парадзілі феномен беларускага літаратурнага поля і спецыфіку літаратурнай кампетэнцыі нашых грамадзян. Так, побач з беларускай літаратурай двухмоўным грамадзянам нашай краіны даступна і руская, якая да нядаўняга часу ўсведамлялася часткай агульнанацыянальнай літаратуры. Аднак, з аднаго боку, у сённяшніх палітычных умовах яна фактычна становіцца замежнай. З другога боку, той факт, што руская мова з'яўляецца дзяржаўнай, абумоўлівае яе спецыфічнае месца ў культурнай прасторы беларусаў, якое не можа зводзіцца да проста замежнай літаратуры.

Сёння рэальнасцю стала наяўнасць значнага пласта беларускай рускамоўнай літаратуры. Таму, важнай тэарэтычнай праблемай, якая выступае перад беларускімі літаратуразнаўцамі, трэба лічыць высвятленне менавіта месца рускамоўнай літаратуры Беларусі ў літаратурным працэсе і яе ролю ў адлюстраванні нацыянальных прыярытэтаў на сучасным этапе дзяржаўнага будаўніцтва і выхаванні нацыянальна арыентаванай патрыятычнай асобы...

Дырэктар РВУ "Літаратура і Мастацтва" Алесь Карлюкевіч прывітаў удзельнікаў канферэнцыі і пажадаў высокага плёну ў працы. Агульнасць і еднасць славянскіх народаў — гэта яшчэ і ўшанаванне і ўганараванне кожнай нацыянальнай літаратуры паасобку, вылучэнне нацыянальнай літаратуры ў справе выхавання грамадства. Алесь Мікалаевіч падкрэсліў, што на старонках кніг, якія выходзяць у РВУ "Літаратура і Мастацтва", — у часопісах "Полымя", "Маладосць", "Нёман", газеце "ЛіМ" — якраз і ёсць тая прастора для распрацоўкі гэтай праблематыкі, для развіцця і захавання традыцый беларускага літаратуразнаўства, гісторыі айчыннай літаратуры... Напярэдадні Дня беларускага пісьменства Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова і часопіс "Всемирная литература", які ўваходзіць у яе склад, рыхтуюць і правядуць традыцыйны "круглы стол", на якім будзе ісці размова пра пытанне мастацкага перакладу, прадстаўленне беларускай літаратуры ў свеце. А. Карлюкевіч запрасіў усіх жадаючых да ўдзелу ў дыскусіі.

Таксама слова бралі галоўныя рэдактары часопіса "Нёман" і газеты "Літаратура і мастацтва", адпаведна, Міхась Пазнякоў і Анатоль Казлоў, акадэмік Уладзімір Гніламёдаў.

У навуковай частцы пасяджэння са сваімі дакладамі выступілі в.а. намесніка дырэктара Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, доктар філалагічных навук Валерый Максімовіч ("Сучасная беларуская літаратура ў парадыгме часу"), галоўны навуковы супрацоўнік, доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась Мушынскі ("Рэцэпцыя творчасці Якуба Коласа ў сучасных умовах. Тэксталагічныя аспекты праблемы"), галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, доктар філалагічных навук Васіль Жураўлёў ("Покліч часу і літаратурныя крытэрыі"), загадчык кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны, доктар філалагічных навук Іван Штэйнер ("Перспектывы літаратуры класічнага тыпу III тысячагоддзя").

Далей работа вялася па шасці секцыях, у якіх удзельнічалі прадстаўнікі НАН Беларусі, вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў нашай краіны. Абмяркоўваліся разнастайныя пытанні і праблемы развіцця сучаснай літаратуры, асаблівасці творчасці айчынных пісьменнікаў, прыкладам, Янкі Купалы, Андрэя Мрыя, Уладзіміра Караткевіча, Янкі Брыля, Міхася Стральцова, Яўгеніі Янішчыц, Таісы Бондар...

**Віктар КАВАЛЁЎ**

***На здымках: падчас правядзення міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі.***

***Фота аўтара***

# *Рамантычна і з гумарам*

Імпрэза, прысвечаная "Ночы музеяў", адбылася 17 мая ў Літаратурным музеі Янкі Купалы. У ёй прынялі ўдзел вядомыя беларускія паэты і барды, а вялі гэты літаратурна-музычны вечар майстры паэтычнага слова, цудоўная сямейная пара — Віктар Шніп і Людміла Рублеўская. Таленавіты беларускі бард Наталля Пушкарова выканала некалькі сваіх песень, якія добра былі сустрэты ўсімі прысутнымі. Стварыць цёплую атмасферу вечара дапамагло таксама выступленне слыннага лірычнага паэта (а з нядаўняга часу яшчэ і кампазітара) Міколы Шабовіча, у выкананні якога прагучалі не толькі цудоўныя вершы, але і пародыі на творы беларускіх паэтаў.

Сапраўдны фурор зрабіла міні-прэзентацыя новай кнігі М. Шабовіча "Хор болей не спявае", у якой змешчана вялікая колькасць пародый на вершы такіх паэтаў, як Р. Баравікова, Л. Дранько-Майсюк, Н. Гальпяровіч, А. Зэкаў, М.Мятліцкі, Л. Галубовіч, В. Шніп, а таксама шмат эпіграм і прысвячэнняў. Кніга багата аздоблена цудоўнымі ілюстрацыямі вядомага беларускага мастака Алега Карповіча, які таксама прысутнічаў на імпрэзе і атрымаў сваю "порцыю" апладысментаў: у кнізе змешчана ажно 60 прыгожых шаржаў гэтага таленавітага мастака — шаржаў на амаль увесь беларускі паэтычны бамонд!

Прыемна адзначыць, што на шэраг пародый Міколы Шабовіча ўжо напісана музыка Дзмітрыем Пятровічам і Анатолем Міхальчэнкавым, якія на імпрэзе напоўніцу прадэманстравалі не толькі свае кампазітарскія здольнасці, але і вакал. Гэты новы ў Беларусі жанр, спадзяёмся, знойдзе сваю аўдыторыю.

**Дзмітрый РЫМША**

# *Дні праваслаўя ў Дзятлаве*

Дні праваслаўнай духоўнасці і культуры прайшлі ў Дзятлаве з нагоды 500-годдзя прыходу храма Праабражэння Гасподня. Бласлаўленне на ўрачыстасці ў сувязі з гэтым юбілеем даў архіепіскап Навагрудскі і Лідскі Гурый.

У райцэнтры праводзіліся розныя мерапрыемствы. Так, жыхары і госці горада прысутнічалі на канцэрце хору рэгенцкага аддзялення Мінскай духоўнай семінарыі. Два дні працавала выстава-продаж праваслаўнай літаратуры і перыёдыкі, абразоў, царкоўных рэчаў.

У мясцовым гісторыка-краязнаўчым музеі адкрылася выстава старажытных абразоў, друкаваных і рукапісных кніг. Адбыліся цікавыя сустрэчы са святарамі і манахамі. Вялася шчырая размова пра хрысціянскую малітву і яе значэнне ў жыцці сучаснага чалавека, пра адметнасці Бібліі.

Жыхары раённага цэнтра мелі магчымасць паглядзець мастацкі фільм рэжысёра П. Лунгіна "Востраў", лаўрэата замежных кінафестываляў. За "круглым сталом" настаўнікі раёна абмяркоўвалі з выкладчыкамі Мінскай духоўнай акадэміі і са святарамі праблемы выхавання маральнасці ў падрастаючага пакалення.

**Іосіф ЗАЯЦ**

# Узор служэння Бацькаўшчыне

**Адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі памяці народнага пісьменніка нашай краіны, лаўрэата дзяржаўных прэмій Беларусі Янкі Брыля.**

Уступным словам урачыстасць распачала начальнік аддзела культурна-асветніцкай работы ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама Наталля Старыкава. Яна распавяла прысутным пра жыццёвы і творчы шлях Янкі Брыля, пра ўдзел пісьменніка ў Вялікай Айчыннай вайне, пра ўзнагароды і званні, якія атрымаў аўтар шматлікіх кніг. Шмат зрабіў Іван Антонавіч і як перакладчык з рускай, украінскай і польскай моў. У яго перакладзе на беларускую мову выйшлі паасобныя творы вядомых пісьменнікаў: Чэхава, Талстога, Горкага, Ажэшкі...

Галоўны рэдактар часопіса "Нёман", старшыня гарадской арганізацыі Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў зазначыў, што служэнне Янкі Брыля роднай літаратуры, роднаму слову адзначана ў свой час вельмі высока дзяржавай, але самае галоўнае, чаго ён дасягнуў — яго творчасць, высокая, таленавітая, мужная, якая жыве ў сэрцах усіх беларусаў. Іван Антонавіч застанецца для нас узорам служэння Бацькаўшчыне, роднай літаратуры, нашаму народу. Самая высокая і галоўная яго ўзнагарода — гэта любоў і ўвага народа да яго твораў.

Прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа, сябар Янкі Брыля Дзмітрый Бугаёў узгадаў пра адзін з самых памятных момантаў у сваім жыцці — сумесную паездку з Іванам Антонавічам па Енісеі, ад Краснаярска да Дудзінкі. Дзмітрый Якаўлевіч падкрэсліў: пакуль будзе жыць Беларусь ды беларускае слова, да таго часу будзе жыць і памяць пра Янку Брыля.

Слова бралі таксама літаратары Яўген Каршукоў і Павел Саковіч. А права адкрыць мемарыяльную дошку, якую стварыў скульптар Валянцін Занковіч, прадаставілі Міхасю Пазнякову і кіраўніку студыі ваенных пісьменнікаў Яўгену Каршукову.

Мінула амаль два гады, як пайшоў з жыцця Янка Брыль. Але памяць пра геніяльнага творцу жыве ў сэрцах тых, хто чытае яго творы, а таксама ведаў асабіста. Гэтаму сведчанне і назва новай вуліцы ў сталічным мікрараёне Дружба.

**Віктар КАВАЛЁЎ**
***Фота аўтара***

*Літаратурныя сустрэчы*

# Мы – тутэйшыя!

У Вавуліцкай агульнаадукацыйнай базавай школе адбылася адметная падзея: сустрэча са старшынёй Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі празаікам Анатолем Крэйдзічам і пісьменніцай Наталляй Касцюк. З гэтай нагоды настаўнікі і вучні сельскай навучальнай установы падрыхтавалі адмысловую праграму "Мы — тутэйшыя". Прыняць удзел у мерапрыемстве выказалі вялікае жаданне метадыст раённага аддзела адукацыі Таццяна Гацуковіч, намеснік дырэктара і настаўнікі Гутаўскай АСШ Валянціна Валашчук, Наталля Сілюк, Таццяна Федчук, вучні.

Пачалася праграма з цёплых вітальных слоў Зоі Іванаўны Грэбень, настаўніцы рускай мовы і літаратуры Вавуліцкай школы, лаўрэата міжнароднага Пушкінскага конкурсу 2005 года. Гэта апантаная сваёю справаю жанчына. Найгалоўнейшым сваім абавязкам яна лічыць выхаванне ў дзецях любові да літаратуры і роднага краю. З'яўляючыся настаўніцай рускай літаратуры, тым не менш цікавіцца беларускай літаратурай і прапагандуе яе.

Першая частка праграмы, літмантаж якой падрыхтавалі настаўнікі, а выконвалі вучні Гутаўскай АСШ, была прысвечана ўшанаванню памяці беларускага паэта Міколы Федзюковіча (да 65-годдзя з дня яго нараджэння). Асноўная ўвага адводзілася яркай і самабытнай, красамоўнай і каларытнай творчасці Міколы Федзюковіча, у якой шмат месца адведзена родным абсягам, Палескаму краю, Бацькаўшчыне. Дзяўчаты і хлопцы чыталі вершы паэта. Думаецца, што кожны са слухачоў адчуваў гонар за паэта, нашага земляка.

Пасля было дадзена слова Анатолю Крэйдзічу. Анатоль Мікалаевіч адзначыў, што яму прыемна знаходзіцца сярод землякоў, блізкіх людзей. Ён адзначыў: "У нас асобы край, асобыя людзі". І было зразумела, што гэта не проста словы, а ўнутранае перакананне. Ён з любоўю гаварыў пра палескі край, багаты на таленты. Успомніў нашых вядомых землякоў Міколу Федзюковіча, Алу Кабаковіч-Тычыну, Міколу Трафімчука, Уладзіміра Сітуху ды іншых. Пісьменнік распавёў пра сябе і свае творчыя планы, прачытаў вершы, мініяцюры. Успамінаючы пра школьныя гады, сказаў, што ўжо тады адчуў патрэбу ў творчасці. Праўда, як чалавек сціплы і самакрытычны, тут жа дадаў, што нікому не паказвае тыя вершы, непрафесійныя, да таго ж напісаныя на рускай мове. Ён адзначыў, што вельмі любіць родны край, родную мову і родную літаратуру. Пісьменнік падкрэсліў, што мэтай гэтай сустрэчы з'яўляецца выяўленне талентаў сярод моладзі і прапановаў жадаючым удзельнічаць у літаратурных конкурсах.

Наталля Касцюк гаварыла ясна і эмацыянальна. Яна паведаміла, што ў адрозненне ад Анатоля Крэйдзіча — рускамоўная пісьменніца, жыве ў Кобрыне, працуе ў дзіцячым доме. З 2004 года перыядычна публікуецца ў часопісе "Нёман". Яе творы пра хворых, няшчасных, пакінутых, абяздоленых дзяцей. Яна гаварыла пра сваю працу і пра дзяцей.

Пасля ў кожнага з удзельнікаў сустрэчы была магчымасць задаць гасцям пытанні. Пісьменнікі адказвалі грунтоўна і шчыра.

У заключным слове пісьменнікі пажадалі школьнікам добра вучыцца, адзначыўшы, што "веды заўсёды з табою, яны дапамагаюць, а не абцяжарваюць". А. Крэйдзіч дадаў: "Хачу пажадаць, каб вы не лічылі літаратуру непатрэбнай у жыцці. Яна дапамагае жыць".

Таццяна Мікалаеўна Гацуковіч падагуліла вынікі сустрэчы, падзякавала пісьменнікам за цікавую і карысную гутарку, за тое, што яны знайшлі час наведаць школу, і звярнулася да вучняў з запрашэннем апрабоўваць сябе ў творчасці, актыўна ўдзельнічаць у конкурсах.

Заключным акордам мерапрыемства стала песня "Шаную цябе, Белая Русь" у выкананні вучаніцы шостага класа Вавуліцкай школы Святланы Міхнавец.

Мерапрыемства прайшло арганізавана і займальна. Увесь час панавала добразычлівая і даверлівая атмасфера. Усе, хто прысутнічаў, адчувалі асаблівую, непаўторную еднасць, і з гонарам падумалася: сапраўды, мы — тутэйшыя!

**Алена ЯКОЎЧЫК**
***в. Пярковічы***

# Пазітыўная энергетыка

**Чытачы сталічнай бібліятэкі імя Цёткі атрымалі цудоўны падарунак. У адной з яе залаў адкрылася выстаўка жывапісу вядомага беларускага мастака Мікалая Бушчыка.**

Калі трапляеш у залу, апынаешся ў чароўнай краіне, якую стварыў таленавіты творца. Каларыстыка маляўнічых фантазій заварожвае. Атмасфера карнавала, феерыі, уласцівая многім творам мастака, пануе паўсюль. Яго светабачанне асаблівае, адметнае, непадобнае... Марк Шагал адзначаў, што мастацтва не можа быць рэальным без часцінкі ірэальнага. У аснове работ Міколы Бушчыка — краявіды нашай краіны, вобразы простых людзей, якія яе насяляюць, але дзякуючы тонкаму адчуванню колеру мастаком, пяшчотнаму пераліву яго адценняў, усё навакольле ператвараецца ў краіну-мрою.

Каляровая мазаіка карцін майстра не магла б рэалізавацца без Боскага натхнення. Гэтая дзівосная шматколерная рэальнасць прыцягвае позірк і нікога не пакідае раўнадушным. Загадкавую творчасць М. Бушчыка годна ілюструюць словы філосафа М. Кузанскага: «Бог прысутнічае ва ўсім». Кожны можа ўбачыць у гэтых авангардных карцінах нешта сваё, магчыма, не тое, што хацеў перадаць аўтар, але ў тым і сутнасць выяўленчага мастацтва, што яно не толькі ўзбагачае наша зрокавае ўспрыманне жыцця, а і вучыць думаць, пазнаваць, аналізаваць. Карціны М. Бушчыка нясуць магутную пазітыўную энергетыку.

Павіншаваць мастака ў гэты дзень прыйшлі калегі, сябры і проста прыхільнікі яго творчасці. Выступоўцы ахарактарызавалі М. Бушчыка як надзвычай таленавітага жывапісца, надзейнага сябра і вельмі сціплага чалавека. Сустрэча прайшла ў атмасферы дабрыні, добразычлівасці і асаблівай сяброўскай цеплыні. Гучала музыка, чыталіся вершы, што надавала яшчэ большую ўзнёсласць імпрэзе.

Гэты год юбілейны для Міколы Бушчыка і таму аматары жывапісу з нецярпеннем чакаюць новых творчых выстаў мастака ў музеях і галерэях сталіцы.

**Надзея СЕНАТАРАВА**

**Паэзія падобная да бурнай крыштальнай ракі, але любая, нават самая паўнаводная рака, без прытокаў мялее і перасыхае. Юныя паэты Мінскага раёна сваімі цікавымі творамі імкнуцца папаўняць раку роднай літаратуры. Творчыя школьнікі ўтварылі суполку "Купалінка", сяброў якой яднае любоў да мовы і захапленне паэзіяй. Днямі аб'яднанне адзначыла пятнаццацігадовы юбілей. Святочная імпрэза адбылася ў зале тэатра аднаго акцёра "Зьніч".**

# Усё толькі пачынаецца

Гэта была вельмі значная падзея як для саміх юных літаратараў ды іх кіраўнікоў, так і, безумоўна, для тых, хто заснаваў "Купалінку": галоўны спецыяліст аддзела адукацыі Мінскага райвыканкама Лілія Жаўняркевіч, вядомы паэт, кіраўнік літаратурнага аб'яднання Мікалай Чарняўскі, паэтэса, адказны сакратар суполкі Эльвіра Ярчак, Людміла Давідоўская ды іншыя супрацоўнікі музея Янкі Купалы. Юбілейнае святкаванне пятнаццацігоддзя можна назваць сапраўдным паэтычным канцэртам, у якім бралі ўдзел юныя паэты шаснаццаці школ Мінскага раёна. У іх вершах гучалі тэмы Радзімы, маці, слынных людзей Беларусі, прыроды, вандровак... Павіншаваць "Купалінку" і паслухаць выступленні школьнікаў прыйшлі вядомыя беларускія літаратары: Міхась Пазнякоў, Наталля Касцючэнка, Уладзімір Мазго, Анатоль Зэкаў, Ніна Галіноўская і, зразумела ж, "бацькі" суполкі Мікола Чарняўскі і Эльвіра Ярчак. Скарбонка суполкі папоўнілася кнігамі, якія падарылі выступоўцы і музей Янкі Купалы. Ад Саюза пісьменнікаў Беларусі "Купалінцы" была ўручана Ганаровая грамата.

На юбілей літаратурнага аб'яднання прыйшлі і даслалі вершаваныя прывітанні шматлікія былыя сябры "Купалінкі". Цяпер яны студэнты вышэйшых навучальных устаноў ці нават зусім дарослая працоўная моладзь.

Аддзел адукацыі Мінскага райвыканкама ўзнагародзіў кіраўнікоў гурткоў Ганаровымі граматамі, адзначыў падзякамі за плённую працу па развіцці творчых здольнасцей таленавітай моладзі.

Напрыканцы кіраўнік аб'яднання, настаўнік і дарадца юных паэтаў Мікола Чарняўскі адзначыў, што літаратурная суполка "Купалінка" — гэта выдатная школа, а яе выхаванцы — творчыя, таленавітыя, шчырыя, адкрытыя, добразычлівыя людзі. След, які пакінула "Купалінка", бачны, светлы, яскравы, як у жыцці кожнага яе сябра, так і на літаратурных старонках, напісаных маладымі паэтамі Беларусі.

**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ**
***Фота аўтара***

*Рэпліка*

# Крыўдзіць класікаў — сабе на шкоду

Модна стала апошнім часам спраўляць юбілеі. Вось і нядаўна адзначыў сваё 60-годдзе Гродзенскі каледж мастацтваў. З задавальненнем даведаўся я пра поспехі гэтага калектыву, аб чым на цэлай старонцы расказала абласная газета, паведамілі мясцовыя радыё і тэлебачанне. Нельга было не ганарыцца, калі называліся імёны выхаванцаў гэтай вучэльні, якія вызначыліся на ніве культуры на розных творчых пасадах. Гонар і слава такім людзям. Да іх я дадаў бы яшчэ Міхаіла Карпенку, члена Саюза пісьменнікаў СССР, колішняга рэдактара газеты "Ташаузская правда" ў Туркменістане. Пасля развалу вялікай дзяржавы Міхаіл Фёдаравіч вярнуўся на родную Магілёўшчыну...

Але чаму я ўзяўся за пяро? Яшчэ раней заўважыў, што згаданы каледж у СМІ называецца без імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч). Так было і ў справаздачах аб юбілейных урачыстасцях. У чым справа? Стаў тэлефанаваць чыноўнікам, што працуюць у культуры. Аказваецца, мяняючы свае назвы, навучальная ўстанова на мяжы мінулага і гэтага стагоддзя... згубіла імя славутай зямлячкі-паэтэсы. Наўмысна ці па непаразуменні?

Іншы прыклад. Гродзенскі універсітэт імя Янкі Купалы, атрымаўшы гэты статус, будучы пераўтвораны на базе педінстытута, не адрокся ад імя Класіка. І гэта заканамерна.

**Алесь ЖАЛКОЎСКІ**
***г. Ліда***

# Любіць і чытаць сваё

**Шаноўнае спадарства, спадзяёмся, што вы з'яўляецеся актыўнымі чытачамі старэйшых беларускіх часопісаў "Полымя", "Маладосць", "Нёман" і "Всемирная литература". Для таго, каб вы і надалей мелі больш шырокае ўяўленне пра іх унутраны змест і рэдакцыйную палітыку, мы вырашылі азнаёміць вас з перспектыўнымі планамі гэтых выданняў на другое паўгоддзе 2008 года. Выдрукоўваем іх са згоды галоўных рэдактараў (М. Мятліцкага, Р. Баравіковай, М. Пазнякова і А. Наварыча) і просім вас пры любым раскладзе жыцця быць разам з намі дзеля захавання і ўмацавання нашай нацыянальнай літаратуры, культуры і высокай чалавечай духоўнасці.**

## «Полымя»

У II паўгоддзі 2008 года часопіс "Полымя" прадставіць як сучасную беларускую прозу, так і творы з літаратурнай спадчыны.

У востраюжэтнай аповесці *Юры Станкевіча* "Пераход" былы кадравы афіцэр Антон Лашкевіч, камісаваны з войска з-за невылечнай хваробы, прымае рашэнне з'ехаць у чарнобыльскую зону адчужэння: ён не хоча бачыць людзей. Але на самай справе атрымалася не так, як марылася. У зоне ўжо гаспадарыць група макавых наркадзялкоў, і лішні сведка ім непатрэбны...

Як у першых трох, так і ў чацвёртай частцы, у цэнтры сямейнай хронікі *Уладзіміра Гніламёдава* "Вяртанне" — жыхары заходнебеларускай вёскі Прускі. Людзі кахаюць, жэняцца, змагаюцца за лепшую долю, трапляюць у турму, гінуць — такая шырокая тут панарама падзей.

*Вітаўт Чаропка* вядомы чытачам як аўтар многіх твораў на гістарычную тэматыку. На гэты раз ён выносіць на чытацкі суд калядную містэрыю "Fatis Volentibus" — пра тое, як Літаратар пад уздзеяннем Сатаны аказваецца сярод прататыпаў сваіх герояў. Незайздросная, шчыра скажам, сітуацыя. І ўсё ж, нягледзячы на літаратурную аснову твора, яго, без сумнення, з цікавасцю прачытаюць і тыя, хто далёкі ад пісьменніцкай кухні.

У "Дыярыушы" *Яна Уладзіслава Пачобута-Адляніцкага*, які служыў у літоўскім войску, а напрыканцы жыцця здабыў сабе пасаду ашмянскага стольніка, распавядаецца пра падзеі, сведкам якіх ён быў з 1640 да 1684 года.

Аповесць са спадчыны беларускай пісьменніцы *Анэлі Тулупавай* "Рэха ў калысцы" (яна, праўда, вызначыла жанр твора як драматычная паэма ў прозе) — пра больш блізкі час, а дакладней, пра Вялікую Айчынную вайну. Суровыя выпрабаванні выпалі на долю былой эстраднай спявачкі Тусі, якую фашысцкая акупацыя заспела ў роднай вёсцы: на фронце гіне муж, а яна сама носіць пад сэрцам дзіця, якое, яшчэ ненароджанае, становіцца ненавісным, бо бацька яго — фашыст, які згвалціў яе. Праўда, ваенныя абставіны ўнеслі ў жыццё жанчыны свае карэктывы...

"Полымя" прапануе таксама апавяданні *Таццяны Гарэлікавай, Уладзіміра Ліпскага, Алеся Макоўскага, Міколы Мікуліча, Уладзіміра Сцяпана, Андрэя Федарэнкі* ды іншых пісьменнікаў.

## «Маладосць»

Гістарычна-прыгодніцкі твор *Ягора Конева* "Здані Гарадніцы" (нечым нагадвае славутыя "Лабірынты" В. Ластоўскага) перанясе нас у Заходнюю Беларусь у 20-я—40-я гады мінулага стагоддзя. Героі — акцёры местачковага тэатра — апынаюцца ў эпіцэнтры падзей, калі адна навала-акупацыя змяняе другую, і кожная горшая за папярэднюю... Аповесць насычана захапляльнымі калізіямі, сапраўдныя гістарычныя факты ўдала дапаўняюцца аўтарскімі фантазіямі. У першую чаргу аповесць павінна зацікавіць самага ўдзячнага чытача — падлетка.

"...Гэта цяпер мы ўспрымаем Сярэднявечча як Галантнае стагоддзе, — сказаў Пётра, — і абапіраемся ў сваіх ведах на мемуары Казановы і раманы Дзюма. Насамрэч жыццё ў тую пару было страшным, змрочным. У кожным магнацкім палацы меліся сакрэтныя пакоі, падземныя пераходы, тайныя вязніцы... Антоні Тызенгаўз быў па вушы зацягнуты ў палітычныя гулі. І яму патрэбна было такое месца, дзе ён мог бы ўтойваць сакрэты сваёй рэфарматарскай дзейнасці...

Што за сакрэты меў на ўвазе Пётра, Апалонія сцяміла, калі незнарок наступіла на крохкія чалавечыя косткі..."

Аповесць *Алеся Кажадуба* "Без настальгіі" якраз-такі нясе на сабе адбітак той мілай, рамантычнай настальгіі па незваротных часах, калі мы былі маладыя, поўныя надзей, планаў, кахання, літаратуры... Твор, несумненна, аўтабіяграфічны, чытач лёгка будзе пазнаваць прататыпы: літаратараў, пісьменнікаў, якія, на жаль, пайшлі з жыцця, але не з нашай памяці...

"...Я сапраўды пісаў аповесць, гераіняю якой зрабіў адну з сваіх сябровак. Але на паперы гэтая сяброўка падабалася мне намнога менш, чым у жыцці, што выклікала сумненні ў правільнасці выбранага шляху. Пісаць трэба было не горш за Буніна. Акрамя таго, я памятаў наказ сваёй настаўніцы рускай мовы не пісаць, як Гогаль. Карацей кажучы, мяне апаноўвалі сумненні, але я пра іх нікому не гаварыў. І правільна рабіў. Як высветлілася шмат пазней, сумненні ніколі ні да чога добрага не прыводзяць..."

Упэўнены, што раман *Алены Брава* "Менада і яе сатыры" стане з'явай не толькі часопіса "Маладосць", але і ўсёй беларускай літаратуры апошняга перыяду. Сюжэт твора ўмоўна можна акрэсліць як "Лаліта наадварот". Прыгоды дзяўчынкі, а потым дзяўчыны апісваюцца аўтаркаю з максімальнай, гранічнай шчырасцю, часам жорсткай, калі не сказаць — жахлівай... Але ў цэлым усё гэта ёсць Яе Вялікасць Сапраўдная Літаратура. Тая самая, якая павінна "ўратаваць свет"...

"...Дзе яна знаходзіла гэтых гогалеўскіх персанажаў? З-пад якіх балотных купін вылазіў гэты вывадак чарцей, гэты шабаш, што не знікаў ад крыку пеўня? Яна здагадваецца, што гэта зноў ***не той*** чалавек, але яна рэдка слухае свой розум: "няхай гаворыць сэрца", менавіта так. Яна хацела кахаць, як цвейгаўская Незнаёмка, і свайго дабілася: яна так і засталася ***нераспазнанай*** для ўсіх тых увішных кар'ерыстаў, спадчынных алкаголікаў, інфантыльных мамачкіных сынкоў — так ужо атрымалася, што яе творчы размах разгарнуўся на нягодным матэрыяле правінцыйнага горада..."

Акрамя вышэйзгаданых аўтараў "буйная" проза часопіса будзе прадстаўлена ўрыўкам з рамана *Вольгі Куртаніч* "СССР", аповесцю *Таісы Супрановіч* "Халодны дзень і цёплы вечар", *Людмілы Кебіч* "Сама, сама, сама...", *Міколы Сянкевіча* "У аперацыйным блоку холадна", *Алеся Чобата* "Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка" ды іншых.

## «Нёман»

У другім паўгоддзі 2008 года "Нёман" надрукуе шэраг раманаў вядомых пісьменнікаў на сучасную тэму. Так, напрыклад, раман *Ганада Чарказяна* "Багровый закат" раскажа пра лёс чалавека, выкінутага з грамадскага жыцця ў выніку развалу вялікай краіны і міжнацыянальнага канфлікту. Раман лаўрэата першай прэміі міністра абароны Рэспублікі Беларусь *Аляксандра Сакалова* "Похитители времени" распавядае пра шлях у авіяцыю юнака, захопленага небам. Праблемы лётнай прафесіі, служба ў Афганістане з'яўляюцца фонам, на якім развіваецца любоўная драма. Раман *Віталя Кірпічэнкі* "Планета псов и ягнят" — пра гады так званай перабудовы, калі адбылося крушэнне не толькі Савецкага Саюза, але і духоўных арыенціраў, сэнсу жыцця для многіх, хто сутыкнуўся адзін на адзін з неверагоднымі праблемамі жорсткага часу. Дзеянне яшчэ аднаго рамана — "Диалектика игры", аўтарам якога з'яўляецца *Сяргей Трахімёнак*, адбываецца ў Расіі. Галоўны герой твора — старшыня аднаго з думскіх камітэтаў — трапляе ў кола парламенцкіх інтрыг, паколькі пачалася падрыхтоўка да новых выбараў... Проза будзе прадстаўлена таксама творамі *Анатоля Андрэева, Генадзя Пацыенкі, Міколы Бусько, Сяргея Рэмізава, Наталлі Касцючэнкі, Раісы Баравіковай, Алеся Бадака; Яўгена Шышкіна і Уладзіміра Крупіна* (Расія).

Сярод паэтычных публікацый другога паўгоддзя варта назваць вершы *Валянціны Паліканінай, Валерыя Грышкаўца, Алега Салтука, Алы Чорнай, Валянціна Лукшы, Браніслава Спрынчана, Віктара Шніпа, Віктара Гардзея, Тамары Красновай-Гусачэнкі, Уладзіміра Мазго, Станіслава Валодзькі.* Будуць надрукаваны таксама творы вядомых паэтаў Расіі: *Станіслава Куняева, Глеба Гарбоўскага, Яўгена Юшына, Івана Галубовіча, Максіма Замшава, Бэлы Ахмадулінай.*

Як і раней, шырока будзе прадстаўлена публіцыстыка. Гэта і серыя нарысаў пра жывых Герояў Савецкага Саюза, і нарысы пра знакамітых людзей, і гутаркі з дзяржаўнымі дзеячамі, а таксама артыкулы па ідэалогіі, палітыцы, гісторыі, навуцы, эканоміцы, сельскай гаспадарцы, культуры, мастацтве...

Сярод найбольш цікавых публіцыстычных матэрыялаў згадаю ўспаміны *Марка Фурмана* "Исповедь конвоира". Аўтар служыў ахоўнікам у лагеры, дзе адбываў тэрмін па 58-м артыкуле наш вядомы паэт Сяргей Грахоўскі. Прыцягне ўвагу "Дневник психотерапевта" *Наталлі Саветнай* з Віцебска, а таксама артыкул доктара філасофскіх навук *Ігара Катлярова* пра палітычныя партыі ў Беларусі. Будзе надрукаваны і дзённік вядомага дзяржаўнага дзеяча *П. К. Панамарэнкі.*

У раздзелах "Літаратурная крытыка", "Літаратуразнаўства" выступяць вядомыя вучоныя і літаратары *Уладзімір Гніламёдаў, Валерый Максімовіч, Іван Штэйнер, Вячаслаў Рагойша, Анатоль Кудравец, Васіль Макарэвіч, Дзмітрый Бугаёў, Алесь Марціновіч, Міхаіл Кузьміч, Валянціна Локун, Лада Алейнік, Юрый Сапажкоў, Навум Цыпіс.*

Шэраг цікавых матэрыялаў будзе прысвечаны вядомай паэтэсе Яўгеніі Янішчыц, 60-годдзе з дня нараджэння якой адзначаецца ў гэтым годзе.

## «Всемирная литература»

Раман майстра французскай прозы *Мішэля Дэона* "Вышэйшае кола" належыць да з'яў найноўшай літаратуры Францыі. Малады парыжанін едзе вучыцца ў ЗША. Маці купляе на апошнія грошы білет на лайнер "Мэры Квін", каб сын змог "пацерціся" ў вышэйшых колах грамадства. Гэта яе мара. На працягу плавання лёс зводзіць героя і з памочнікам прэзідэнта ЗША, і з прафесарам гісторыі, і з шыкоўнай дачкой міністра эканомікі Бразіліі, які загінуў ад тэракта. Яе, Аўгусту, малады француз і пакахаў без памяці. Так завязваецца інтрыга рамана.

Для твора характэрна псіхалагічная пераканаўчасць, мова твора струменіцца досціпам і іроніяй, што ператварае чытанне ў адно задавальненне.

"Сумна пры думцы, што праз якіх гадоў дваццаць мае раманы будуць пакрывацца пылам на гарышчах..." Гэтыя горкія словы належаць чалавеку, які напісаў за сваё жыццё каля 200 раманаў. Імя яму *Жорж Сіменон.* Ён не хаваў, што ягоныя кнігі маюць мала агульнага з сапраўдным мастацтвам, але ён нічога не мог парабіць з прывычкай пісаць: "Я хачу пісаць, прычым, усё роўна што". І гэта пры тым, што камісар паліцыі Мэгрэ зрабіўся нацыянальным героем Францыі. Пра ўсё гэта Жорж Сіменон піша ў сваіх дзённіках "Калі я быў старэчай".

Англійская літаратура будзе прадстаўлена мастацкім узнаўленнем жыцця Ісуса Хрыста пісьменнікам *Дэйвідам Гэрбертам Лорэнса.* Ягоны твор "Пеўнік, які ўцёк" — выдатная спроба зазірнуць у мінуўшчыну, пра якую мы ведаем толькі з Евангелля.

Раман *Жана Дзютура* "Семінар у Бардо" — з'едлівая сатыра на сучасную французскую інтэлігенцыю з яе лявацтвам і бясплённымі праектамі. Цікава падаецца тэма кахання.

Пра смерць Ул. Маякоўскага вядома ўсё. Што гэта не так, можна пераканацца з манаграфіі амерыканскіх пісьменнікаў *Эн і Сэмюэл Чартэрс* "Люблю". Шэсць гадоў даследчыкі літаральна прадзіраліся праз "буралом застарэлых палітычных ацэнак". Ім дапамагалі Р. Райт, Н. Палонская і Т. Якаўлева-Ліберман — апошняя (парыжская) пасія паэта.

Пад рубрыкай "Пісьменнік і час" будзе завершана публікацыя твора лаўрэата Ганкураўскай прэміі *Паскаля Ленэ* "Жыццё пісьменніка". Пачатак публікацыі — у трэцім нумары.

Да раздзела публіцыстыкі варта аднесці таксама і артыкул *Юліі Чарняўскай* "Беларуская самасвядомасць: парадокс як шлях да генеалогіі". Гэта даследаванне пра нацыянальную самаідэнтыфікацыю нас з вамі, разгляд праблемы з розных пунктаў гледжання.

Славянская проза будзе прадстаўлена "Мсціслаўскімі апавяданнямі" *Алега Ждана,* аповесцямі расійскіх празаікаў *Алега Кузняцова* "Пыл па ветры" і *Юрыя Красавіна* "Час нуль".

Аматараў паэзіі чакаюць вершы чарнагорскіх паэтаў у перакладзе *І. Чароты*, а таксама балгар *С. Пенева і Ул. Стаянава* ў перакладзе *Л. Турбіной.* Плануецца таксама падборка лепшых вершаў беларускага паэта *Анатоля Аўруціна.*

Рэдакцыя завяршае публікацыю паэмы вялікага арабскага паэта *Халіля Джэбрана* "Вяшчун".

На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь

**Надышоў час, калі і на мінулае, і на дзень сённяшні, і ў імя будучыні абавязаны паглядзець без прадузятасці, шчыра і адкрыта, асэнсоўваючы перажытае і вызначаючы сваё стаўленне да тых ці іншых падзей. Аб гэтым разважаеш, калі знаёмішся з кнігамі паэзіі і графікі "Нетры" і "Палын. Чарнобыль", якія вылучаны працоўным калектывам Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы горада Мінска і прадстаўлены Міністэрствам культуры да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.**

# Жыццяпіс паэта і мастака

Пасля выхаду першай сумеснай кнігі "Нетры", якая на Міжнародным кніжным кірмашы ў Франкфурце-на-Майне ў 2005 годзе, дзе былі прадстаўлены лепшыя выданні больш як 10 тысяч выдавецтваў са 135 краін свету, атрымала высокую ацэнку — увайшла ў лік "ста лепшых кніг свету", яе аўтары — паэт Міхась Башлакоў і мастак Міхась Барздыка прадоўжылі цеснае творчае супрацоўніцтва і ў 2006 годзе выдалі сваю новую кнігу "Палын. Чарнобыль", прымеркаваную да 20-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС .

Скразной лініяй праз увесь паэтычна-графічны твор праходзяць прарочыя словы святога Іаана Багаслова пра зорку Палын, якія знітоўваюць у адзінае цэлае яго структуру і змест, а кожны з матываў у ім, дасягаючы найвышэйшага напружання, яшчэ раз нагадвае аб той непамернай бядзе, што здарылася на памежжы Беларусі, Украіны і Расіі. І тая акалічнасць, што на графічных работах не канкрэтныя людзі, а абстрактныя і поўныя суму вобразы жанчын і бабуль, а таксама журботныя пейзажы замест некалі яркіх краявідаў, дзе перад адлётам у вырай, як памятае паэт, збіраліся разам на скошаных палетках сотні журавоў, — толькі ўзмацняе выразнасць тых ужо далёкіх пякельна-ашаламляльных дзён.

І ў паэтычна-графічным дыялогу тыя дні набываюць якасць агульнай трагедыі, бо што ні старонка, то цэлы свет з касмічнай бясконцасцю, філасофскай глыбінёй асэнсавання, высокай духоўнасцю, дзе спаўна адлюстраваліся, як неба ў кропельцы расы, і дух, і душэўная драма, што разгортваюцца перад чытачом у канкрэтным часе. У цесна злучаных між сабой сюжэтных лініях вершы Міхася Башлакова і графічныя лісты Міхася Барздыкі ўтрымліваюць непамерны людскі боль, дзе кожны паэтычны радок адпавядае рысачцы мастака — гарманічнае вырашэнне даўніх, здавалася б, невырашальных супярэчнасцей у сплаве літаратуры і графікі. Выконваючы свае кампазіцыі мастак, (яго творчасць адзначана сярэбраным медалём Еўрапейскай акадэміі мастацтваў (1992) і залатым медалём Міжнароднага конкурсу графікі (Бельгія, 1993)) не выдумляе чарнобыльскія сюжэты, а толькі накіроўвае і кантралюе той псіхалагічна-этычны сплаў, што ўзнікае ў яго філасофска-мастакоўскім уяўленні, у патрэбнае графічнае рэчышча, дзе ёсць месца свядомаму і стыхійнаму, інтуітыўнаму і рацыянальнаму.

У яго кампазіцыях многа асобных матываў, але яны настолькі моцна і магічна знітаваны між сабой нейкай унутранай сілай, што гэта сіла, нібыта магнітнае поле, што ўтрымлівае планеты вакол Сонца, гэтак жа прыцягвае адну ілюстрацыю кнігі да другой.

Вызначыўшы аднойчы для сябе важнейшым напрамкам агульначалавечыя ісціны, ён і служыць ім, і хварэе імі душой і целам. У прыватнасці, кожнае канкрэтнае праяўленне ліха ці дабра ў яго думках адразу ж абагульняецца, знаходзіць свой правобраз у міфалагемах сусветнай культуры і становіцца тым самым мастацкім матэрыялам, з якога ён і вымалёўвае на паперы сваю мадэль узаемадзеяння і барацьбы дабра і зла, прыгожага і пачварнага. І тыя рэальныя з'явы, часам жахлівыя і трагічныя, якія здольны іншага чалавека нават псіхалагічна траўміраваць, для мастака Міхася Барздыкі, чые творы знаходзяцца ў музеях многіх, не толькі еўрапейскіх, краін, становяцца прадметам філасофскага асэнсавання.

Мастак даў ёмкае творчае тлумачэнне многім адвечным з'явам свайго часу ў такіх працах, як "Доўгі шлях", "Напярэдадні", "Вятры часу", "Дні лістападу", "Снежаньскія забавы", "Падабенства", "Прадчуванне палёту", "Звычайная справа", "Фарбы восені", "Абуджэнне", "Гукі стомленых дзён" і іншых.

Кніга "Палын. Чарнобыль" — выдатна ілюстраваная арыгінальнай графікай Міхася Барздыкі, у якой паэтычныя творы вядомага паэта Міхася Башлакова прадстаўлены на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай, складаецца з чатырох частак, якія па сваёй будове ўмоўна нагадваюць форму крыжа, дзе першыя дзве часткі складаюць як бы вертыкаль, а трэцяя і чацвёртая — гарызанталь крыжа.

Непаўторны вобраз Беларусі — прыгажосць яе прыроды, шляхоў і абсягаў, багаты свет міфалагічных уяўленняў — усё тое, што з'яўляецца гісторыяй людской мудрасці і памяці, светапогляду, самасвядомасці і гонару — ярка паўстае перад намі на старонках кніг "Нетры" і "Палын. Чарнобыль".

"Я — поэт. Этим и интересен", — пісаў некалі У. Маякоўскі. Самае непасрэднае дачыненне гэты выраз мае і да паэта Міхася Башлакова, безумоўна, таленавітага, лірычнае пяро якога адзначана знакам высокай філалагічнай культуры — літаратурнай прэміяй Баяна (Расія, 2004). Калі чытаеш ягоныя вершы ў кнігах "Нетры" і "Палын. Чарнобыль", выразна адчуваеш, наколькі яны адпавядаюць сучаснасці, якое моцнае ў кожным паэтычным радку грамадзянскае гучанне. "Цвіце палын // На схілах і пагорках // У вечаровых // Сцішаных палях. // Гарыць над шляхам // Стомленая зорка, // Чарнобыльская, // Горкая мая". Чарнобыльская трагедыя ў творчасці Міхася Башлакова — цэнтральная, паколькі паэт на сабе спаўна спазнаў яе чорнае спапяляючае крыло як удзельнік ліквідацыі выніка аварыі на ЧАЭС, а пасля як паэт, што цягам трох гадоў зрабіў больш за дзве тысячы літаратурных выступленняў перад жыхарамі забруджаных

**Непаўторны вобраз Беларусі — прыгажосць яе прыроды, шляхоў і абсягаў, багаты свет міфалагічных уяўленняў — усё тое, што з'яўляецца гісторыяй людской мудрасці і памяці, светапогляду, самасвядомасці і гонару — ярка паўстае перад намі на старонках кніг "Нетры" і "Палын. Чарнобыль".**

раёнаў Гомельскай вобласці. Дарэчы, яго землякі, большасць з якіх і цяпер жывуць у тых раёнах, заўсёды шчыра вітаюць кожны яго прыезд у родныя мясціны, і ягоныя новыя творы, у якіх апавядаецца пра лёс чарнобыльскага Палесся і пра саміх палешукоў — сведак той жахлівай трагедыі, якіх не засцераглі ад бяды нават крыжы-абярэгі. "У вёсках палескіх, // Як белыя здані, // Стаяць на раскрэсах, // У шызым тумане // Крыжы-абярэгі...// Я помню з маленства // Магічныя знакі: // Ад буры, пажару, // Вады і маланкі // Ахоўвалі стрэхі...// На Божыя святы // З малітвай жанчыны // Абрусам увешвалі // Крыж пуцявінны // І білі паклоны... // Крыжы — абярэгі...// Ля іх бласлаўлялі // Дзяцей у дарогу, // Страчалі гасцей // І маліліся Богу...// Да самага скону // Былі яны побач. // І ў шлях той апошні // Ад вёскі праз пожню // Ішлі да пагоста // Крыжы-абярэгі...// А сёння, а сёння // У стылую восень // Няма ні крыжоў // На Палессі, // Ні вёсак // На многія вёрсты, // Няма ні хаціны..."

Дзяцінства і юнацтва паэта былі напоўнены даверлівым чаканнем шчасця, напоены чыстым і свежым водсветам бяроз і пахам чаромхі, клёкатам буслоў па-над хатаю...Можа, таму ягоная лірыка такая пранікнёная, шчырая, трапяткая? Паэт, як і яго лірычны герой, жыў рамантыкай новых дарог і краявідаў, быў узнёслы, напаўняючы сваю душу харастом прыроды і жыцця. І паэтычныя радкі адпавядалі гэтаму настрою і стану душы. А калі над яго роднымі мясцінамі пранесліся чорныя чарнобыльскія хмары, што перайначылі не толькі лад жыцця людзей, але і іх лёсы, жыццё і творчасць паэта таксама кардынальна змяніліся. Горкі прысмак той самотнай вясны назаўсёды ўвайшоў у яго паэзію. І ўсё напісанае ім да тых трагічных дзён, хоць і несла ў сабе бласлаўлёную сілу, духоўную шчырасць — стала менш значным, адступіла на другі план. І, безумоўна ж, творчасць паэта змяніла сваю танальнасць. Але, застаючыся па-ранейшаму рамантыкам, ён наблізіўся даачышчальнага агню, сфакусіраваў сваю творчасць на тых балючых тэмах, якія падказала яму жыццё. Адной з прыярытэтных і стала тэма пацярпелых ад катастрофы вёсак. Людскія пакуты і радасці палешукоў становяцца справай жыцця і творчасці паэта. Лельчыцы, Нароўля, Тураў, Мазыр, Чачэрск, Добруш, Ветка, Хойнікі, Брагін... Дзе ён толькі не пабываў! Сіла і чысціня тых сустрэч з вяскоўцамі і лягла ў аснову твораў.

Паслячарнобыльская паэзія Міхася Башлакова, вядома ж, адрозніваецца ад той, якая была ля вытокаў яго творчасці, як зместам, так і асэнсаваннем падзей. "Якія песні сумныя // Спяваюць на Радзіме... // Жыццё такое тлумнае // Сплялося павуцінай. // І ні святла, ні просіні. // Адны дажджы сцюдзёныя. // Дні позняй стылай восені // Без колеру зялёнага. // І гэта неба шэрае, // І гэта поле цёмнае // Журбою перамераны // І песнямі бяздоннымі..."

Большасць пранікнёных вершаваных радкоў, напісаных у апошні перыяд, выклікаюць тугу і настальгію па той радзіме, якая была да чарнобыльскай аварыі, калі вясёлымі дзіцячымі галасамі напаўняліся сядзібы вёсак, якіх ужо проста не існуе... Паэт самоціцца, што заўчасна пакінулі гэты свет яго маці Пелагея і старэйшы брат Валянцін. Як сумленнага грамадзяніна і патрыёта сваёй Радзімы яго непакоіць, што з-за бяздумнай меліярацыі сохнуць на карані векавыя дубы ў адным з прыгажэйшых куточкаў Палесся — у Лельчыцкім раёне, пакутуе ад таго, што некаторых старажылаў — палешукоў, як і тых балотных журавоў, не пужае наяўнасць у глебе і вадзе радыяцыі. "Нікуды не паеду // Ад роднай зямлі, // Ад магіл... // Перад смерцю // Бадзяцца па свету? // Не паеду...// Мала сіл //Засталося... — // "Што ты, дурань стары? — // Бабка Прося галосіць. — // Радыяцыя..." // " Ат, прывыклі даўно... // Усё адно — // Радыяцыя, // Меліярацыя... // Хай яно ўсё згарыць...// Не паеду, сказаў, // Тут застануся жыць, // Буду тут паміраць..."

У вершах пераважае чорна-белы тон адзіноты — адзінокі журавель пры калодзежы і адзінокі журавель у небе. "Рыхтавалася ноч // Цемрай далеч ахутаць. // Раптам крык адзінокі // Данёсся з вышынь. // Над палескай ракой, // Даганяючы сутань, // Журавель галасіў // На ўсё неба... // Адзін..."

Не, не знарок, а ў кантэксце часу зусім невыпадкова супрацьпастаўлены адзін аднаму гэтыя сімвалічныя вобразы — адзінокі журавель на зямлі і адзінокі — у небе. Дзве тонка прыкмечаныя дэталі, за якімі — яны, паэт Башлакоў і мастак Барздыка. Першы напісаў выдатны верш, а другі стварыў самотны вобраз на паперы. І адразу ж уяўляецца палынова-горкі малюнак сапраўднасці ў зоне адсялення, які, дзякуючы шчыльнаму сімбіёзу двух таленавітых майстроў, нібыта праз павелічальнае шкло наблізіўся да беларускага і замежнага чытачоў.

У многіх вершах, змешчаных у кнігах "Нетры" і "Палын. Чарнобыль", бачыш, наколькі нямоцнае жыццё чалавека. Зрэшты, для Міхася Башлакова ў гэтым свеце ўсё цесна звязана — і жыццё жураўля, і чалавека, і планеты, і кветкі... У празорлівым вершы "Хроніка аднаго перасялення" аўтар піша: "Нездарма, — // Цётка Хрысця казала, — // Птушка ўночы крычала // За вёскай жахліва // Дзівам... // Нездарма // У калодзежы знікла вада // Перад гэтай бядою... // А цяпер і не трэба // Хадзіць за вадою. // Анікога няма..."

Не мною прыкмечана: любоў да радзімы ў таго, хто любіць яе глыбока і аддана, заўсёды цнатлівая. Не гучна сказана. І яшчэ аб адным. Пачуццё гэта непарушна знітавана з пачуццём прыроды. Гэтак, як піша пра радзіму, пра родную зямлю Міхась Башлакоў, пішуць нямногія. У яго пачуццях адлюстравана менавіта яго шырокая натура душы, яго непаўторная паэтычная індывідуальнасць. У творах паэта няма дэкларатыўнасці, ён не прыхільнік гучных прызнанняў у любві. Радзіма ў яго вершах заўсёды паўстае нібыта па-за тэмай, але яна неаддзельная ад чалавека і людскога лёсу. Радзіма выяўляецца ў яго вершах, як і ў графічных працах Міхася Барздыкі, нібыта зорка ў рачной люстрані.

**Валянцін БАРЫСЕВІЧ**




**Часам складваецца ўражанне, што Бог надзяліў беларусаў такой адметнай і мілагучнай мовай найперш дзеля таго, каб яны сведчылі пра высокае і прыгожае. Прыклады на кожным кроку. Як толькі дзе загавораць пра бытавое ды злабадзённае — то ўсё пераважна па-руску. А як пачуеш зрэдку беларускае маўленне, то абавязкова будзе яно звязана з нейкімі высокімі ісцінамі. Асабліва гэта тычыцца паэзіі. Здавалася б, ужо і мову родную ў падпечак загналі, а вершы з таго падполля ўсё пішуць і пішуць... Пішуць, вядома, і па-руску, але, прызнаюся як на духу, яны мне *не баляць*. Не ў тым сэнсе, што я не чытаю і не люблю паэзіі на рускай мове, якраз наадварот, а ў тым, што яна мне тут не родная.**

# «Простыя словы, простыя рэчы...»

Хоць далёка не ўсе вершы напісаныя па-беларуску ёсць з'явай літаратурнага мастацтва, прасцей кажучы, Паэзіяй. Але нават і такая, нізкапробная, вершатворчасць мне *свая*, бо мяне **родніць** з ёй мацярынская мова. Вядома, за такое рыфмаванне мне соромна. Таму даволі часта падобныя практычныя вопыты і графаманскія публікацыі я няшчадна крытыкую. Што праўда, ад таго іх не менее. Ды і гэтаму, як ні дзіўна, я таксама рады. Спадзяюся, шчыраму беларусу не трэба тлумачыць з якой прычыны.

Наша мова і літаратура вельмі маладыя ў параўнанні з іншымі і сёння знаходзяцца ў самым што ні на ёсць аптымальным стане свайго развіцця. Я не люблю гэтае, не адным пакаленнем зацёртае, слова "адраджэнне", бо нішто наша яшчэ дарэшты не памірала. І, спадзяюся, не памрэ. Таму і называю гэта *не адраджэннем*, а **развіццём**, ці ўжо на скрайні выпадак — ***існаваннем***.

Хочацца сказаць нешта значнае, а атрымліваецца банальнае. Гэта таму, што нагода ў мяне для гаворкі даволі звычайная — два новыя зборнікі вершаў малавядомых паэтаў. Аўтары — Васіль Андрыеўскі і Уладзімір Несцяровіч — людзі сталага веку і ў літаратуры не навічкі, хоць асаблівых лаўраў і вядомасці пакуль не займелі. Жывуць, працуюць, пішуць. Пішуць ад таго, што жывуць. Проста, даходліва, шчыра і прафесійна. Думаючы над назовам рэцэнзіі, мне ўспомнілася адна сучасная беларуская песня, здаецца, яе спявала Кася Камоцкая на словы Адама Глобуса. І ў тэксце песні рэфрэнам гучала: *"простыя словы, простыя рэчы..."* Якраз гэтае словазлучэнне як найлепш і тлумачыць маё стаўленне да гэтых паэтаў.

**Васіль Андрыеўскі** выдаў невялічкую памерам кніжачку невялічкіх вершаў (пераважна чатырохрадкоўных). Але пры гэтым і рэдактар у яго вядомы паэт і літаратуразнаўца Віктар Ярац і прадмову напісаў не менш знаны паэт Васіль Жуковіч. І Мазырская друкарня адгрузіла яму ажно 300 экземпляраў гожа афармленага выдання, абазванага **"Вербніцай"**. Нехта ж, спадзяюся, і апроч мяне, тыя вершы чытае ці яшчэ будзе чытаць. Сказаць, што ад прачытання іх я атрымаў вялікае задавальненне ці займеў неардынарнае ўражанне, не выпадае. Аднак і негатыўнымі эмоцыямі не нудзіўся. Вельмі ж усё знаёма мне ў вершах Андрыеўскага, перажытае на ўласным вопыце, правільнае і праведнае. Нездарма і на вокладцы выява хрысціянскага храма, сонца над купалам ды галубоў на вербнай галінцы... Ну вось, з чым тут можна не пагадзіцца разумнаму чалавеку?!

*Гасподзь стварыў*
*зямлю і неба,*
*Адама з Еваю стварыў.*
*Пітва ім даў і даў ім хлеба,*
*Дабром, любоўю адарыў...*
*А нам для шчасця —*
*болей трэба?..*

Гэта я працытаваў увесь верш. Іншая справа, ці трэба дзеля гэтай аксіёмы падбіраць адпаведны рытмічны лад і бясхітрасныя відавочныя рыфмы? Сцвярджэнне вядомага ёсць, але няма здзіўлення, ужо не кажучы хоць пра якое лірычна-душэўнае адкрыццё. Іншым разам ствараецца нядобрае ўражанне, што спадар Васіль падшыў да рукапісу кніжкі і не адпраўленыя паштовыя віншаванні, скажам, як вось гэтае з нагоды жаночага дня:

*У гэты дзень*
*святочна-веснавы,*
*Калі букет і сонца*
*так дарэчы,*
*Хачу, каб шчасцем*
*поўніліся вы —*
*Зямным, звычайным*
*шчасцем чалавечым!*

Альбо вось працяг жаночай тэмы. Вершаваны абразок кахання:

*Намалюю спатканне*
*(Старамодны сюжэт):*
*Ён. Яна. Хваляванне.*
*Пацалункаў букет...*

Бадай, які-небудзь вясковы мужык і праслязіцца, вядома, калі ён хоць якія кніжкі пасля сканчэння школы чытае... Аддамо нашаму аўтару належнае, ён і сам разумее свае слабасці, бо ў чарговым чатырохрадкоўі занатоўвае наступнае:

*Ходзіць, вандруе*
*па свеце паэт,*
*Трапнаю рыфмай*
*праблемы высвечвае.*
*Бачыць паэт,*
*як заходзіцца свет*
*Ад раўнадушша*
*і зла чалавечага.*

І калі ўжо нашы літаратары стануць **абыякавымі** да гэтага рускамоўнага *"раўнадушша"* ("равнодушия").

Як і сцвярджаў вышэй, я абедзвюма рукамі за тое, каб больш людзей пісалі вершы на роднай мове (ды і на іншых мовах таксама), бо, адназначна, гэта будзе сведчыць на карысць духоўнай і гуманнай сутнасці нашага грамадства. Але вершы і зборнікі такога самадзейнага кшталту няхай бы і распаўсюджваліся і чыталіся ў коле родных, блізкіх і знаёмых гэтых аўтараў. Каб не патраплялі праз першыя ці трэція рукі такія кніжкі на стол аддзелаў культуры і крытыкі рэспубліканскіх газет з непрыхаванай надзеяй быць адрэцэнзаванымі. А як у нас талерантна і памяркоўна рэцэнзуюць свежаспечаныя кніжкі ўсе добра ведаюць... Вось і складваецца гэткае ўра-патрыятычнае сярэдне-арыфметычнае ўражанне ад сучаснага літаратурнага працэсу. Так і юдзіць сказаць: шаноўнае спадарства, калі вы не хочаце, каб ваш "вершаваны фальклор" раздраконьваў Ю. Фатнеў, а крытыкавала і рэкламавала, скажам, І. Шаўлякова, то і пішыце адпаведна і дасылайце сваё ў належныя інстанцыі...

А паэтычныя здольнасці ў В. Андрыеўскага ёсць, бо вось як лаканічна і па-мастацку піша ён пра паследкі чарнобыльскай бяды:

*Ціхі ранак. Спелы яблык*
*Белага наліву,*
*Ад расы крыху азяблы,*
*Ды кранаць — жахліва.*

**Уладзімір Несцяровіч** выдаў свой вершаваны зборнік **"Сто дарог"** (мне здаецца, такі назоў калісьці мела кніжка пісьменніцкіх аўтабіяграфій) у новым выдавецтве "Галіяфы", якое не так даўно прэзентавала сябе як вельмі сучаснае і адмысловае. І па ўсім відаць, у спадара У. Несцяровіча гэта літаратурны дэбют. Я слаба ведаю, хто такі Алесь Бычкоўскі, але тое, што ён паліткарэктна напісаў у прадмове да гэтай кніжкі абсалютна адпавядае маім чытацкім уражанням. Канечне, адчуваецца, што вершы Несцяровіча на парадак вышэй за вершы Андрыеўскага, але гэты *парадак* таксама не сягае да вяршыні Парнаса. Скажам, гэта **добраўпарадкаваныя** ва ўсіх сэнсах вершы. Апроч прадмовы А. Бычкоўскага, аўтар выдрукаваў і сваё ўласнае "Слова да чытача", як бы прадчуваючы патрэбу акрэсліць сваю чалавечую жыццёва-зямную своеасаблівасць ды заадно, між слоў, на манер класічна-купалаўскага рэфрэна *"я не паэта, о крый мяне божа!"*, намякнуць на чытацкую спагадлівасць у адносінах да прэзентаваных ім вершаў. Мяне асабліва ўразіў такі фрагмент з яго біяграфіі: *"Памятаю, ужо заканчваючы Каменнаборскую дзесяцігодку, мы рыхтаваліся да апошняга званка. Ганна Сцяпанаўна Паддубская, наш класны кіраўнік, абводзячы кожнага з вучняў сваім дапытлівым позіркам, запыталася: "А можа, хто з вас вершык напісаў бы?" Ніхто з вучняў, у тым ліку і я, на ўроках беларускай літаратуры паэтычных надзей не падаваў. А позірк класнай тым часам спыніўся на мне. Я зразумеў той позірк як заданне настаўніцы і выканаў яго. Думаецца, што гэта ў многім вызначыла напрамак майго жыццёвага шляху. Вось бачыце, як проста атрымалася"*.

Вось так, дамыслю я спадара Несцяровіча, у асноўным і *атрымліваюцца* беларускія паэты. Тыя ж адзінкавыя, што з'яўляюцца выключэннямі з гэтага правіла, паэтамі **нараджаюцца**. Але гэта зусім іншая гаворка.

Не буду крывіць душой, трапляюцца ў зборніку У. Несцяровіча і добрыя вершы. Яны, як правільна заўважыў А. Бычкоўскі, *"быццам з натуры. Але пры гэтым паэт умела пазбягае натуралізму, прасталінейнасці"*. Сам аўтар зборніка ў свой час скончыў Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава і факультэт журналістыкі БДУ. Да ўсяго ён заўзяты рыбалоў і паляўнічы. Перажыў на ўласным жыццёвым вопыце сямейнае гора і вытрываў іншыя суровыя выпрабаванні часу. Таму вершы яго, на мой погляд, не так натуральныя, як апісальныя. Іншая справа, што паэт не можа ўзвысіцца над рэчаіснym.

*Хто пра што, а я пра восень:*
*Я пайшоў на агарод,*
*Гарбузы там з град пазносіў*
*Склаў да кучы іх пад плот.*

Што тут скажаш?! Працалюбівы наш паэт. Любіць і шануе патрыярхальны вясковы ўклад жыцця і асабліва — восеньскую пару года. Менавіта ў гэты час усё яму там мілa і блізка. І з гэтай прычыны такія яго неаспрэчныя высновы:

*Ты рай жыцця, маё сяло, —*
*Бяжыць сіяжынка*
*да крыніцы.*
*Сюды мяне і прывяло —*
*Тут грэх паэтам не радзіцца.*
.....
*Мне, мама,*
*твой прыемны твар,*
*Лічы, з калыскі самай сніцца.*
*Свайму я слову гаспадар —*
*Не мог паэтам не радзіцца.*

Ну а калі ўжо нарадзіўся ім (абвяргаючы маё папярэдняе меркаванне), то ўжо рыфмуй на ўсе чатыры бакі свету, альбо нават (дакладна як Андрыеўскі) пішы альбомныя віншаванні:

*Ёсць на свеце*
*важная прычына,*
*Надыходзіць радасная дата.*
*З днём вясны,*
*шаноўныя жанчыны!*
*Жыць вам добра,*
*радасна, багата.*

Карацей кажучы, прачытаўшы гэтыя дзве кніжкі вершаў (пры гэтым наўмысна абмінуўшы яшчэ 22 падобныя да іх), хачу вось што зазначыць: былі ў нас калісьці такія паэты *з народа* (не блытаць з **народнымі**) як Мікола Засім і Міхась Васілёк, то чаму сёння не могуць быць падобныя да іх Васіль Андрыеўскі і Уладзімір Несцяровіч? І няхай будуць. Спадзяюся, і чытач у іх адпаведны знойдзецца. А значыць, і беларускамоўны асяродак... Не ўсім жа быць недасяжнымі Разанавымі. А зрэшты, калі прырода і грамадскі час паспрыяюць, глядзіш, будуць і яны паціху падцягвацца...

А пакуль ад імя гільдзіі крытыкаў, прывітаю нашых паэтаў пафаснымі словамі У. Несцяровіча, якому, праўда, ужо на дваццаць гадоў болей:

*39 — у жыцці нямнога —*
*Вунь Пегас крылом*
*заварушыў.*
*Дык няхай нясе*
*ён Вас дарогай*
*Да бліскучых творчасці*
*вяршынь!*

**ЛеГАЛ**

# Дыялог пра чалавечнасць

Мае сучаснікі спяшаюць жыць. І ў мільгаценні падзей нашых дзён часта страчваюць самае галоўнае — хвіліны душэўнага роздуму, неабходныя для пазнання сутнасці жыцця. Нельга так сказаць пра Васіля Рагаўцова, зборнік вершаў якога "На роскрыжы дарог" не так даўно пабачыў свет дзякуючы выдавецтву "Кнігазбор". Такую адметную назву прыдумаў аўтар для свайго зборніка, яна сімвалічная, бо лірычны герой сапраўды апынаецца на раздарожжы жыцця. Ён шукае сябе, сваё адметнае спасціжэнне свету, прагне самавыяўлення ў слове. У большасці вершаў, што склалі кніжку, гэта яму ўдаецца. Лірыка В. Рагаўцова — пранікнёная і шчырая, часам аўтару ўдаецца падняцца да філасофскіх абагульненняў.

*Кажуць,*
*Перад Богам усе роўныя.*
*Як шкада —*
*Не на гэтым свеце.*

Тэматычна разнастайныя вершы паяднаны заглыбленым роздумам, вызначаюцца вобразнай насычанасцю. У кароткіх вершах аўтара мноства пытанняў, адказаць на іх ён запрашае і чытача. Запрашэнне да дыялога — своеасаблівы мастацкі прыём, якім карыстаецца В. Рагаўцоў, каб стварыць эмацыянальную прастору сваёй паэтычнай кніжкі. І аўтару гэта ўдаецца, ён бярэ ў суразмоўцы сваю маці — самага галоўнага чалавека ў жыцці. Вершы, прысвечаныя ёй, сагрэтыя сыноўняй павагай і любоўю. Яны ствараюць своеасаблівы эмацыянальны цэнтр зборніка.

*Нярэдка бывае:*
*Хто нічога не сее,*
*Той спорна жне,*
*Пра такіх мая маці казала:*
*"Як няма ў іх сваіх лапцей*
*То й з чужых*
*не стануць багацей".*

Культура нацыі захоўвае ў сабе сэнс чалавечага жыцця. Пра гэта большасць вершаў В. Рагаўцова з апошняга зборніка. Вядома, традыцыі складаюць духоўную сутнасць народа, ён іх носьбіт і стваральнік, на гэтым акцэнтуе ўвагу чытача аўтар.

*Самае дарагое —*
*тое,*
*што беражэцца ў душы і памяці,*
*як неацэннае багацце,*
*якое ты бездапаможны*
*растраціць.*

У прыродзе ўсё паўтараецца і ўзнаўляецца, але ў душы нічога паўтарыцца не можа. І шукае В. Рагаўцоў пастаяннае, вечнае ў прыродзе, таму што востра адчувае адзіную непаўторнасць чалавечай асобы. Таму і зацікаўлены характвом прыроды, адчувае час, дараваны чалавеку. Калі гора становіцца вопытам і з гэтага пачуцця трэба вынесці мудрасць. Мудрасць вершаў В. Рагаўцова прасякнутая разуменнем і спачуваннем.

Лірычнаму герою В. Рагаўцова не прымальныя канфармізм, страх, абыякавасць, зайздрасць. Лёс і будучыня наступных пакаленняў залежаць ад духоўнасці ўсёй чалавечай супольнасці. Гэта адна з галоўных думак зборніка В. Рагаўцова "На роскрыжы дарог".

Доктар філалагічных навук В. Рагаўцоў у сваёй лірычнай споведзі застаецца верным самому сабе. Яго паэзію можна назваць інтэлектуальнай, яна асветлена цёплай роздумнасцю, як і ў яго ранейшых зборніках "Сутонне", "Далягляд", ён мае добрую фальклорную аснову, вызначаецца багатай метафарычнасцю:

*Туманее раніца.*
*Пахне сырадоем*
*Няскошаная атава.*

Прачытаўшы новыя вершы Васіля Рагаўцова, прыходзіш да высновы, што яго дыялог са светам атрымаўся.

**Аляксей ПІСЬМЯНКОЎ**


Проза

НИКОЛАЙ ЕЛЕНЕВСКИЙ
(Беларусь)

Время пастыря

Роман-хроника

Время пастыря — это мгновение, превращённое в вечность.
Автор

Пролог

**У маляўнічым, надзіва прыгожым горадзе Пінску жыве празаік Мікола Елянеўскі, працуе рэдактарам газеты «Полесская правда». Ён піша творы пра армію, бо сам у мінулым вайсковец, выпускнік факультэта журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча, падпалкоўнік запасу. Пра царкву — таму што, заяўляе, калі і ёсць на зямлі нешта святое, то толькі дзякуючы святарам; яны здавён з'яўляюцца пасрэднікамі паміж Богам і людзьмі.**

# Вяртанне

Я ведаў, што М. Елянеўскі працуе над раманам-хронікай. Ён ахвотна дзяліўся планамі, паказваў мне старадрукі, над якімі дрыжэў, як жанчыны толькі, мусіць, дрыжаць над брыльянтамі: рукамі не кранаць! Я разумеў яго. Таму што ведаю, як няпроста ішоў да гэтай працы пісьменнік, ён ці не ўпершыню на Беларусі ўвасобіў у такім буйным мастацкім творы, як раман, лёсы святароў, якія жылі ў XIX—XX стст.

Аўтар назваў свой раман-хроніку «Время пастыря» і надрукаваў у чацвёртым нумары часопіса «Нёман» за мінулы год. Пачынаецца твор з таго хвалюючага моманту, калі Пінск жыў чаканнем сустрэчы з Найсвяцейшым Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Алексіем II. Гараджане, людзі з навакольных вёсак павінны былі стаць сведкамі правядзення Чына Вялікага Асвячэння новага Свята-Феадароўскага сабора.

Сабор упрыгожыў горад, велічна ўзнёс свае купалы, усяліў у душы веруючых, і не толькі іх, пачуццё гонару. На сустрэчу з Патрыярхам Алексіем II прыйшлі і стары, і малы. Першамайскую вуліцу людзі ўсыпалі кветкамі...

На наступны дзень у Міколы Елянеўскага надарылася магчымасць звярнуцца да Патрыярха з просьбай, каб ён блаславіў яго на завяршэнне той справы, якой жыў ужо некалькі год. «Патрыярх уважліва глянуў у вочы, яго рука лёгка ўзляцела нада мной і лягла на галаву: — Бласлаўляю».

Як прызнаецца пісьменнік, тое бацькоўскае «бласлаўляю» дадало надзеі. За плячыма засталіся многія гады пошуку, аднак асаблівых вынікаў, на жаль, не было. «Але ж верылася, верылася, верылася...»

Дык што ж гэта за пошук такі? Адкуль усё пачалося?

Трэба сказаць, што М. Елянеўскі нарадзіўся ў вёсцы Луніне Лунінецкага раёна — у вёсцы з надзвычай багатай і цікавай гісторыяй. Стваралі яе, вядома ж, людзі. Адзін з іх — Васіль Карпец, мясцовы каваль і следапыт. Маючы сямігадовую адукацыю, ён шмат выпісваў газет, цікавіўся гісторыяй роднага краю, стаў вядомым далёка за межамі раёна. Як адзначае пісьменнік, у гэта цяжка паверыць, але калі чытаеш захаваныя жонкай (В. Карпец, на жаль, памёр) ягоныя лісты ў кнігарні, музеі, ліставанні з сябрамі, якія атабарыліся ў Мінску, у абласных цэнтрах, здзіўляешся: што ж прымусіла вясковага каваля ўзняцца на такую вышыню? Ён, дарэчы, адпраўляў цікавыя экспанаты ў музей Беларускага Палесся, у Брэсцкі краязнаўчы музей. Да таго ж, быў надта сціплым чалавекам. І што цікава: аднавяскоўцы паважалі земляка не за ягонае захапленне краязнаўствам, а за тое, што добра граў на гармоніку і мог, да прыкладу, выштукаваць вясковай жанчыне адмысловую капанічку.

Што ж тычыць стасункаў землякоў — пісьменніка і каваля-краязнаўца — то яны перараслі не толькі ў сяброўства, але і ў плённае творчае супрацоўніцтва. Менавіта ад Васіля Карпца Мікола Елянеўскі даведаўся пра мясцовага святара Платона Максімавіча Ціхановіча: «Справа была так. Калі зачынялі нашу царкву, паўстала пытанне, куды падзець царкоўную бібліятэку. А бібліятэка, я табе скажу, была вялікая. Калі ўбачыў, колькі ў ёй кніжак, ажно дух захапіла. Вось Аляксандр Іосіфавіч Плешка, наш святар, і прапанаваў мне забраць частку, паколькі каму толькі ён ні прапаноўваў, усе адмаўляліся. Там многа рэдкіх, цікавых кніжак мелася. Ведаеш, збіралі тую бібліятэку лунінскія святары стагоддзямі і перадавалі разам з храмам па спадчыне. Цудоўныя людзі былі. Больш таго, ад Плешкі я і даведаўся, што першую беларускую граматыку стварыў Ціхановіч... Мне Плешка часта расказваў пра тое, што Ціхановіч неаднойчы з крыўдай успамінаў, што яе, граматыку, так і не выдалі, хаця абяцалі, што выдадуць. Дзе яна цяпер, граматыка Ціхановіча? Плешка спадзяецца, мажліва, у якім-небудзь архіве захавалася. Я адпраўляў запыты па розных адрасах, аднак суцяшальнага адказу не атрымаў ніводнага: няма, і рады б, але ж... Згубілася? Толькі ж гэта не дзве-тры старонкі, а сур'ёзная праца. След павінен застацца».

Вось якія кавалі былі ў нас на Беларусі. Трэба зняць перад імі шапку.

Але ж дзе шукаць саму граматыку? Літаратуразнаўца Г. Каханоўскі спасылаецца на цэнтральны дзяржаўны архіў Літоўскай ССР.

М. Елянеўскі звязаўся з архівам. Адказ прыйшоў надзіва хутка: ёсць у іх граматыка Ціхановіча, і за пэўныя грошы могуць даслаць электронную копію. Аднак жа грошы вялікія, не так проста адарваць іх ад сямейнага бюджэту. Ды што паробіш, калі трэба!..

Неўзабаве з Літвы прыйшла акуратная бандэроль з дыскам.

**Дык хто ж ён такі, Платон Максімавіч Ціхановіч? З якой сям'і? Адкуль родам? Як склаўся ягоны жыццёвы лёс? Пра ўсё гэта распавядае нам Мікола Елянеўскі. Раман-хроніка «Время пастыря» не вымысел, а глыбока дакументальны твор. З яго мы даведваемся, як жылі святары, што іх непакоіла. Захапляюць і тыя старонкі, што паказваюць нам, як вучыліся духоўнікі ў семінарыях: аўтар акцэнтуе ўвагу на побытавых умовах семінарыстаў, на іх адносінах да старэйшых.**

З рамана-хронікі М. Елянеўскага: «І на свае вочы я ўбачыў ужо знаёмы акуратна-прыгожы почырк Платона Максімавіча Ціхановіча. Почырк, непадуладны часу. Здавалася, прамінулыя 100 з нечым гадоў зніклі: час паляцеў назад, час прыблізіў да мяне Ціхановіча так, быццам ён вось толькі што вярнуўся пасля службы ў царкве, пагладзіў шырокую бараду і прысеў побач. У рукапісе Платона Максімавіча Ціхановіча мова льецца неперапынна звонкім струменьчыкам, быццам з жывой крыніцы.

Адсюль і своеасаблівы характар тых людзей, што размаўляюць паміж сабой: іх успрыманне часу, адносіны да рэчаіснасці. Колькі моўных фарбаў! Які тэмперамент! Якая насычанасць дзеяннем! На кожным слове знак правільнага націску для дакладнага вымаўлення... А сама граматыка — гэта своеасаблівыя мініяцюры, пададзеныя на дзвюх мовах, якімі і сёння нельга не захапляцца».

Як адзначае ў сваім раманехроніцы М. Елянеўскі, граматыка Ціхановіча — праца не аднаго месяца, не аднаго года. Практычна скончыўшы яе ў 1874 годзе, ён перад адпраўкай у камітэт конкурсу на стварэнне падручніка для школ Паўночна-Заходняга краю перапісаў сваю працу начыста, паставіў студзеньскую дату 1875 года. Гэты конкурс праводзіўся Мінскай дырэкцыяй народных вучылішчаў Мінскай губерні пад патранатам Віленскай вучэбнай акругі.

Зноў жа адзначае аўтар рамана-хронікі: літоўскаму філолагу Ф. Куршату з ягонай граматыкай пашанцавала значна больш, чым Ціхановічу. Напісаная прыкладна ў той жа час, яна, тым не менш, была выдадзена ў нямецкім горадзе Галле ў 1876 годзе...

Дык хто ж ён такі, Платон Максімавіч Ціхановіч? З якой сям'і? Адкуль родам? Як склаўся ягоны жыццёвы лёс? Пра ўсё гэта распавядае нам Мікола Елянеўскі. Раман-хроніка «Время пастыря» не вымысел, а глыбока дакументальны твор. З яго мы даведваемся, як жылі святары, што іх непакоіла. Захапляюць і тыя старонкі, што паказваюць нам, як вучыліся духоўнікі ў семінарыях: аўтар акцэнтуе ўвагу на побытавых умовах семінарыстаў, на іх адносінах да старэйшых.

І складваецца прыемнае ўражанне: усе героі рамана-хронікі былі светлыя людзі.

Трэба таксама адзначыць, што героі рамана-хронікі жывуць не толькі на Палессі... І пісьменнік апавядае нам пра іх не менш грунтоўна, чым пра самога Платона Ціхановіча. Цікавыя лёсы. Невычэрпны матэрыял для творцы.

Пра мудрасць святароў яскрава сведчыць наступны факт. Святар Мікалай Коласаў надрукаваў у некалькіх кніжках часопіса «Душеполезное чтение» ў 1903 годзе артыкул «Светасузіранне і героі Максіма Горкага перад судом праваслаўнага чытача». У ім на прыкладах з самых розных апавяданняў, такіх, як «Канавалаў», «Былыя людзі», «У стэпе», «Емяльян Піляй», «Мальва» і інш. робіць выснову, што Горкі пакланяецца гвалту і сіле, што галоўныя героі ў яго — басякі і прайдзісветы, для якіх радзіма, айчына — пустыя словы. Басяк, сцвярджае М. Коласаў, засланяе ў Горкага ўвесь рускі народ. Уяўляеце, ў 1903 годзе святар Мікалай Коласаў друкуе, па сутнасці, цалкам крытычны артыкул з працягам, з нумара ў нумар, пра творчасць Максіма Горкага?

У газетнай нататцы пра раманхроніку «Время пастыря» немагчыма спыніцца на ўсіх вартасцях і асаблівасцях гэтага твора. Трэба адзначыць, што М. Елянеўскі зрабіў добрую, патрэбную і сур'ёзную працу. Сваю гісторыю мы павінны памятаць.

На чарзе — новая сустрэча з яго жыццёвай прозай, дзе галоўнымі героямі будуць зноў жа святары.

Быў час пастыраў на Белай Русі. І гэты час зноў вярнуўся да нас.

Пад тым жа блакітным небам.

***Як ужо паведамлялася, 7 лютага ў епархіі былі ўручаны прэміі пераможцам Рэспубліканскага творчага конкурсу на лепшае асвятленне гісторыі і сучаснасці беларускага праваслаўя ў СМІ. Дыпломам першай прэміі ўзнагароджаны пісьменнік Мікалай Елянеўскі за раман-хроніку "Время пастыря", які быў надрукаваны ў мінулым годзе ў часопісе "Нёман" (№ 4).***

**Васіль ТКАЧОЎ**

# Ці ўсе фарбы роўныя?

**Дэбютная кніга вершаў Ю. Новік "Сонца за тэрыконамі" як мага лепей адпавядае сваёй назве – сапраўды, вельмі няпроста было адшукаць сонца паэзіі за тэрыконамі слоўнай гульні. Прынамсі, на першых трыццаці старонках гэтага сонца ўвогуле не было відаць — не кожны чытач мае шанц да яго дабрацца.**

Першыя вершы ствараюць даволі неадназначнае ўражанне: ты нібы адчуваеш, што Ю. Новік мае нешта сказаць, што за рыфмамі прыхавана сур'ёзнае, але зразумець гэта амаль немагчыма: настолькі невыразная паэтычная думка, настолькі цьмяна і заблытана звязаныя паміж сабой вобразы нават у адной страфе, што неўзабаве страчваеш цярплівасць: замест таго, каб спрабаваць адшукаць сэнс, пераконваеш сябе, што яго там папросту няма:

*Гэты месяц і ўжо наступны*
*У куфэрку ляжаць на дне.*
*Ды фальшывы прыйшоў заступнік*
*І пачуцці прадаў танней.*
*Котка белая пагуляла —*
*Поўсць на чорны сышла дыван.*
*Пэўна, светлага будзе мала —*
*Мне не хопіць, а хопіць вам.*

Вельмі нагадвае прынцып: што бачу, тое й спяваю, і такіх вершаў у зборніку шмат. Даходзіць нават да таго, што банальныя, з безліч разоў ужываемымі паэтычнымі штампамі чатырохрадкоўі ўсё-ткі радуюць вока сваёй зразумеласцю:

*І не балюча падаць з вышыні.*
*І не шкада расплачвацца слязою,*
*Пакуль гараць на астравах спакою*
*Надзеі чыстай цёплыя агні.*

Вельмі часта недарэчнымі выглядаюць апошнія радкі вершаў, такое ўражанне, што Ю. Новік дапісвала іх пазней за асноўны тэкст — неяк неахайна і мімаходзь:

*Хоць крышачку мысліць — млосна.*
*Пасуньцеся там, пад плотам!*
*А тое, што будзе потым, —*
*Тады, калі будзе позна.*

Першыя тры нізкі — "За кожным крокам — галасы", "Мой спакой", "Тое, што будзе потым" — выглядаюць як звычайнае вучнёўскае практыкаванне ў майстэрстве валодання словам і рыфмай, калі якісьці арыгінальны вобраз настолькі натхняе сваю аўтарку, што набывае самазмястоўнасць, і руплівасць яго сэнсоўнасць у такім выпадку робіцца зусім неабавязковым. Між тым, першыя промні сапраўднага паэтычнага сонца з'яўляюцца ў нізцы "Імгненні" — надзвычай суладнай, гарманічнай у дачыненні да тых вершаў, якія яна аб'ядноўвае:

*Глуха б'ецца*
*Гадзіннікавая стрэлка.*
*Зрывае секунды*
*З густой павуціны*
*Няўмольнага часу.*

Самыя ўдалыя, на мой погляд, нізкі — "Навальніца — забойца сну", "Басанож па восені", "Вымяраецца ўсё табою". Вядома, і тут яшчэ многа выпадковага, штучна ўзнятага да паэтычнай глыбіні, але эстэтычнай эквілібрыстыкі становіцца ўсё менш і менш, а сур'ёзных і шчырых нотак — больш. Сапраўднай шчырасці ў сучаснай паэзіі насамрэч вельмі мала — яна ўяўляецца нейкай састарэлай эстэтычнай катэгорыяй. Вось таму такой сімпатычнай у кнізе Ю. Новік падаецца менавіта шчырая праніклівасць тону:

*Час спыніўся.*
*Глыбокі сон.*
*Вымяраецца ўсё Табою.*
*А пяшчота, нібы праклён,*
*На жыццё насылае мрою.*
*Рух спыніўся.*
*Няма мяжы.*
*Не кранусь: мяне трымаюць*
*Сотні ніцяў тваёй душы...*
*Пра астатняе — забываю.*

Нягледзячы на тое, што Ю. Новік часта згадвае пра замкнутасць сваіх перажыванняў "у чатырох сценах", у яе атрымліваецца кінуць (хай сабе і з акна пакоя) такі позірк на свет, што ён увачавідкі пачынае поўніцца паэзіяй — не завоблачнай паэзіяй нязбытных мараў, не засяроджанай паэзіяй унутранага свету, але яркай, уражвальнай паэзіяй навакольнага жыцця:

*Пасля свята здымаюць сцягі.*
*Мой горад стаіць пад восенню.*
*Мой дом — астравок тугі,*
*Кожны дзень яе выносім мы:*
*Хто ў вачах, хто ў сэрцы, хто так,*
*Хто аберач выводзіць. Цяжкую.*
*А на даху жыве мастак,*
*А пад дахам сэрцы тахкаюць.*

Прыгадваючы самы кароткі верш Ю. Новік (Перад дажджом / Усе фарбы роўныя.), хочацца адзначыць, што ў яе кнізе акурат-такі не ўсе фарбы-вершы роўныя: ёсць яркія, насычаныя, сакавітыя, але шмат яшчэ і бляклых, размытых. Будзем спадзявацца, што гэта ўсяго толькі заканамернасць творчага росту і чакаць новых фарбаў.

**Жана КАПУСТА**



## Сяргей ПАНІЗНІК

### Бацькаўшчына

*Бацькаўшчына.*
*Алтарная!*
*Наша любоў.*
*Промнікі слоў.*
*Зямля сяброў —*
*на крыжах дарог.*
*Дом, дзе жывём,*
*у спадчыну нам ад вякоў.*
*Родны парог*
*для нас бярог*
*валадар Айчыны — Бог.*

*Веруем, веруем Радзіме сваёй.*
*Мы, як і продкі, у даўгу перад ёй.*
*Для Беларусі мы жылі, будзем жыць, — вечнай малітвай непагасна служыць.*

*Бацькаўшчына!*
*Святла струна,*
*сонца ўзыход.*
*Мы на зямлі ў адной сям'і.*
*Усявышні змог*
*нас апазнаць і веру даць:*
*вольны народ*
*не прападзе*
*ў святой хадзе.*
*Валадар Краіны — Бог!*

### Юрмальскі прычал

*Адчай ад чаек...*
*Мне б цяпер — чайку:*
*гарбатага*
*хай выпраміць гарбата.*
*П'ю — узахлёб,*
*з адвагай лупаватай,*
*нібыта вырваў*
*з кубачка чаку.*
*Яшчэ глыток — і*
*узарвецца пляж,*
*уздыбяцца з прыбоем*
*румаў горы...*
*Хачу, каб выйшла*
*Беларусь да мора:*
*маяк над Атлантыдай*
*будзе — наш!*
*Граніц дзяржаўных*
*непарушны знак.*
*Я і не лезу*
*ў чэрава замежжа.*
*А п'ю не чай — ручай*
*з крыніцы свежай*
*за незалежны*
*стырнавы разгон.*
*Прычал пад чайкай*
*бачу, плытагон.*

### Паднебная пошта

*Сівее мара-кроза.*
*Жыцця прыцісне проза —*
*і вылецяць са стоса*
*лісткі календара.*
*Пакуль яшчэ не позна, —*
*успомню Званара.*
*За пуцяводнай зоркай*
*дарогаю-рысоркай*
*мне б мысляю-вавёркай*
*дабегчы да ствала.*
*І ў крону па-над горкай*
*уткнуцца, дзе жыла*
*вясёлай чараўніцай:*
*юнацкая зарніца:*
*была ў руках сініца, —*
*сплыла да жураўля.*
*І мне зімою сніцца*
*бяскрылая зямля.*
*Але не позна ў вецце*
*мне дзятлікам залезці*
*і прыпавесці-весці*
*адстукаць Званару:*
*"Не вер календару!*
*Я берагу ў канверце*
*паэзіі-нявесце*
*юнацкую зару".*

### Додніца

*Ноч сукеначку здымае.*
*Лес — на дыбачкі.*
*Веташок для нас трымае*
*срэбра скібачкі.*

*Над зямлёю неба млее.*
*Зоркі моляцца.*
*У знямозе салавее*
*ноч-супольніца.*

*І тваімі*
*вецер вёрткі*
*шэпча вуснамі.*
*Знічка сцелецца вавёркай*
*над спакусамі.*

*Ціха стукнула ў акенца*
*наша додніца*
*і прылегла на сукенцы, —*
*нам запомніцца.*

### Кольцы гадоў

*Будзем неба прытуляць*
*і на досвіткі глядзець,*
*каб любоў сваю люляць,*
*пад заранкай маладзець.*

*Трыста шэсцьдзесят пяць:*
*дні — серабро і медзь...*
*Любіш — будзеш умець*
*кольцы гадоў каваць.*

*Будзем сэрцы велічаць,*
*рай ствараць і ў шалашы,*
*каб каханню палыхаць*
*над каўчэгамі душы.*

*Мы гатовыя пачаць*
*(Божа, шчасце не зацьмі!)*
*сонейка вачмі ўключаць,*
*поўню выключаць грудзьмі.*

*Трыста шэсцьдзесят пяць:*
*дні — серабро і медзь...*
*Любіш —*
*будзеш умець*
*кольцы гадоў каваць.*



## Анатоль ЦЫРКУНОЎ

### Вясна 1986

*Была пагодлівай вясна,*
*Хто ж мог чакаць бяды,*
*Што хутка з'явіцца яна,*
*Не ведалі тады.*

*І толькі месяца святло*
*Уночы перад тым,*
*Над ціхай Прыпяццю было*
*Злавесным быццам дым.*

* * *

*Надзею, як дачку малую,*
*Душой даверлівай мілую,*
*А недаверлівая памяць*
*Трызніць сваё :*
*не вер, падманіць,*
*Няўжо так цяжка зразумець —*
*Бывае вернай толькі смерць.*

### Вярба

*Мая вярба не мае лісця.*
*Шчакой да хворай прыпаду,*
*І ўспомню з сумам,*
*што калісьці*
*Я піў пад ёй з ручча ваду.*

*Што ўжо казаць пра чалавека,*
*Калі і дрэва гнуць гады:*
*Няма ручча, вярба калека,*
*А сонца свеціць як заўжды.*

* * *

*Сцюдзёны восеньскі зазімак*
*Ахутаў шэранню кусты,*
*З бярозак, клёнаў і асінак*
*Зляцелі кволыя лісты.*

*І стоячы прыбранай паннай,*
*Між голых дрэў зусім адна,*
*Здаецца з'яваю падманнай*
*Вечназялёная сасна.*

* * *

*Вы скажаце: слухаць не трэба*
*Брутальных паяцаў старых,*
*І "бардаў", што рыканнем рэпа*
*Траўміруюць нервы і слых.*

*Ды як зберагчы ад іх вушы,*
*Калі ім належыць эфір,*
*Дзе травіць нявінныя душы*
*Бязбожны тэлевампір.*

*Так хочацца, часам, паверце,*
*Схавацца ў дрымучай глушы,*
*І слухаць Шапэна і Вердзі*
*Для заспакаення душы.*

### Коплы

Паводле іспанскага кантэ-хонда

*Жыву і ў душы нашу*
*Надзею на лепшыя дні,*
*Калі сустрэну душу,*
*Якой не шкада цеплыні.*

* * *

*Каб толькі маці мая*
*Устала з труны жывая,*
*Адсек бы руку сабе я,*
*Якою хлеб здабываю.*

* * *

*Сустракаю дзённае свяціла*
*З думкаю адною:*
*Зорачка, што раніцай будзіла,*
*Болей не са мною.*

* * *

*Я нёс, пакуль былі сілы,*
*Свой крыж шмат дзён і начэй,*
*І вось данёс да магілы,*
*І скінуў ношу з плячэй.*

## Вераніка ЛІВОРНА

* * *

*Ціха крадзецца мой цень*
*каля дрэва...*
*Доўга блукала я ў свеце далёкім,*
*Там,*
*дзе хадзіць не баялася Дзева,*
*Там,*
*дзе анёлаў шукалі аблокі.*

*Моўчкі крадуся паўз леташні верас,*
*Пераступаючы праўду і веру,*
*Нібы шукаючы сны кавалеру...*
*Божа,*
*ды ў іх жа і дзеці не вераць,*

*Быццам не вераць*
*у вольныя крылы...*
*Зноў расплятаю дзявочыя косы.*
*Доўга стаю перад небам пахілым,*
*Перабіраючы ў памяці лёсы.*

* * *

*Я баялася выйсці за дзверы,*
*За якімі наладзілі ловы*
*Не пачуцці,*
*а так —*
*ненажэры —*
*Прамаўляныя поўначчу словы.*

*Я цуралася бавіцца ў скверы*
*І стаяць над маўклівай ракою, —*
*Бо яны пагублялі манеры,*
*Патураюць майму неспакою.*

*Я панурыя гмахі мінала,*
*Не шукаючы звабнага ў свеце,*
*Дзе і час,*
*як спакуснік-мяняла,*
*Выцыганьвае волю за вецер.*

*Я ўцякала глыбока-высока*
*І казала сабе як з мальбою,*
*Што стамляюся быць адзінокай,*
*Ды яшчэ застаюся сабою.*

### Лігурыя

*Снавалася вечнасці пража,*
*Калі я ў вачах не насіла*
*Пясок італійскага пляжа*
*І жвір беларускіх магілаў.*

*І вось —*
*лігурыйскае лета*
*Далёка і блізка да раю,*
*Дзе вецер з усмешкай эстэта,*
*Якога я ў мроях ствараю.*

*І вось —*
*аксамітныя хвалі*
*Ускідваюць ветразяў крылы,*
*Як быццам яшчэ не ляталі,*
*Не маючы сённяшняй сілы.*

*І ззяюць у вечным мажоры,*
*Такія найблізкія Богу,*
*Неўздалёк антычныя горы,*
*Ды свет перайначыць не могуць.*

*А неба бяздоннага цнота —*
*Куды ні паглянеш —*
*напроці...*
*І вечнасці лепшая нота, —*
*Якую спяваў Павароці.*

* * *

*Забываю на час і сурокі,*
*Бо ў душы зноў*
*убачу-пачую —*
*Так высока сягоння аблокі,*
*Як у тую пару залатую,*

*Што запомніць*
*гарэза-дзяўчынка*
*З непрыкметнага*
*ў свеце квартала,*
*Як сама,*
*анібы аблачынка,*
*Утрапёна над светам лятала.*

*І сягоння у снах менестрэлі*
*Ёй спяваюць*
*пра час той вясёлы,*
*Як ляталі пад неба арэлі,*
*Прыляталі з аблокаў анёлы.*

Фота Кастуся Дробава

# Абразкі з жыцця

Віктар КУНЦЭВІЧ

## Кандзейка

Прачытаў аповесці Сяргея Грахоўскага "Зона маўчання", "З воўчым білетам" і "Такія сінія снягі". Крый Божа, такое не павінна паўтарацца. Сумны аповед аўтара даў магчымасць не толькі зірнуць на жыццё вязняў сталінскіх лагераў, але і адчуць увесь жах бяспраўнага чалавека, нібыта ты знаходзішся побач з ім. Уразілі вершаваныя радкі Грахоўскага.

*Я так настыў*
*у маладосці,*
*Я навучыўся*
*так цярпець,*
*Што спадзяюся*
*свае косці*
*У крэматорыі сагрэць.*

Гэтакі жарт чалавека, які прайшоў праз холад і голад, страх, знявагі, здзек, пакутаваў ажно 19 гадоў. Уратавала яго "хрушчоўская адліга". У аповесцях Грахоўскага спаткаў слова "кандзей", што азначае "карцэр" (турма ў турме). Гэтае слова давялося чуць ад мясцовага п'янтоса Васіля, але ў гэтакім пяшчотным вымаўленні — кандзейка. Яго ўзяла ў сужыцелі кабета сярэдніх год, даволі зграбная і хітраватая. Яна мела сваю невялічкую хатку і вялікі агарод. Відаць, патрэбна была жанчыне рабочая сіла. А дзе яе возьмеш? От яна ў дашчаты бакавы пакой з асобным уваходам і засяліла Васіля. Калі ішла на працу, то пакоі, дзе жыла сама з дачкой, надзейна замыкала. І ўсё ж Васілю ўдавалася ў час яе адсутнасці сёе-тое выносіць з двара і прадаваць за выпіўку. Аднак жанчына сужыцеля не выганяла: пад пэўным наглядам і ў цвярозым стане Васіль працаваў умела і старанна.

Аднойчы, крочучы з гаража, напаткаў Васіля каля веснічак. Спытаўся, ці цёпла яму ў кандзейцы.

— Як палю дровы ў грубцы, дык нічога, — адказаў ён.

— А ці ведаеш ты, што азначае слова "кандзей"?

— Не, не ведаю. Выпіваў тут з чалавекам, які паўжыцця адседзеў у турмах, от ён мне і сказаў: жывеш ты, Васіль, як у кандзейцы. Мне спадабалася гэтае слоўца, і я з таго часу так і называю сваю будку.

Я патлумачыў Васілю сутнасць значэння ўпадабанага ім слова. Дзяцюк на маё здзіўленне радасна заўсміхаўся: "От і я ж казаў Тамары, што трымае яна мяне, як у сабачай будцы. Прыйдзе з працы, буду разбірацца..."

А мне падумалася: наша з Васілём пакаленне ці не самае шчаслівае. Мы пражылі паўвека і не спазналі ні вайны, ні галадаморaў, ні генацыду. Хочаш працаваць — не праблема. Працуеш добра — давалі кватэру. Іншая справа, што хтосьці самахоць існуе ў кандзейках.

Але тут, як кажуць, кожнаму сваё.

## Яшчэ раз пра варону і мужыка

Восеньскі сонечны дзень. За акном жоўта-чырвоная прыгажосць дрэў старога кладзішча. З захапленнем пазіраю на вершаліны высозных ліп, бяроз, клёнаў. Цішыню і спакой двара раптам парушае гвалт бойкі, якую распачалі два каты. Да іх баявых воклічаў далучылася ўстрывожанае карканне варон. Яны, пералятаючы з галінкі на галінку, з дрэва на дрэва, паступова набліжаліся да забіяк-катоў, а потым сталі падлятаць да іх і біць дзюбамі ў галовы і спіны. Каты пакінулі бойку і шмыганулі ў кустоўе. А вароны яшчэ некалькі хвілін узбуджана каркалі: відаць, абмяркоўвалі здарэнне.

У сувязі з гэтай падзеяй узгадаўся радок з верша вядомага класіка: "...дурны мужык, як варона". Падумалася: калі такія разумныя вароны, то што тады казаць пра мужыка? Па ўсім відаць, што класік неабгрунтавана пакрыўдзіў і мужыка, і варону.

## І сабака годнасць мае

У майго добрага знаёмца Андрэя Жураўлёва ёсць уласны дом на ўскраіне горада, побач — грады, кустоўе, кветкі, ёсць нават невялічкая сажалка. Сядзім з ім у альтанцы, разліваем па кілішках гарэлку. Побач круціцца малады дварняк Рэкс. На дварэ позняя восень. Халаднавата. Я распавядаю Андрэю гісторыю з дзяцінства, калі да майго бацькі прыязджаў у госці стрыечны брат-вайсковец. Не ведаю, з якой нагоды бацька прынёс у хату пеўня, і яны пачалі сілком ліць яму пакрысе ў дзюбу вогненны напой. А калі адпусцілі, то певень пачаў падлятаць да сваіх дабрадзеяў і дзяўбці іх. Я тады сядзеў на печы і смяяўся.

— А давай Рэксу дадзім выпіць, — прапанаваў падпіты Жураўлёў і падсунуў сабаку келіх пад нос. Рэкс грэбліва адвярнуўся. — Грэбуе, от сволач!

Жураўлёў падхапіў Рэкса на рукі, паднёс да сажалкі і шпурнуў у ваду. Рэкс хутка вынырнуў і пачаў борздзенька бегаць кругамі па агародзе. Пырскі з яго шэрсці ляцелі ў розныя бакі. Сабака такім чынам грэўся пасля халоднага купання. Андрэй падаў Рэксу кавалак сала, пачухаў за вухам. Сабака нязлосна гырчэў. Гаспадар ізноў узяў яго на рукі і ізноў шпурнуў у сажалку. Зноў пырскі, хуткі бег і чарговы гасцінец. Рэкс гасцінец прыняў, а калі Андрэй пачаў ізноў тузаць яго за вушы і загрывак, злосна хапануў гаспадара за руку зубамі. Жураўлёў хацеў злавіць сабаку, але той не даваўся.

— От табе і чатырохногі сябра. Зусім не разумее жартаў, — зрабіў выснову Андрэй Жураўлёў.

— Не, — адказаў я гаспадару, — у яго па ўсім відаць, ёсць адчуванне ўласнай годнасці.

Мы разлілі рэшткі гарэлкі, выпілі. Рэкс стаяў воддаль і, схіліўшы голаў, пільна пазіраў за намі. І ў яго вачах ужо не было злосных агеньчыкаў.

## Флікер

Так ужо здараецца, што я кожны дзень езджу на машыне, бо займаюся перавозкай пасажыраў як прыватны прадпрымальнік. А калі выпадаюць выхадныя, то трэба свой транспарт рамантаваць ці ездзіць па дзяржаўных установах кшталту падатковай, транспартнай інспекцый, аддзела сацыяльнай службы ды іншых. У дзесяці кіламетрах ад Магілёва, каля нядаўна прыдбанага доміка, я нарэшце ўзвёў лазню. Першае мыццё запланаваў на выхадны, якія б справы не патрабавалі тэрміновай увагі.

Ехаць вырашыў рэйсавым аўтобусам "Магілёў—Аэрапорт". Але ў прызначаны час аўтобус так і не з'явіўся. Як даведаўся пазней, з-за тэхнічнай няспраўнасці ён увогуле не пайшоў у рэйс. Дабраўся да сваіх Княжыц на спадарожнай машыне. Дровы ў лазні гарэлі весела, ажно іскры выляталі з трубы. А вось парылка была не вельмі гарачай. Відаць, недастаткова былі ўцепленыя столь і сцены. І ўсё ж я быў задаволены: неяк усё-ткі папарыўся, памыўся, выпіў піва.

Позняй восенню хутка вечарэе. Выйшаў на аўтобусны прыпынак у спадзяванні на аўтобус ці спадарожную машыну. Не шанцавала. Праз паўгадзіны сцямнела. І ўсё ж, калі набліжаліся машыны, я ўздымаў руку. Нарэшце затармазіла легкавушка. Я памкнуўся да яе і спыніўся, заўважыўшы, што ў яе фон нумарных знакаў чырвоны. Падумалася: ну, міліцыянтаў мне толькі і не хапала. З машыны выйшаў "даішнік" і запытаўся: "Чаму вы без флікера?" Я патлумачыў, што даўно чакаю аўтобуса, вось і сцямнела, і што не спадзяваўся, што буду вяртацца ў горад цёмным часам.

— Тады прысядзьце ў машыну, складзём адміністратыўны пратакол.

Я адмовіўся, сказаўшы, што, калі гэта вельмі патрэбна, састаўляйце яго тут, на прыпынку.

— Ну што ж, — раззлавана сказаў даішнік, — калі не сядзеце ў машыну, мы прыменім сілу і спецсродкі.

Давялося падпарадкавацца і я сеў на пярэдняе сядзенне аўто. Інспектар, які сядзеў за рулём, пачаў афармляць пратакол, пытаючы: "Імя, хатні адрас, месца і дата нараджэння?.. А цяпер напішыце тлумачэнне, чаму вы ішлі па дарозе ў цёмны час без флікера і распішыцеся вось тут і тут...

— Дык я ж нікуды не ішоў, а стаяў на прыпынку, а паколькі я быў на прыпынку, то я — не пешаход, а хутчэй — пасажыр, — спрабаваў я няўпэўнена пераконваць прадстаўніка ўлады і намагаўся прачытаць, што ж там у пратаколе напісана. Але так і не змог. Урэшце сказаў, што без акуляраў не магу разабраць, што напісана ў дакументе, а таму нічога ў ім пісаць і падпісваць не буду.

Даішнік паглядзеў на мяне доўгім, пільным позіркам і злосна прамовіў:

— Ты яшчэ тут паспрачайся са мной... дык мы завязём цябе на медыцынскую экспертызу, бо я чую пах спіртнога, адзначым, што перашкаджаў руху транспарту і непрыемнасці будзеш мець вельмі сур'ёзныя. На нарах калі-небудь адпачывалі?

— Не, — прамовіў я разгублена і, узважыўшы свае шанцы, згадзіўся падпісаць пратакол не чытаючы.

— Вы аштрафаваны на адну базавую велічыню і на працягу дзесяці дзён павінны аплаціць штраф, — зноў перайшоў на афіцыйны тон інспектар, — а ў іншым выпадку да вас прыйдуць судзебныя выканаўцы.

Даішнікі давезлі мяне да прыпынку, дзе спыняецца гарадскі транспарт. Але настрой быў ушчэнт сапсаваны. Было прыкра на душы з таго, што і сёння, у век развіцця дэмакратыі, звычайны чалавек безабаронны перад прадстаўнікамі ўлады. А калі ты яшчэ і выпіў піва, то заікацца пра свае грамадзянскія правы ўвогуле не выпадае. Са сваёй шматгадовай практыкі ўзаемаадносін з міліцыяй, а ў асноўным гэта былі супрацоўнікі ДАІ, я добра засвоіў асноўнае правіла: не пярэч. Калі пачынаеш гэта рабіць, то суразмоўца ў пагонах робіцца чамусьці вельмі злосным. І ў гэтай сваёй злосці можа пакараць па максімуму. Магліва, з такіх фактараў, як мой прыклад, і вырасла, узгадавалася наша славутая беларуская памяркоўнасць.

## Спецыяліст па свіннях

У брата Міхаіла дзень нараджэння — 55 год. У невялікай кавярні сабраліся сваякі і сябры. Гучаць віншавальныя тосты. Набліжаецца і мая чарга сказаць слова. Жонка таўханула мяне локцем у бок: "Ты ж кажы сур'ёзна і прыстойна, як усе людзі кажуць, а то я цябе ведаю — напляцеш абы-чаго..."

— Менавіта гэта я і збіраюся зрабіць, — адказваю ёй з усмешкай.

Узняўшыся з келіхам, я сказаў прыкладна наступнае: сёння шмат гаварылася пра юбілей майго брата, але ніхто не адзначыў, што ў яго не проста юбілей, а яшчэ і факт таго, што Міхаіл Іванавіч з заўтрашняга дня можа не хадзіць на працу, паколькі ў машыністаў чыгункі тэрмін выхаду на пенсію менавіта 55 гадоў. Таму, мяркую, патрэбна ўзгадаць пачатак яго працоўнай дзейнасці. А пачалася яна ў вёсцы Чырвоны Бор Бялыніцкага раёна, калі мы з братам пасвілі свіней.

Застолле выбухнула рогатам.

— Як свіней можна пасвіць? — здзіўлена запытаўся калега брата.

— А звычайна, — пачаў тлумачыць імяніннік, — усе ідуць купацца на рэчку, а мы мусілі бегаць па вуліцы за свінямі...

— Потым брат пайшоў на павышэнне, — працягваў я сваю прамову, — яму даверылі кароў, а я застаўся свінапасам. (Зноў агульны рогат). Дык вось, брат будзе хутка вольным чалавекам і я таксама хутка мушу развітацца са сваёй прадпрымальніцкай дзейнасцю. Таму прапаную брату разам пабудаваць свінарнік і заняцца з маленства знаёмай працай...

Пасля маёй прамовы строгіх і сур'ёзных тостаў больш не было. Вясёлыя жартачкі сыпаліся як гарох з дзіравага меха. Падумалася: як усё хутка мяняецца. Людзі маладзейшыя за нас з братам на які дзесятак гадоў ужо не ведаюць, што значыць пасвіць свіней. Як і таго, што ў тыя, не такія ўжо і далёкія шасцідзесятыя гады, кароў пасвілі ў лесе. А палеткі выкарыстоўвалі толькі пад сенакосы і пасевы. І таму, што каровы ўгнойвалі лясную глебу, у нашых лясах штогод расло шмат грыбоў.

— А я і не ведала, што ты такі вялікі спецыяліст па свіннях, — зазначыла напрыканцы вечарыны жонка.

## Скрыжаванне

Ад майго дома да цэнтральнай вуліцы горада, як кажуць, рукой падаць, калі крочыць праз прыватны сектар і пераходзіць рачулку Дубравенку. Вось і надоечы ішоў я знаёмай дарогай па вуліцы Вавілава і раптам заўважыў, што яна крыжуецца з вулкай, якая носіць імя Лысенкі. Я спыніўся на гэтым скрыжаванні і здзіўлена пераводзіў погляд з шыльдачак "Вавілава—Лысенка, Лысенка—Вавілава".

Сёння ўсім вядома пра трагічны лёс вучонага Вавілава, пра тое, як яго старана шальмаваў пseўдавучоны Лысенка. У мінулыя гады крыжаваліся іх ідэі, лёсы. Цяперашнім часам крыжуюцца вуліцы ў горадзе Магілёве. Што гэта? Напамін нашчадкам ці з'едлівая ўсмешка гістарычных абставін?

## Ад графамана да паэта

Шчыра кажучы, сумна чытаць палемічныя развагі наконт сотні лепшых паэтаў Беларусі, наконт таго, што сапраўдных паэтаў у нас дваццаць, а астатнія — рамеснікі і графаманы ды гэтак далей. Калі чытаеш падобнае, не можаш не задацца пытаннем: а хто ж я? Навошта пішу? Чаго вартая мая творчасць? Памятаецца, калі яшчэ вучыўся на журфаку, выкладчык беларускай мовы Мікола Рыгоравіч Каваленка (многія журналісты яго выдатна памятаюць) прапанаваў нам, студэнтам-завочнікам, прачытаць свае вершы. Маю іранічную лірыку ён ацаніў высока: "Нясіце ў "Вожык". Вось пабачыце — надрукуюць".

У рэдакцыі часопіса я патрапіў да Анэлі Тулупавай. Калі яна чытала мае вершы, маладая супрацоўніца ціха, але даволі чутна прамовіла: "Ходзяць тут графаманы... І адкуль яны толькі бяруцца?.."

Я здзіўлена паглядзеў на яе, потым азірнуўся і, вядома ж, нікога больш не ўбачыў. У рэшце рэшт дапяў, што гэта было сказана ў мой адрас. Я адчуў, што мой твар успыхнуў агнём.

— Як ты можаш! — усхапілася Тулупава. — Калі хочаш ведаць, ён прынёс добрыя вершы, а ты...

Далейшых слоў я ўжо не чуў, бо хуценька развярнуўся і рвануў на сябе дзверы ды літаральна вылецеў з кабінета.

Думаецца, што падобныя выпадкі і палемічныя "развагі", пра якія я распавёў вышэй, адбіваюць у творчага чалавека жаданне самаўдасканальвацца і ісці далей. Ісці ад графамана да рамесніка, ад рамесніка — да сапраўднага паэта...

## Арт-пацеркі

Ганаровай госцяй першай Мінскай міжнароднай выстаўкі графікі "Арт-лінія", што працавала ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі да 5 чэрвеня, была італьянская мастачка Карла Акардзі. Цікавасць наведнікаў выклікалі прадстаўленыя ёю каляровыя абстрактныя кампазіцыі "Чорна-чырвонае", "Аранжава-фіялетавае", "З кругам" (на здымку).

На сённяшні дзень няма больш грунтоўнага і поўнага выдання пра жыццё, творчасць, асяроддзе і час Міхала Клеафаса Агінскага, як новая кніга кандыдата мастацтвазнаўства Святлены Немагай. Манаграфія "Жыццё і творчасць М. К. Агінскага ў каардынатах яго часу і культурнага асяроддзя" — вялікая карпатлівая праца, якой маладая даследчыца займалася 15




гадоў, — выдадзена пад грыфам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, праблемнай навукова-даследчай лабараторыі музыкі ды кафедры беларускай музыкі БДАМ (навуковы рэдактар доктар мастацтвазнаўства прафесар Вольга Дадзіёмава). У бібліятэках і архівах розных краін аўтар выявіла багаты матэрыял, які асэнсавала і ўвасобіла ў сваёй унікальнай кнізе. На 520 старонках (тэкст дапоўнены ілюстрацыямі, нотамі) упершыню ажыццёўлены комплексны аналіз музычнай дзейнасці ды творчай спадчыны нашага выдатнага земляка ў кантэксце культуры яго часу і сацыяльнага асяроддзя. Святленай Немагай зроблена рэканструкцыя цэласнай карціны музычнай культуры вышэйшага саслоўя Беларусі канца XVIII — першай траціны XIX ст. У дадатковых раздзелах змешчаны тагачасныя дзённікі, мемуарныя старонкі, вытрымкі з даўняй перыёдыкі, а таксама літаратурная спадчына Агінскага (напрыклад, тэкст яго першага вакальнага паланеза, тэстамент) ды іншыя матэрыялы, сярод якіх — лібрэта оперы "Зэліс і Вальмур, або Банапарт у Каіры". Новае навуковае выданне адразу зрабілася рарытэтам, бо свет пабачыла толькі 100 асобнікаў. Зацікаўленыя чытачы чакаюць перавыдання кнігі, якая адрасуецца і тым, хто прафесійна звязаны з музыкай, і ўсім неабыякавым да гісторыі айчыннай культуры.

Супольны беларуска-расійскі тэатральны праект рыхтуецца да 150-годдзя з дня нараджэння Антона Чэхава. Гэта будзе пастаноўка спектакля "Вяселле" ("Свадьба") паводле аднайменнага твора класіка. Мяркуецца, што пастаноўчая група будзе расійская, на чале з маладым рэжысёрам Уладзімірам Панковым, а вось акцёры — беларускія, з Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Прэм'ера "Вяселля" мае адбыцца ў Маскве пры канцы сёлетняга года, падчас чэхаўскага тэатральнага фестывалю. Мінчанам жа давядзецца чакаць прэм'еру купалаўцаў да пачатку 2009-га.

**С. ВЕТКА**

*Фота аўтара*

# Пад райскім дрэвам тэатральнага мастацтва

**Ларыса Антосева — цудоўная актрыса: пластычна-пачуццёвая і вельмі прыгожая, узнёслая і ў той жа час рэалістычна-зямная, заглыбленая ўсімі каранямі ў жыццё беларускага народа, пяшчотная і моцная адначасова. Нядаўна жыхары горада Віцебска разам з Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатрам імя Якуба Коласа святкавалі яе юбілей.**

У свой дзень нараджэння Ларыса Антосева іграла галоўную гераіню "Жанчыны ў пясках" — спектакля, пастаўленага рэжысёрам Ігарам Баярынцавым паводле аднайменнага рамана японскага празаіка Коба Абэ.

Уваходзіць у гэты спектакль гледачу і цікава, і нялёгка, часам балюча, прымаючы "непаўторны сплаў філасофскай прыпавесці і страшнай магіі рэальнасці". І Коба Абэ ў рамане, і Баярынцаў у спектаклі ставяць адны і тыя ж пытанні: кім чалавек з'яўляецца для грамадства? як адбываецца яго адчужэнне ад грамадства? што грамадства дае кожнаму чалавеку і як яно адносіцца да простых людзей?

Колькі слоў наконт фабульна-сюжэтнай канвы. Адной жнівеньскай раніцай знікае чалавек. Школьны настаўнік-энтамолаг (артыст В. Салаўёў), які калекцыяніруе рэдкіх матылькоў, знікае сярод бясконцай чарады пясчаных узвышшаў і ўпадзін. Энтамолаг трапляе ў халупу-яму да жанчыны, якая вымушана кожны дзень адграбаць пясок. І застаецца пераначаваць не толькі таму, што стаміўся, але і таму, што ён — разумны, інтэлігентны чалавек, які ніколі не бачыў такога трагічна-роспачнага становішча жанчыны, — хоча зразумець яе жыццё. Але раніцай знікае лесвіца, і настаўніка Нікі Дзюмпэя жыхары вёскі вымушаюць адграбаць пясок. Герой супраціўляецца такім абставінам, бо лічыць: "Як толькі чалавек скараецца перад насіллем і прыстасоўваецца да яго, як толькі адмаўляецца ад сябе і ад сваёй сілы волі, — тут яму прыходзіць канец!"

Жыхары вёскі, каб зламаць цвёрдую волю Дзюмпэя, пазбаўляюць яго вады: пясок набіваецца ў адзенне і гартань — няма як дыхаць, — і герой зноў бярэцца за рыдлёўку... Але што ён урэшце зразумеў?

Убачыўшы спектакль, я была ўзрушаная і здзіўленая: на вуліцы XXI стагоддзе, а ў цывілізаваным грамадстве квітнее рабства. Галоўная гераіня не мае нават імя: нейкая бязмоўная і бязвольная рабыня!

*"Я іграла не рабыню, — кажа Ларыса Антосева. — Вы не задумаліся, чаму спектакль, у якім жанчына пераважна толькі слухае філасофскія разваг Дзюмпэя, называецца не "Мужчына ў пяску", а "Жанчына ў пясках"? Бо калі Дзюмпэй хоць нешта зразумеў у жыцці, калі ілюзіі сышлі ад яго, калі ён стаў па-сапраўднаму патрэбны людзям, дык толькі дзякуючы гэтай безыменнай жанчыне.*

*Я іграла не столькі японку, колькі сваю беларускую бабулю, яе суседак, сваіх цётак, усіх тых жанчын, якія любяць усялякую працу, і нават такую цяжкую. Я і сама, і ў літаральным сэнсе таксама, узялася б адграбаць пясок, калі б ён пагражаў майму дому, маёй сям'і, маёй Радзіме.*

*Мужчына — гэта прыгожая вяршаліна дрэва, а жанчына —моцны корань, які выратоўвае мужчыну ад нягод жыцця. Што такое пясок? Гэта не толькі разбуранья горныя пароды. Пясок — гэта і шматлікія людскія лёсы.*

*Я імкнулася раскрыць сутнасць гэтай жанчыны: не скарыцца, вытрываць нават у такіх цяжкіх умовах — прыгожая мэта!*

*А яшчэ мне падабаецца працавітасць маёй гераіні. Іграючы яе лёс, я падкрэсліваю, што праца — сэнс прыстойнага жыцця, але каб узысці на вяршыню, трэба шмат працаваць. Мая гераіня, у адрозненне ад Дзюмпэя, не проста адграбае пясок: яна выратоўвае свой дом , і тым самым — вёску! Таму гераіня мае не толькі прывабную знешнасць, але і ўнутраную прыгажосць.*

*На маю думку, чалавек заўсёды застаецца чалавекам, у кожных абставінах".*

Прадстаўнікі краіны Узыходзячага Сонца, якія бачылі гэты спектакль, казалі, што ён ім вельмі спадабаўся. А яшчэ яны знайшлі падабенства паміж беларускімі і японскімі жанчынамі: тая ж ветлівасць і тая ж працавітасць, тое ж пачуццё годнасці і тая ж сумленнасць, тыя ж гонар за чалавека і боль за яго.

Нашы знаўцы тэатра сцвярджалі, што гэтая роля па-асабліваму ўражвае, бо актрыса насамрэч сыграла беларускую жанчыну, абаяльную, пяшчотную, рамантычную і чуллівую, але дастаткова моцную, каб абараніць свой дом і сваё каханне.

*"Беларусы — цярплівы народ, — разважае Ларыса Антосева, — але, як сцвярджаў Уладзімір Караткевіч, "калі нас закрануць кіпцюрамі за сэрца", мы здольныя і на самаахвяраванне, і на барацьбу. Беларусы — надзвычай разумныя людзі: разумны чалавек — неабавязкова адукаваны чалавек, а той, хто добра ведае запаветы жыцця, хто мае немітуслівы досвед, памяркоўную хуткасць, хто ўмее добра ладзіць з людзьмі. Такім узорам і прыкладам для мяне з'яўляецца мая бабуля Вольга Рыгораўна Шэмет, крыніца мудрасці, тактоўнасці, гумару.*

*Калі бабуля і дзядуля пажаніліся, яны пабудавалі дом на старым хутары, дзе бярозы — самыя прыгожыя на ўсю Беларусь, салаўі —самыя апантанья, а крыніцы — самыя чыстыя. Як я там любіла бываць! Мае сёстры заўсёды дапамагалі бацькам па гаспадарцы, а я любіла чытаць вершы на памяць, спяваць і таньчыць.Дык мая бабулечка казала: "Не чапайце Ларысу. Яна ж чытае лепш, чым па радыё".*

*Я адчувала захапленне перад прыгажосцю прыроды, дзівілася на карункавыя цені чаромхі і бэзу. І рана зразумела, што буду артысткай. У дзяцінстве, бывала, залезу на высачэзную бярозу, разгайдаю яе вершаліну ды заспяваю на ўвесь лес... І жыла таемнаю марай пра тэатральны інстытут. Цяпер тэатр у маім жыцці адыгрывае вялікую ролю. Гэта мой лёс, маё шчасце, але ж і дом, дзе разбіваюцца сэрцы."*

Сыграць улюбёныя ролі для Ларысы — найвялікшае шчасце. На яе думку, лепш галадаць, чым іграць ролі, якія не падабаюцца. Артыстка прызнаецца: калі стаіш перад вялікай аўдыторыяй і яна цябе разумее — гэта і найвялікшая ўзнагарода жыцця, і найсмачнейшая асалода натхнення, і надзейны прыстанак самавыяўлення пад райскім дрэвам тэатральнага мастацтва, найпрыгажэйшага ў свеце.

**Наталля САЛАЎЁВА**

***г. Віцебск***

# «Вербніца» спявае — настрой узнімае!

**Народны ансамбль народнай песні "Вербніца", які ўжо больш як дваццаць гадоў існуе ў горадзе Чэрвені, ведае амаль кожны жыхар раёна. Выступленні калектыву заўсёды яскравыя і арыгінальныя. Слухачы ніколі не шкадуюць апладысментаў і шчырых слоў падзякі за падораны ўзнёслы настрой. Удзельнікі ансамбля — натхнёныя, творчыя людзі са звонкімі галасамі і шчырай душой. Кіруе "Вербніцай" Таццяна Правасуд. Таленавіты чалавек, добры арганізатар, яна заўсёды прыслухоўваецца да меркаванняў удзельнікаў ансамбля, крэатыўна мысліць, знаходзіць цікавы рэпертуар.**

**— Таццяна Вікенцьеўна, раскажыце крыху пра сябе. Напэўна, вы гадаваліся ў музычнай сям'і?**

— Так, з самага маленства вакол мяне панавала атмасфера творчасці, узнёслых адносін да музыкі. Маці добра валодала гітарай і фартэпіяна, а бацька вельмі любіў цымбалы. Яны і цяпер вялікія прыхільнікі музыкі! Я займалася ў Чэрвеньскай школе мастацтваў па класе баяна. Мяне вельмі захапіла музыка, і я вырашыла звязаць з ёй далейшае жыццё.

**— Як ствараўся ансамбль "Вербніца"?**

— Пасля заканчэння музычна-педагагічнага вучылішча я пайшла працаваць у дзіцячы садок. Там, акрамя музычных заняткаў з дзецьмі, арганізавала супрацоўніц у вакальную групу. А ў 1984 годзе мы разам з сяброўкамі-калегамі на аглядзе мастацкай самадзейнасці настаўнікаў школ і работнікаў дашкольных устаноў занялі прызавое месца. Наш калектыў заўважылі ў раёне, пачалі запрашаць на канцэрты. Сярод разнастайнага рэпертуару выключалася жартоўная рухавая песня "Чапурушачкі". Менавіта яна была адной з першых, якую мы праспявалі для сваіх слухачоў, і ад яе пайшла назва калектыву. Аднак паступова склад ансамбля мяняўся і пашыраўся. Прыходзілі новыя і новыя выканаўцы, улюбёныя ў народную песню. Урэшце мы і месца рэпетыцый змянілі — пачалі збірацца ў раённым Доме культуры, і назву — сталі называцца "Вербніцай".

**— Адкуль такая назва?**

— У 1996 годзе менавіта ў Вербную нядзелю адбылася значная падзея: наш ансамбль атрымаў званне "народны".

**— Мабыць, з таго часу яшчэ больш насычанай зрабілася яго канцэртная дзейнасць?**

—Так. Штомесяц калектыў пачаў ладзіць па 5-6 канцэртаў на шматлікіх пляцоўках раёна. Праграма складалася з некалькіх блокаў, у якіх чаргаваліся сольныя песні нашых удзельнікаў і харавыя нумары.

**— А ў чым, на ваш погляд, сакрэт поспеху ансамбля?**

— Думаю, у самаадданасці, любові да мастацтва, у творчым падыходзе да музычнай дзейнасці. Ёсць удзельнікі, якія ў калектыве амаль з першых яго дзён. Гэта — Надзея Чарніцкая, Людміла Пяхота, Ірына Коўтан. А Міхаіл Шчэрбач і Андрэй Каленік не толькі добра спяваюць, але і выдатна імправізуюць на розных народных інструментах: баяне, гармоніку, цымбалах. У калектыве заўсёды цёплыя, сяброўскія адносіны. Сёння ў ім каля 30 чалавек, і выканальніцкае майстэрства кожнага даўно выйшла за межы самадзейнасці. З такімі артыстамі можна рыхтаваць праграмы высокага ўзроўню.

**— І што можа "Вербніца" прапанаваць слухачам?**

— За 20 гадоў існавання ансамбля ў нашым рэпертуары з'явілася больш як 100 песень. Гэта беларускія, рускія, украінскія народныя песні, аўтарскія творы: Ігара Лучанка, Эдуарда Зарыцкага, Кіма Цесакова, Леаніда Захлеўнага. Рыхтуем цяпер новую праграму для чарговага пацвярджэння звання "народны". Плануем выступіць на фестывалі "Залатыя ключы". І мы заўсёды рады бачыць сярод нашых удзельнікаў новых творчых людзей.

**Гутарыла Алеся ГЕРАШЧАНКА**

# Варыяцыі на тэму «МіЛяДо»

**Імёны ці прозвішчы,** у якіх чуюцца ўсім вядомыя назвы нот, звяртаюць на сябе асаблівую ўвагу музыкантаў. Гэта ж вялікая спакуса — замяніўшы фанемы на музычныя гукі, ператварыць слова ў мелодыю: яе можна праспяваць, сыграць, а то і зрабіць лейтматывам новага твора! (Неаднойчы кампазітары — з даўніх часоў да нашых дзён — так і рабілі). А вось прозвішча знанага кампазітара савецкай эпохі Вано Мурадэлі нават сталася нагодай для дасціпнага жарту аднаго з вядомых яго калег: "Нейкі ты, Мурадэлі, неадэкватны музыцы. Замест "мі" ў цябе "му", замест "рэ" ў цябе "ра", замест "до" ў цябе — "дэ", замест "ля" — "лі"...

Наш таленавіты суайчыннік і сучаснік, піяніст, клавесініст, арганіст і педагог Аляксандр Мільто ў далёкім юнацтве таксама паспрабаваў, з уласцівым яму пачуццём гумару, "праверыць алгебру гармоніяй", перакласці ўласнае прозвішча на музычную мову. Трошку, як цяпер кажуць, крэатыву — і атрымалася "МіЛяДо". Мілагучны спеўны матыў многія ведаюць як аўтограф Аляксандра. Так — накрэсліваючы на паперы пяць лінеек са скрыпічным ключом ды тры ноткі — ён падпісвае сяброўскія запіскі, віншавалкі... Нотны стан з яго адмыслова зашыфраваным прозвішчам прымацаваны і ля веснічак сямейнай дачы Мільто.

**Паважныя постаці старых яблынь**, якія толькі раз на чатыры гады, затое спраўна і шчодра, асыпаюць сваіх гаспадароў ураджаем; кветкі ў нечаканым стракатым суседстве — экзоты з дзівоснымі назвамі ды вясёлыя тубыльцы традыцыйных беларускіх палісаднікаў. Зялёнымі кілімамі — мурожныя лапікі. Засень зусім блізкіх лясных дрэў. І такія кранальныя, па-інтэлігенцку сціплыя градкі...

Зрэшты, галоўная адметнасць гэтага ўтульнага кутка — яго музычны дух і шчырая гасціннасць. Штолета Аляксандр Мільто ладкуе тут унікальныя фестывалі, у якіх удзельнічае сам, яго сямейнікі, вучні, сябры, калегі — тытулаваныя майстры і маладыя лаўрэаты міжнародных конкурсаў. Сцены дачнага дома, дзе ёсць фартэпіяна і клавесін, поўняцца жывым гучаннем камернай інструментальнай і вакальнай класікі. Калі ж дазваляе надвор'е, фестывальны канцэрт адбываецца на адкрытым паветры, непадалёк ад арыгінальнага помніка Раялю, зробленага гаспадаром дачы з "сярэдзіны" інструмента, які ўжо не падлягаў рамонту . А потым публіка (суседзі-дачнікі ды госці з Мінска) не спяшаецца пакідаць падворак, і размовы працягваюцца ўжо на лаўцы ля вогнішча...

**"Санька МіЛяДо"** — гэта для блізкіх дружбакоў. Маладзейшыя калегі ды навучэнцы пачціва клічуць яго Аляксандрам Паўлавічам і захапляюцца яго няўрымсліваcцю, энергічнасцю, маладым духам і невычэрпнай творчай фантазіяй, цікаўнасцю і любоўю да жыцця, рознабаковай адоранасцю і эрудыцыяй. Цэняць яго дабрыню, лёгкі характар, таварыскасць і сціпласць — вартасці, можна сказаць, не надта распаўсюджаныя сярод "музычных індывідаў".

Ужо не адзін дзесятак гадоў удаецца яму захоплена і паспяхова спалучаць канцэртную дзейнасць з настаўніцкай.

Па-першае, вядзе клас камернага ансамбля і факультатыў па клавесіне ў Рэспубліканскім каледжы пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Па-другое, спрычыняецца да выхаваўчага працэсу дзіцячай студыі "У гасцях у Цюбіка", што пры Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Якім чынам? Наладжвае з юнымі музыкантамі канцэрт у музеі, а іх равеснікі, далучаныя да выяўленчай творчасці, малююць свае ўражанні ад пачутага, ствараюць адмысловы вобраз музычнага твора. Урокі, якія прыдумаў А. Мільто, праходзяць пад назвай "Малюем музыку" ўжо каля 20 гадоў.

Па-трэцяе, становіцца прапагандыстам лепшых традыцый і набыткаў беларускага музычнага выканальніцтва — як ініцыятар і аўтар цыкла радыёперадач "Настаўнікі і вучні".

**Гады ўласнага вучнёўства** Аляксандр Паўлавіч успамінае ахвотна, калі гаворка ідзе пра педагогаў старой школы — выдатных музыкантаў, што выкладалі ў каледжы пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (на той час кансерваторыі). Пра сябе ж не расказвае. Таму мала хто ведае, напрыклад, што яго зусім дарослая працоўная дзейнасць пачалася, калі Аляксандру было... шаснаццаць. Тады ён уладкаваўся на працу ў зборную БССР па мастацкай гімнастыцы ў спартыўным таварыстве "Працоўныя рэзервы" і акампанаваў юным грацыям у вольных практыкаваннях. Прычым, у каледжы пры акадэміі музыкі, дзе ён вучыўся, ніхто пра тое і не здагадваўся. Як цяпер, мабыць, ніхто і не здагадваецца, што імпазантны сівагаловы артыст за клавесінам ці арганам быў калісьці зоркай фартэпіяннага выканальніцтва. Зорная слава многія гады суправаджала (і заслужана!) незабыўную жонку А. Мільто — выдатную піяністку Веру Лагвіненку... Аднак у далёкім 1964-м Аляксандр Мільто стаў пераможцам Рэспубліканскага конкурсу піяністаў. Першую прэмію прынесла яму высокае майстэрства і — непаўторны выразны гук, глыбокі, пявучы. У той час і публіка "хадзіла на Мільто" паслухаць гэты рэдкасны фартэпіянны гук, які рабіў па-мастацку своеадметнай інтэрпрэтацыю "Думкі" П. Чайкоўскага ці эцюды Ф. Шапэна...

**Сёлета** ў сталічнай філармоніі, дзякуючы некамерцыйнаму прадзюсерскаму цэнтру "Класіка" пры Беларускім саюзе музычных дзеячаў, адбыўся вечар, прысвечаны 50-годдзю творчай дзейнасці Аляксандра Мільто і прымеркаваны да 40-годдзя Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі, у якім два дзесяцігоддзі адпрацаваў гэты музыкант. Разнастайная праграма, шчырая атмасфера, натхнёнае выкананне... І столькі прыемных сюрпрызаў! Маэстра МіЛяДо раскрыўся як тонкі кампазітар: у выкананні Ансамбля вакалістаў Рэспубліканскага каледжа пры БДАМ (мастацкі кіраўнік Уладзімір Глушакоў) трапятліва прагучала яго "Адажыо памяці спачылых музыкантаў". Гожа выступілі яго выхаванцы па класе камернага ансамбля флейтыстка Марыя Мілюціна ды піяністка Алена Камека, юная клавесіністка Алена Вінель. Атрымаўся выдатны дуэт героя вечарыны ды яго колішняй вучаніцы па клавесіне, а цяпер маладой опернай зоркі Таццяны Гаўрылавай. У той дзень яна была імянінніца, і Аляксандр Паўлавіч пад авацыю залы, перадаў Таццяне ад сваёй 90-гадовай маці — Валянціны Мікалаеўны Мільто, былой артысткі опернага хору, падарунак-талісман: нітку бліскучых караляў.

Канцэртныя нумары перамяжаліся размовамі, віншаваннямі. Публіка была расчуленая: Аляксандр Паўлавіч распавёў адну са сваіх шматлікіх прыпавесцей-казак, напісанне якіх — сярод яго шматлікіх захапленняў, а ўдзельнікі студыі "У гасцях у Цюбіка" прэзентавалі музыканту свае работы, намаляваныя пад уражаннем ад чарговага канцэрта ў музеі.

**Эмацыйная кульмінацыя** юбілейнага вечара прыпала на другую частку праграмы. Прагучаў фартэпіянны канцэрт, створаны юным В. А. Моцартам: партыя саліста дзеля юбіляра была перадаручана клавесіну. Затым "Восень" з цыкла канцэртаў А. Вівальдзі "Паравіны года" (А. Мільто выконваў партыю клавесіна, партыю скрыпкі — А. Подаў, Дзяржаўным камерным аркестрам кіраваў яго галоўны дырыжор П. Вандзілоўскі). І апафеозам — выбітны Канцэрт Г.Ф. Гендэля Мі-бемоль мажор для клавесіна з аркестрам.

Параўнаць глухаватае, сухое гучанне клавесіна са спеўным голасам, пагадзіцеся, цяжка. І ўсё ж, здаецца, чулася глыбокая, пранікнёная акапэльная кантылена ў тыя імгненні, калі "трымаў паўзу" аркестр і саліраваў маэстра МіЛяДо...

**Святлана БЕРАСЦЕНЬ**
*Фота аўтара*

# Вакол стала, або Застольныя прыколы

**На стале, ля стала, за сталом і вакол яго... Чаго толькі не папрыдумлялі маладыя мастакі — удзельнікі арт-праекта "Пэндзаль & Table", каб падтрымаць яго ідэю! Іх творчыя фантазіі паядналіся ў памкненні ўзвысіць да ўзроўню арт-аб'екта такі звычайны, будзённы прадмет, як... стол.**

З якой нагоды — стол? Дзяніс Барсукоў, дырэктар папулярнай сталічнай галерэі "Універсітэт культуры", дзе да 8 чэрвеня разгарнулася выстаўка "Пэндзаль & Table", тлумачыць, што ў еўрапейскай культурнай традыцыі стол з'яўляецца важным аб'ектам, без якога нельга ўявіць ні вяселле, ні працу над мастацкім творам, ні працэс навучання, ні хірургічную аперацыю і г.д. Таму і ўзяліся ўдзельнікі новага праекта за рэабілітацыю стала як аб'екта мастацтва.

У экспазіцыі прадстаўлены жывапіс і габелен, графіка і арт-аб'екты, фота і скульптура. Выява стала неабавязкова прысутнічае "ў кадры": асацыятыўна пра героя выстаўкі нагадваюць самі сюжэты і сітуацыі, якія апынуліся ў полі зроку мінскіх і віцебскіх творцаў. І жывапісны профіль марской істоты — "Каралавая рыбка-анёл" Васіля Зянько, і "чырвоная ікра" сачавіцы на бронзавай ласосевай галаве — "З рогу ўсяго многа" Данілы Цітовіча, і сляды класічнага застолля на газетных абрусах — "Тры сябры" Васіля Пешкуна, і досыць абстрактны сакавіты фотадыптых Алены Акімавай, і "Кактэйль" з пачуцця меры, густу ды гумару — Ганны Сілівончык, і дачны сняданак ды пікнік Дзяніса Барсукова, і насталыгічная "Мелодыя "Рэтра" Уладзіміра Царыковіча — з кавай пад грамафон... Хіба ўсё гэта не выклікае ва ўяўленні такую рахманную, свойскую, неад'емную ад нашых святаў ды руцінных будняў, істоту — стол! Між іншым, падумаеш: а які ж ён мяркуецца ў кампанію да "каралеўскага" крэсла, якое здаля вабіць загадкавым сваім срэбным мігценнем, што насамрэч, аказваецца, выходзіць ад "прыкольнай" абіўкі трона — звычайных канцылярскіх кнопак!

Падзівіцца на "Пэндзаль & Table" можна да 8 чэрвеня. А час вельмі хутка пакажа, ці дасягнуў новы, унікальны для Мінска праект вызначанай мэты: стварыць прэцэдэнт, узбудзіць наша досыць спакойнае і роўнае мастацкае жыццё.

**С. Б.**
*Фота аўтара*

## Музыкаю поўняцца Паставы

З 6 па 8 чэрвеня тут праводзіцца XI Міжнародны фестываль народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік". Свята парадуе яскравымі і арыгінальнымі імпрэзамі, плануецца шэраг цікавых падзей. Так, сёння на цэнтральнай плошчы Паставаў пасля заўсёднага ўрачыстага параду ўдзельнікаў фэсту і яго ўрачыстага адкрыцця пройдзе цырымонія віншавання народнага артыста Беларусі, нязменнага старшыні журы фестывалю Міхася Казінца з 70-годдзем. У суботу ўдзельнікі і госці наведаюць памятныя мясціны Пастаўшчыны. Музыкі, кампазітары ды выканаўцы спрычыняцца да заняткаў навукова-творчай лабараторыі. Адбудзецца і конкурс выканаўцаў-аматараў "Хто каго?". Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя пройдзе пад рубрыкай "Спадчына роду Тызенгаўзаў". На працягу дня ў мястэчку прагучыць некалькі разнажанравых канцэртных праграм. І да позняга вечара тут будзе працаваць выстаўка-кірмаш народных майстроў Віцебшчыны, да таго ж, лепшыя мясцовыя кулінары пачастуюць усіх ахвочых стравамі нацыянальнай кухні. Падвядзенне вынікаў конкурсу і заключны гала-канцэрт адбудуцца ў нядзелю.

**Я. КАРЛІМА**

# Жыццё — без тыдня 45 гадоў

**У лютым адзначаліся юбілеі двух класікаў айчыннай літаратуры: 200-годдзе Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і 115-годдзе Максіма Гарэцкага. Наша размова з даследчыкам жыцця братоў Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх — Радзімам Гарэцкім.**

**— Сёлета адзначаецца 200-годдзе Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Прычым адзначаецца на працягу ўсяго года. Якія мерапрыемствы па святкаванні 115-годдзя Максіма Гарэцкага запланаваны на гэты год?**

— 115-годдзе Максіма Гарэцкага — гэта, так бы мовіць, станоўчая дата. Але спаўняецца і другая дата, на жаль, сумная — 70 гадоў як яго расстралялі. І паміж гэтымі дзвюма датамі ўсяго толькі 8 дзён. Нарадзіўся Максім Іванавіч 18 лютага 1893 года, а расстралялі яго 10 лютага 1938. Яго жыццё было вельмі кароткім — без тыдня 45 гадоў. Быў у росквіце жыцця. Што мяркуецца ў гэтым годзе? Тое, што залежала ад мяне, ужо зроблена. У лютым адбыліся XVI "Гарэцкія чытанні". Напрыканцы 2007 года ў першай Віленскай беларускай гімназіі, на ўваходзе, адкрылі дошку памяці Максіма Гарэцкага. Не магу не ўспомніць з удзячнасцю майго сябра, які ў Вільні займаўся ўсімі арганізацыйнымі пытаннямі. Гэта Хведар Нюнька, старшыня Таварыства беларускай культуры ў Літве.

Да завяршэння года мы выдадзім новы зборнік з матэрыяламі XVI "Гарэцкіх чытанняў". І цяпер знаходзіцца ў друку мая кніга "Браты Гарэцкія". Меркавалася выдаць яе непасрэдна да 115-годдзя пісьменніка, але не паспелі. Таксама напісаў кнігу пра творчасць Максіма Гарэцкага літаратуразнаўца, член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась Мушынскі. Не ведаю толькі, ці паспее яго кніжка выйсці ў гэтым годзе. А што яшчэ будзе — я не ведаю. Да мяне з прапановамі ніхто не звяртаўся.

**— У кнізе "Ахвярую сваім "я"..." вы апублікавалі новую і сапраўдную дату смерці Максіма Гарэцкага. Што новага ўдалося з таго часу даведацца пра лёс пісьменніка?**

— Звесткі пра ягоную смерць я ўпершыню надрукаваў пад назвай "Расстрэл Максіма Гарэцкага" акурат у "ЛіМе". А дагэтуль яго жонка атрымала афіцыйнае паведамленне, што пісьменнік загінуў ад кровазліцця ў мозг у пасёлку Важаэль (Комі АССР) 20 сакавіка 1939 года. Гэта была лухта. Аказалася, што ён быў расстраляны ў іншым месцы. Нават да гэтага часу ў розных выданнях дапускаюць памылку. Максіма забралі 4 лістапада 1937, а ўжо ў лютым 1938 расстралялі. Гэта было ў Вязьме. Пасля той маёй публікацыі высветлілася шмат новых дэталей яго жыцця. У Смаленску цяпер жыве даследчык Мікалай Мікалаевіч Ількевіч, які займаецца рэпрэсаванымі беларусамі, у прыватнасці, пісьменнікамі. Ён знайшоў новыя звесткі пра арышт Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх, надрукаваў іх у сваіх кніжках. Якраз Ількевіч і знайшоў спіс людзей, якіх расстралялі разам з Максімам Іванавічам. Гэта жыхары сельскай мясцовасці (галоўным чынам калгаснікі, настаўнік, вартаўнік, загадчык магазіна, рахункавод і інш.) узростам ад 20 да 70 гадоў. Самым адукаваным, відаць, быў Максім Іванавіч. Адшукаўся і пратакол. Калі яго перачытваеш, то жудасна робіцца. Там наступнае: "Мы... (тры прозвішчы. — **Р. Г.**) привели в исполнение решение Заседания Тройки УНКВД Смоленской области от 5 января 1938 года... в отношении осуждённых к расстрелу (далей 40 прозвішчаў. — **Р. Г.**)... из мест содержания под стражей были взяты в 14 часов 45 минут 10 февраля 1938 года, а решение... приведено в исполнение путём расстрела в 15 часов того же 10 февраля. Трупы зарыты на установленную глубину". За 15 хвілін расстралялі 40 чалавек і закапалі на адпаведную глыбіню! Максім значыўся пад нумарам 30. На тым месцы ў Вязьме — вялікі роў з пясочкам, як "жоўты пясочак" у Быкава. Там паставілі над абрывам помнік-стэлу. На стэле надпіс: "Предположительно на этом месте, где похоронены сотни известных и неизвестных людей, жертв репрессий, находится прах известного белорусского писателя, учёного и педагога Максима Ивановича Горецкого". Але мы ж дакладна і дасюль гэтага не ведаем.

**— Вы рабілі запыт у ФСБ пра канкрэтнае месца пахавання Максіма Гарэцкага...**

— Так. У афіцыйным адказе — "свидетельстве о смерти" —напісана: "причина смерти — (неизвестно) расстрелян, место захоронения — (неизвестно) Россия". Але з тых дакументаў, якія я праглядаў, вынікае, што гэта месца ў Вязьме, побач з помнікам. Там размяшчаецца турма, у якой сядзеў пісьменнік. Але прыйсці і ўскласці кветкі канкрэтна на магілу Максіма Гарэцкага і сёння нельга.

А ў Сандармоху — Карэліцкіх Курапатах мог быць расстраляны мой тата Гаўрыла Гарэцкі, які знаходзіўся ў высылцы ў Карэліі. Так атрымалася, што ў 1938 годзе мой бацька трапіў у вялікую групу зняволеных, якіх прысудзілі да расстрэлу. І калі дэпэўшнікі глядзелі бацькаву справу, то ўбачылі, што ён праходзіў па трох пунктах 58-га артыкула, сярод якіх — нібыта і за шпіянаж. І дэпэўшнікі тыя палічылі, што Гаўрыла Гарэцкі завербаваў у контррэвалюцыйную арганізацыю Чарвякова і Галадзеда. І вырашылі накіраваць яго ў Маскву — разлічвалі за знаходку такога "ворага народа" атрымаць медалі. У Маскве бацька трапіў да следчага

Фінкельштэйна. А той паглядзеў, што абвінавачванне — глупства. Галадзед загінуў у 1937-м, Чарвякоў — таксама. А бацька мой быў арыштаваны яшчэ ў 1930-м. І Фінкельштэйн накіраваў Гаўрылу Іванавіча назад з прапановай вызваліць. А пакуль бацька ездзіў у Маскву, у Сандармоху ўсіх з яго групы расстралялі. Цяпер там размяшчаецца вялікі мемарыял. За 14 месяцаў 1937—1938 гг. там было расстраляна звыш 9000 чалавек.

**— Ці часта ваш тата ўзгадваў пра тыя часы, калі знаходзіўся ў высылцы?**

— Мусіць ты і не зразумееш нават... У тыя часы пра гэта гаварыць нельга было. Як тады казалі, пра такое — толькі шэптам на вуха жонцы пад коўдрай у асобным пакоі. І тое небяспечна. Таму бацька ніколі пра гэта не гаварыў. Не толькі з-за небяспекі. Яму было вельмі цяжка ўсё ўспамінаць. Толькі калі бацьку было ўжо 80 гадоў, я яго ўсё прасіў напісаць успаміны. Ён жа шмат каго ведаў з нашых выдатных вучоных, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў. Ён пагаджаўся, але кожны раз адкладалася. Я яму кажу: "У 90 год я цябе проста прымушу". — "Добра, у 90 сяду і ўжо не буду працаваць". Ён да апошняга працаваў. У 85 ён яшчэ выступаў на вучоным савеце, рабіў даклады. У 87 я заўважыў, што яго здароўе пагоршылася. Тады я сёе-тое з яго ўспамінаў запісаў, але зусім мала. А ў 88 гадоў ён раптоўна памёр.

**— Цяпер вы бываеце на радзіме братоў Гарэцкіх у Малой Багацькаўцы?**

— Бываю, але рэдка. Ужо, відаць, гады тры не быў. Там сёння размяшчаецца сядзіба-музей Максіма Гарэцкага, дзе цяпер супрацоўнікамі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры рыхтуецца новая экспазіцыя.

**— Стварэнне сядзібы-музея мае цікавую гісторыю?..**

— Музей-сядзіба, дакладней філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, ствараўся да 100-годдзя Максіма Гарэцкага. І ініцыятарам гэтага быў сакратар ЦК КПБ Аляксандр Кузьмін. Недзе ў 1985 годзе да мяне на адным з агульных сходаў Акадэміі навук Беларусі падышоў Кузьмін і кажа: "Я вельмі шаную Максіма Гарэцкага і вас з бацькам, двух акадэмікаў. Я лічу, што трэба стварыць сядзібу-музей братоў Гарэцкіх". Так атрымалася, што калі ўпершыню ўлетку 1961 года наведваў Малую Багацькаўку, сфатаграфаваў дом бацькоў Гарэцкіх. А ў хуткім часе ён згарэў. Але Кузьмін усё роўна кажа: "Трэба зрабіць". На той час, каб стварыць музей, трэба было дазвол прасіць у Маскве. Гэта магло зацягнуцца на шмат гадоў. А Аляксандр Трыфанавіч тады з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР па Мсціслаўскай выбарчай акрузе, якой належала Багацькаўка. І ён, як дэпутат, даў загад на будаўніцтва. А мой бацька лічыў, што музей павінен быць толькі Максіма, а не братоў Гарэцкіх. Ён намаляваў і распісаў, што дзе размяшчалася. І хату атрымалася аднавіць. На жаль, музей адчынілі толькі ў 1993 годзе, а мой бацька памёр у 1988. Вось тады, на 100-годдзе Максіма, і адбылося канчатковае вяртанне ў Беларусь яго імя і твораў.

**— У сям'і Максіма і Гаўрылы было яшчэ двое братоў і сястра, якая загінула ў 1922 годзе. А як склаўся лёс братоў?**

— Гэта Іван і Парфір. Яны ўсе былі здольнымі. Але трэба было гаспадарыць. Іван, самы старэйшы, быў на гаспадарцы. І адукацыя яго — толькі 4 класы. Іван з сям'ёй пераехаў у Пецярбург, дзе памёр у 1939 годзе. Другім быў Максім. Ён пайшоў вучыцца. Наступны — Парфір. Зноў-такі, трэба было гаспадарыць. Але Парфір скончыў рабфак у Мінску, потым кааператарскія курсы. Працаваў кааператарам, бухгалтарам. Ён жыў амаль увесь час у Магілёве, дзе і памёр у 1980 годзе. Апошні сын — Гаўрыла, які змог атрымаць вышэйшую адукацыю.

**— А хто-небудзь у Багацькаўцы жыве сёння?**

— Там да апошняга часу жыла Клаўдзія, дачка Івана. Яна і апекавалася музеем Максіма Гарэцкага. У Клаўдзіі Іванаўны быў сын Леанід. У Леаніда была жонка Лідзія. Памёр Леанід, затым памерла Клаўдзія Іванаўна. І цяпер у Багацькаўцы жыве Лідзія Шнарская. А больш, на жаль, нікога няма.

**— Сёлета прайшлі XVI "Гарэцкія чытанні". Пасля кожных чытанняў выдаецца зборнік з матэрыяламі. Ці не наспеў час выдання своеасаблівай энцыклапедыі жыцця і дзейнасці братоў Гарэцкіх?**

— Час наспеў. І задумкі такія ёсць у нашых літаратуразнаўцаў з колішняга Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы. Але калі гэта будзе зроблена — невядома. У сучасным Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Рэспублікі Беларусь захаваўся аддзел выдання поўных збораў твораў. І там раней абмяркоўвалася канцэпцыя падрыхтоўкі поўнага збору твораў Максіма Гарэцкага, выданне нават стаяла ў планах. Але цяпер там заняты выхадам поўных збораў твораў Якуба Коласа, Івана Шамякіна, Максіма Танка і інш...

**Гутарыў Сяргей МАКАРЭВІЧ**

# Шчодрая палітра Варанішчы

На адным з берагоў блакітнай стужкі ціхай Вілії шырока раскінуўся горад Смаргонь. Тут нарадзіўся, вучыўся ў гарадской сярэдняй школе № 2 Валянцін Фадзеевіч Варанішча, будучы мастак, які і зараз жыве і працуе ў горадзе свайго дзяцінства.

У 1974 годзе Валянцін Варанішча паспяхова скончыў поўны курс навучання на аддзяленні жывапісу і графікі народнага універсітэта мастацтваў у Маскве. А неўзабаве з'явіліся і глыбокія па змесце карціны.

Яго пранікнёныя, дасканалыя ў тэхнічным плане работы, знаходзяць разуменне ў самых шырокіх колах аматараў мастацтва.

Зараз Валянціну Варанішчу 56 гадоў, творчы стаж, зразумела, невялікі, але мастак ужо стварыў каля дзвюх тысяч карцін, многія з якіх знаходзяцца ў прыватных калекцыях і музеях Расіі, Балгарыі, Германіі, Польшчы, Ізраіля, Канады... А таму радуе той факт, што правядзенне персанальных выставак у той жа Смаргоні становіцца ўжо добрай традыцыяй. Дарэчы, у смаргонскай выставачнай зале крыху раней экспанаваліся карціны мастака Ліліі Трохалевай, а вось нядаўна — Валянціна Варанішчы.

Высокі, чарнявы, з адкрытым поглядам. У яго постаці бачыцца нешта ці не ад рускага мастака XIX стагоддзя Крамскога Івана Мікалаевіча. А ў творах мастак — тонкі філосаф. Калі глядзіш на ягоныя карціны, нараджаецца мноства асацыяцый і думак аб прыгожым і жорсткім, аб любові да Радзімы і павазе да яе гісторыі. "Адкуль бяруцца гэткія людзі? — думаў я, уважліва разглядаючы карціны мастака. — Дзе і як выспявалі незалежнасць і незласлівасць, годнасць, якую нельга нічым знішчыць?"

Тэма гістарычнага мінулага беларускага народа, можна з упэўненасцю сказаць, стала цэнтральнай у творчасці мастака. Пра гэта яскрава сведчаць карціны, дзе апавядаецца аб жыцці паэта-дэмакрата Ф. Багушэвіча, кампазітара з вёскі Залессе Смаргонскага раёна М. Агінскага. Гісторыі прысвечаны і творы Валянціна Варанішчы "Дзень Перамогі", "Развітанне з Радзімай", "Цені далёкага мінулага". У прыватнасці, у апошняй з названых карцін апавядаецца пра трагічны момант у жыцці князя гарадзенскага, вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Вітаўта і князя Крэвейкі, які быў закатаваны ў княжацкай вежы Крэўскага замка. "Напярэдадні" — эпізод з жыцця рэвалюцыянера К. Каліноўскага.

У гэтых манументальных палотнах Валянцін Варанішча падкрэслівае значнасць тагачасных падзей. А цёмныя фарбы, свінцовае неба адлюстроўваюць трагічнасць жыцця.

Аб мінулым апавядаецца і ў карціне "Стары звон". Некалі адзін з памешчыкаў ахвяраваў звон касцёлу вёскі Данюшава. Фашысты ў час Вялікай Айчыннай вайны вывезлі яго ў Германію. Пасля звон адшукалі на чужыне і вярнулі на ранейшае месца. Але ў шасцідзесятых гадах мінулага стагоддзя ён зноў быў скінуты.

Мастак здолеў трапна адлюстраваць гэтую гісторыю тональнасцю фарбаў. Пад звонам, як чорная сіла, пахаджвае груганнё, якому, відаць, знішчыць каштоўнасць — раз плюнуць...

Блізкія сэрцу Валянціна Фадзеевіча і пейзажы. Хоць асноўнаю тэмай творчасці ён лічыць гістарычную, аднак у часы, калі ідзе назапашванне матэрыялу для будучых палотнаў, мастак акунаецца ва ўлонне пейзажу. Наша цудоўная беларуская прырода прадстаўлена ў карцінах не яркай, не кідкай, а строгай, сціплай. Ад таго яна нам да болю родная, блізкая. "Перад навальніцай", "Летні дзень", "Зіма ў Залессі", "Купальская ноч", "На скрыжаванні", "Дарога на Святляні", "Алея Агінскага ў Залессі"... Здаецца, гэтыя палотны ўвабралі ў сябе ўсе фарбы беларускага краю.

У творчасці мастака прысутнічалі раней нігілізм і форматорчасць, але была і сур'ёзнасць, велічнасць пошуку, якія яскрава ўвасобіліся ў карцінах. Ён зноў і зноў у вобразах вяртаўся да асобы роднага бацькі, які ваяваў і загінуў у Іспаніі ("Дзень Перамогі"), да шматпаткутнай гісторыі роднага краю, народнага эпасу ("Мядзведжая акадэмія", "Купальская ноч").

Прыгожы куток на Смаргоншчыне — Кушляны. Не адзін раз наведваўся сюды з эцюднікам і Валянцін Варанішча, хадзіў па пясчаных сцяжынках, сярод векавых дрэў, у засені якіх любіў бавіць час і Францішак Багушэвіч. Менавіта тады і нарадзіліся карціны "Багушэвіч у Кушлянах", "Летні дзень", "Восень у Кушлянах".

Мастака можна назваць сапраўдным песняром восеньскай пары. Яна прысутнічае і ў эпічных, і ў камерных пейзажах. Пра гэта, уласна кажучы, сцвярджае і карціна "Асуджанасць", дзе яскрава адлюстравана пазіцыя аўтара ў адносінах да прыроды.

...Некалі ў падвале аднаго з адміністратыўных будынкаў у цэнтры Смаргоні было памяшканне і для мастака Валянціна Варанішчы. Цяпер там кватаруюць іншыя, далёкія ад мастацтва асобы. А ён, чалавек прынцыповы і бескампрамісны, па-ранейшаму змагаецца за тое, каб не было ў нашым мастацтве драбнатэмнасці і голага тэхніцызму, каб было яно сур'ёзным і па-грамадску значным. Гэтаму ён і вучыць сваіх выхаванцаў. Некаторыя з іх, як Ала Арабей, Ларыса Вянярская, пасля заканчэння вучобы ў Віцебску і ў г. п. Мір сталі выдатнымі мастакамі, як, уласна кажучы, і яго сыны — Аляксандр і Алег.

Пішу гэтыя радкі і ў думках уяўляю сабе Валянціна Варанішчу за эцюднікам. Ён зноў, пэўна, сярод прыроды, на Вілії, ці вандруе, каб паслухаць прытоенае дыханне сасновага бору, дыханне гісторыі.

**Валянцін БАРЫСЕВІЧ**

# Шлюб па разліку — на розум і надзейнасць

**Здаецца, вольная гутарка, напоўненая вулканічнымі ўсплескамі і жывой іранічнасцю, шмат губляе, ператварыўшыся ў строгія тэкставыя масівы. Ніна Здановіч — культуролаг, выкладчыца педуніверсітэта, смяшлівая, звонкая жанчына, у голасе якой часам чуецца жартоўная дзіцячая непаслухмянасць, а часам мяккая, тактоўная ўпэўненасць. Наогул пара Пятра Васючэнкі і Ніны Здановіч не стварае ўражання рэкламнай ідэальнасці, дзе ў кадры паказальна шчаслівая белазубая сям'я. Хутчэй ёсць у іх кранальная мультыплікацыйнасць, сучаснасць, натуральная "персанажнасць" нейкай добрай лялечнай казкі для дарослых дзяцей.**

**— У вас бываюць такія сур'ёзныя мастацтвазнаўчыя спрэчкі ці, можа, нават сямейныя сваркі на глебе літаратуры, гісторыі?**

— У Пятра літаратурны погляд на гісторыю, а ў мяне такі прадметна-вобразны. Але канцэптуальных разыходжанняў ва ўспрыманні мастацтва, літаратуры ў нас няма. Разам ходзім на выставы, імпрэзы, у тэатр. Я вельмі люблю бываць на яго выступленнях — кожны раз нейкую грань яго асобы адкрываю наноў. Кухня — гэта наш хатні дыскусійны клуб. Мы любім за кубкам кавы альбо за вячэрай дзяліцца ўражаннямі. Але часцей ідзе палеміка паміж намі, на адным баку, і дачкой — на другім.

**— Канфлікт пакаленняў?**

— Гэта хутчэй абмен думкамі, меркаваннямі, чым канфлікт. Наша дачка Марыля — вельмі рознабаковы, глыбокі чалавек. Ім з Пятром заўсёды было цікава ўдваіх, яны як паўнапраўныя члены нейкага творчага калектыву. У свае 21 Марыля паспела паспрабаваць ужо сябе ў літаратуры — вершы друкаваліся ў "Маладосці". Выходзілі таксама яе пераклады з англійскай мовы. Цяпер яна заканчвае Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт, хутчэй за ўсё па размеркаванні пойдзе працаваць настаўніцай у школу. Вельмі крэатыўнае дзіцё — вяжа, вышывае, акрамя таго, трэці год займаецца велападарожжамі па Беларусі.

**— Пятро Васільевіч, як кажуць, лёгкі на пад'ём, любіць далёкія паездкі?**

— Мы з задавальненнем кідаемся ў розныя падарожжы. Гадоў шэсць таму набылі аўтамабіль менавіта каб вандраваць. У першы ж тыдзень я насадзіла поўную машыну людзей, і мы паехалі на Глыбоччыну.

**— Ці здараліся сітуацыі, калі вам даводзілася моцна хвалявацца за мужа?**

— Так. Ёсць у яго праблемы са здароўем — вельмі слабы зрок. Аднойчы была небяспека, што ён наогул мог аслепнуць. Па "хуткай" завезлі ў шпіталь. І, дарэчы, я заўсёды ўдзячная ўрачам, якія вярнулі яму зрок, за іх залатыя рукі і прафесіяналізм.

**— У вашай сям'і заўсёды размаўлялі па-беларуску, ці гэтая традыцыя замацавалася паступова?**

— Кожны з нас прыйшоў да гэтага самастойна. І гэта яшчэ адзін пункт, які нас з'яднаў. Да нашага знаёмства мы былі ў розных асяродках. Я з 1977 года пачала ўдзельнічаць у археалагічных раскопках — у рэстаўрацыі Лідскага замка. Так трапіла ў беларускамоўнае моладзевае кола. З Пятром мы пазнаёміліся на занятках у аспірантуры. Жылі ў інтэрнаце праз сцяну, сустракаліся на кухні, на імпрэзах. Дарэчы, у пачатку 80-х наш інтэрнат на вуліцы Акадэмічнай быў адным з нешматлікіх месцаў, дзе можна было пачуць беларускую мову. Дачка яе засвоіла з пялюшак. У пяць гадоў Марыля ставіла для нас лялечныя спектаклі і адразу рабіла сінхронны пераклад рускіх казак на беларускую мову. Цяпер дачка размаўляе па-беларуску, хоць наогул ведае пяць моў.

**— Вы доўгі час працавалі ў археалогіі, але пасля сталі займацца культуралогіяй. Чаму?**

— З археалогіі сышла з-за безвыходнасці: цяжка бачыць, у якім стане знаходзяцца сёння нашы гістарычныя помнікі, калі практычна нічога не можаш зрабіць. Я вывучаю старажытную кераміку XIV—XVIII стст. і збіраю беларускую этнаграфічную кераміку. Пішу артыкулы пра керамічны посуд, яго значэнне і гісторыю. Я аўтар кнігі "Кафлярства ў Беларусі (па матэрыялах калекцый полацкай кафлі)", а таксама ў 1993-м мы разам з А. Трусавым напісалі кнігу "Беларуская паліваная кераміка XI—XVIII стст", гэта, можна сказаць, была мая выпакутаваная кніга.

**— Памятаеце, як Пятро Васільевіч прапанаваў вам стаць ягонай жонкай?**

— Зразумела, заўсёды цяжка вымавіць гэтыя словы першым, бо страшна атрымаць адмову. Таму вельмі доўга ўсё было хутчэй на ўзроўні намёкаў і акалічнасцей. Але набліжалася размеркаванне, і трэба было нешта вырашаць, бо далей нашы шляхі маглі разысціся. А падрабязнасці няхай застануцца ў сакрэце.

**— Але вы пагадзіліся, не раздумваючы?**

— Адразу яго папярэдзіла: у мяне вельмі дрэнны характар, глядзі, каб ты не пашкадаваў. Я была дзяўчына няпростая: у археалагічных экспедыцыях мне даводзілася камандаваць мужчынамі, працаваць з алкаголікамі з працоўнага прафілакторыя, з былымі зэкамі. Вахцёрка інтэрната, былая франтавічка, з якой я вечна канфліктавала, казала яму: "Пеця, глядзі, у яе ж характар!". А ён быў памяркоўны, спакойны, паважлівы хлопец, умеў слухаць. Таму ў мяне пытанняў не было. Цяпер я і дачку вучу: няпраўда, што шлюб па разліку — гэта дрэнна. Разлік прысутнічаў, але не на грошы і не на кватэру, а на тое, што чалавек, якога ты выбіраеш, — разумны, добры, надзейны.

**— Якія ўспаміны засталіся пра ваша вяселле?**

— Вяселле ладзілі на маёй радзіме, у Слоніме. Я ўвогуле з вялікай сям'і — дзесятае дзіцё, маці нарадзіла мяне ў сорак дзевяць гадоў. На вяселлі было шмат сваякоў, вясковых людзей. Мы прывезлі з Мінска нашу маладзёжную суполку. Сватам быў мой стрыечны брат, вясковы хлопец, які цудоўна ведае ўсю гэтую вясельную аўтэнтыку. Было столькі народных жартаў, розыгрышаў, беларускіх песень, звычаяў, прымавак, што ў гасцей літаральна шчокі балелі ад смеху. Наша вяселле згадваюць да гэтай пары, і пасля яго адзін з маіх шваграў нават раптоўна абеларусіўся. Ён зразумеў, што адукаваная моладзь, якая яму імпануе, размаўляе па-беларуску.

**— Ваш муж іранічны чалавек?**

— Яму ўласціва такое стаўленне да жыцця — не дужа сур'ёзнае. Часам праз жарт, праз наўмыснае ўтрыраванне, ён можа абысці канфлікт, які наспявае. А ўвогуле: ён рамантык і лірык. Дагэтуль з задавальненнем чытае казкі, глядзіць добрыя дзіцячыя фільмы, вясёлыя мультфільмы.

**Аляксандра ХАЛОПІК**

**Калі мастак павінен быць галодным, то паэту Андрэю Хадановічу гэта наўрад ці пагражае. І, напэўна, я не памылюся, калі скажу, што ягоныя вершы звычайна нараджаюцца ў цяпле і ўтульнасці. "Афіцыйны спонсар" сямейнага дабрабыту — жонка паэта, Марына Шода.**

# «Ён дбае пра сваю публічнасць»

**— Як выглядаў Андрэй Хадановіч, калі вы з ім пазнаёміліся? Якім было першае ўражанне?**

— Нейкага асабліва яркага знаёмства ўзгадаць немагчыма. Гэта звычайная гісторыя сядзення за адной партай у ВНУ. Мы з Андрэем вучыліся на адным курсе філалагічнага факультэта. Пасля выбралі аднаго навуковага кіраўніка ў аспірантуры, якую, дарэчы, скончылі, але так і не абараніліся. Нашыя адносіны развіваліся вельмі павольна. Спачатку мы доўга сябравалі.

Калі пабачыла Андрэя на першым курсе, падумала: занудны малады чалавек. Ён таксама не вылучыў мяне з натоўпу студэнтак. А пасля, калі я атрымала падчас сесіі ўсе пяцёркі, ён зацікавіўся: хто ж такая, што здае амаль як і ён? Але на апошнім іспыце Андрэй мне не падказаў, чым збіў маю пяцёрашную сесію.

Тады Хадановіч быў высокім і худым хлопцам (ён жа займаўся спортам) з вялікай шавялюрай, якую на другім курсе ўвогуле пастрыг пад іракез, чым шакіраваў і выкладчыкаў, і студэнтаў. Канечне, ён вельмі змяніўся, прынамсі, вагава.

**— Ну, гэта ўжо, напэўна, вашая заслуга?**

— Кухня, канечне, мая. Але і доўгае сядзенне за камп'ютэрам таксама не на апошнім месцы. Ён змяніўся не толькі знешне, але і ў паводзінах. З часу нашага знаёмства прайшло ўжо 17 гадоў. У Андрэя з'явілася такая сталая ўпэўненасць.

**— Ваш муж прысвяціў вам шмат вершаў?**

— Рамантычна-вершавая стадыя нашых стасункаў скончылася да таго, як Хадановіч стаў вядомым у Беларусі паэтам. Андрэй не хавае, што раней пісаў паруску. Ён стаў беларускім паэтам толькі з 1998 года, калі часопіс "Arhe" назваў яго адкрыццём года. А да гэтага былі вершы-прысвячэнні па-руску, якія ён і тады не паказваў публіцы.

У кнізе *"Сто лі100ў на tut.by"* ёсць адзін верш, які, я дакладна ведаю, напісаны пра мяне, бо ў ім можна пазнаць аўтабіяграфічныя момантыя. А вось наконт астатніх можна думаць, што заўгодна.

**— Андрэй чалавек вядомы, публічны, абаяльны. Акрамя таго, выкладанне на філфаку дадае яму дзявочай сімпатыі. Ці не турбуе вас такая ўвага прыхільніц да вашага мужа?**

— Бывае, і лісты дасылаюць, і пакідаюць ананімныя водгукі ў LiveJournal, і нават могуць патэлефанаваць у адзінацаць ночы.

Яно, канечне, у глыбіні душы мяне раздражняе, але я разумею, што трэба прыняць як дадзенае, бо без гэтага не бывае публічнай асобы ўвогуле. Магчыма, ёсць паэты, якім не цікавая, так бы мовіць, зямная слава. Але Андрэй не з такіх. Можа, гэта і не сціпла гучыць, але ён дбае пра сваю публічнасць. Пры гэтым ён досыць ветлівы чалавек — калі прыхільніца напіша яму ліст, ён абавязкова ёй адкажа. З гэтым таксама даводзіцца мірыцца, бо я не магу кантраляваць усе ягоныя ўчынкі і нават не спрабую гэтага рабіць. Андрэй не церпіць над сабой ніякага ціску, ён адразу робіцца непрыступны, як мур. І я ўжо ведаю, што нічога не магу дасягнуць такім чынам. Таму стаўлюся да падобнага з іроніяй.

**— Распавядзіце, калі ласка, пра вашую дачку. Як праяўляецца ў ёй характар бацькі?**

— Шчыра прызнаюся, першыя паўтода Аленка бачыла бацьку толькі палову свайго жыцця. Стажыроўкі і паездкі на фестывалі адбіралі ў нас Андрэя. Але ён вельмі пяшчотны і далікатны бацька. Звычайна таты першыя месяц-два не ведаюць, з якога боку падысці да дзіцяці. Калі нарадзілася Аленка, Андрэй адразу не пабаяўся ўзяць яе на рукі. Яе ўжо цяпер трэба выхоўваць, бо ў ёй праяўляюцца нашы з Андрэем дзіцячыя характары. Бацькі казалі, што і я, і ён у дзяцінстве былі баламутамі, а ў Аленцы гэта праяўляецца з падвоенай сілай, таму з ёй досыць складана. Як гэта звычайна бывае, для дачкі Андрэй "добры следчы", а я "злы", бо часта выхоўваю. Андрэй для яе робіць усё, яна ім памыкае. Толькі калі сядзіць за камп'ютэрам, не заўсёды рэагуе на яе заклікі, бо яго немагчыма адарваць ад працы, і, ведаючы гэта, мы стараемся яму не перашкаджаць.

Ён вельмі любіў гуляць з вазочкам, бо тады трэба было ціха сядзець дзе-небудзь на лавачцы. Часта вяртаўся з такіх прагулянак з новымі прыгожымі, натхнёнымі вершамі.

**— Дачка расце на бацькоўскіх казках і вершах?**

— Я ўжо даўно намаўляю яго напісаць дзіцячых твораў. І раней, калі ён пачынаў падбіраць рыфмы, атрымліваўся нібыта чатырохстопны харэй, якім напісана большасць дзіцячых вершаў. Толькі потым Андрэя ўсё роўна прабівала на сцёб, на гумар не дзіцячы, а дарослы. Часта бывае, што бацькі ўспрымаюць дзіцё, толькі калі яно становіцца асобай, пачынае размаўляць, так адбылося і ў нашым выпадку. Ледзьве Андрэй разгледзеў у дачцэ асобу, ён пачаў кантактаваць з ёй на роўных. І вось у ягоных планах з'явілася кніжка дзіцячых вершаў, дзесятак якіх ужо напісаны.

**— Андрэй часта бывае ў раз'ездах. Напэўна, цяжка дзяліць мужа з ягонай працай?**

— Так. І нават не толькі з-за таго, што ён часта працуе далёка ад дома. Ёсць і прафесійная рэўнасць. Паездкі яго як паэта — гэта некранальна, але калі ён едзе як перакладчык, філолаг, мне часам крыўдна, што я не магу трапіць на тую ж канферэнцыю, на якую едзе ён. З гэтай праблемай змагацца немагчыма, трэба мірыцца, пакуль не падрасце дачка.

**— Пераклады — гэта ваш асноўны занятак?**

— Не, галоўная праца — выкладанне замежнай літаратуры на факультэце міжнародных зносін БДУ. А перакладамі пачала займацца для душы і нават не думала, што яны будуць друкавацца. Напрыклад, за працу "Мерседэс-бэнц" польскага пісьменніка Паўла Гюле я ўзялася, седзячы дома з чатырохмесячнай Аленкай. Цяпер перакладаю з польскай, украінскай моў, спрабавала рабіць пераклады з англійскай.

**— А Хадановіч выступае строгім рэдактарам вашых перакладаў?**

— Аднойчы, калі мы з Андрэем былі на стажыроўцы ў Варшаве, я спрабавала перакладаць раннія вершы Джэймса Джойса. Гэта былі нашыя перадвясельныя часы, і мы пасяліліся ў адным пакоі. Праз некалькі дзён паляк, які жыў з намі па суседстве, паскардзіўся: "Я прыехаў сюды, каб працаваць, а мяне селяць побач з нейкай сямейнай парай, якая ўвесь час сварыцца і б'е посуд!". Справа была ў тым, што я паказвала Андрэю свае пераклады, а ён пачаў іх рэдагаваць. Некалькіх талерак пасля гэтай сумеснай працы мы сапраўды не далічыліся. Ён увогуле вельмі таленавіты рэдактар, вершы пасля ягонай рэдактуры выходзяць на ўзровень вышэй. Але тады ў мяне было моцнае супраціўленне: мне здавалася, я нарадзіла ў пакутах цудоўны вобраз, а ён яго ўшчэнт знішчае!

**— Якія ўмовы патрэбныя Андрэю Хадановічу, каб тварыць?**

— Лепшыя ягоныя тэксты і вершы нараджаюцца ў дарозе. А калі ён піша дома, то галоўная ўмова — гэта не чапаць, не прасіць выкінуць смецце ці забіць цвік. Ну не тым занятыя ягоныя думкі.

**Саша ДОРСКАЯ**

# Сям'я няпоўнай стала

**На паўдарозе з Глыбокага ў Паставы, паміж шматлікіх узвышшаў і азёр, размясцілася вёска Дунілавічы. Гэта цяпер яна вёска, дакладней, аграгарадок, а раней гэта было мястэчка. Годам заснавання Дунілавіч лічыцца далёкі 1473. Праз мястэчка праходзіў Напалеон, яго наведваў расійскі цар Мікалай II. Дунілавічы былі гарпасёлкам і раённым цэнтрам у савецкі час. Цяпер тут пражывае каля 800 чалавек. Пераважная большасць мясцовых жыхароў пасялілася ў мястэчку пасля Вялікай Айчыннай вайны. Доўгі час большасць яго жыхароў складалі яўрэі, поруч з імі жылі беларусы, татары і людзі іншых нацыянальнасцей — як тая сям'я, дзе ўсё — і горкае, і салодкае — разам. Але пра лёс яўрэйскай абшчыны вядома вельмі мала...**

## Гісторыя старажытная

Першыя ўпамінанні аб пасяленні яўрэяў у Беларусі, як вядома, адносяцца да 1412 года. Пазней, у XVI стагоддзі адзначаецца інтэнсіўная міграцыя яўрэяў з Германіі праз Польшчу ў Беларусь. Да тых часоў адносіцца і арганізацыя яўрэйскіх пасяленняў — кагалаў, якія з'яўляліся юрыдычнымі арганізацыямі і адказвалі перад уладамі за ўсіх членаў сваёй абшчыны.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай Кацярына II выдала загад пра «мяжу аселасці» яўрэйскага насельніцтва, згодна з якім вызначаліся месцы іх абавязковага кампактнага пражывання. Вось з гэтага загаду і пачалася «яўрэйская» паласа развіцця Дунілавіч. Напрыклад, у 1800 годзе тут пражывала каля 600 жыхароў, 326 з іх былі яўрэямі. А вось па перапісе 1897 года ў мястэчку налічвалася ўжо 1810 жыхароў, з іх яўрэяў — 1553 чалавекі. Па тым часе гэта было даволі буйное яўрэйскае пасяленне.

## Пад уладаю царскай Расіі

На пачатку мінулага стагоддзя яўрэі займалі ўвесь цэнтр Дунілавіч. Хрысціяне жылі толькі на адной вуліцы, самай вялікай у мястэчку (цяпер гэта вуліца Асяненкі). Гэта вуліца выходзіла на рыначную плошчу, размешчаную каля цяперашняга касцёла. Пазней рынак быў перанесены ў раён калгаснай піларамы. Кожны аўторак тут збіраліся сяляне з навакольных вёсак, прадавалі тое, што вырасцілі, куплялі простыя, але жыццёва неабходныя тавары: соль, газу, запалкі, металічныя вырабы, галантарэю, тканіны і іншае. Шмат яўрэяў займаліся возніцтвам, маючы ўсяго аднаго каня і фурманку. Яўрэі ўтрымлівалі грамадскую лазню: здавалі яе ў арэнду.

Дзейнічалі тры сінагогі: традыцыйная артадаксальная, самая старая і вялікая, «арыстакратычная» для багатых яўрэяў і тых, хто не вельмі прытрымліваўся веры, і маленькая — для бедных веруючых. Артадаксальная сінагога мела на ўтрыманні ўласнага равіна.

У мястэчку былі тры невялікія школы — хедэры. У школе для навічкоў выкладаў Залман. Ён запомніўся тым, што ў руцэ заўсёды трымаў бізун. У другой школе настаўнікам быў таксама Залман, па мянушцы Казёл, які падпрацоўваў тым, што выпякаў булачкі і рагалікі. У трэцяй школе працаваў больш прагрэсіўны выкладчык Пезак Лейб Мушкат. Ён развіваў у вучняў навыкі пісьма на іўрыце і ідзішы.

Пачатак Першай сусветнай вайны выклікаў ажыўленне ў жыцці мястэчка. Праз Дунілавічы праходзіла на фронт многа расійскіх салдат і афіцэраў. Больш паспяхова пайшоў гандаль, вырас прыбытак. З прыбліжэннем фронту большасць яўрэяў засталіся ў Дунілавічах і хаваліся ад абстрэлаў ў вялікім сутарэнні, што засталося пасля пажару ў касцёле Святога Міхаіла. 7 лютага 1916 года, у нядзелю, мястэчка наведаў цар Мікалай II. Пазней у сваім дзённіку ён запісаў: «Радовался ужасно увидеть своих сибирских стрелков и свою роту в поч. карауле у штаба 1-ой Сиб. Стр. Дизизии в м. Дуниловичи. Там в доме гр. Тышкевичей угостили хорошим завтраком».

Настаў час падзелу тэрыторыі паміж Расіяй і Польшчай. Дунілавічы зноў апынуліся ў пекле вайны. Зноў давялося хавацца ў знаёмым сутарэнні. Некаторыя хаваліся ў будынку праваслаўнай царквы, цяперашнім касцёле.

Неўзабаве палякаў змянілі рускія. Сустракалі іх урачыста — кветкамі і пальмянымі прамовамі. Людзі ад радасці літаральна танцавалі на вуліцах. Праз некалькі тыдняў рускія адступілі, вярнуліся палякі і — атмасфера змянілася. Людзі згубілі веру ў будучае. Праўда, пачалі працаваць крамы, адкрыўся рынак...

Пасля падпісання Рыжскага дагавору палякі хутка ўстанавілі ў мястэчку сваю ўладу. Кіраўніком яўрэйскай абшчыны быў прызначаны шавец Аран-Зэлік Друтц. Ён не ўмеў ні пісаць, ні чытаць, але паспяхова кіраваў на працягу чатырох гадоў. Праваслаўная царква была перададзена пад каталіцкі касцёл. Пачатковая школа пачала працаваць на польскай мове. Навучанне было бясплатнае, але з яўрэйскіх дзяцей яе наведвалі толькі 10 чалавек, астатнія працягвалі займацца з Пезакам Лейб Мушкатам і Залманам.

## За польскім часам

Вызначальнае значэнне ў жыцці яўрэйскага мястэчка мелі органы самакіравання. Узяць, да прыкладу, пытанне адукацыі дзяцей. Яўрэі абралі камітэт з шасці чалавек, якому даручылі арганізаваць школу. Былі запрошаны з Вільні два настаўнікі. Прозвішча аднаго было Розэнфельд, а другога звалі Саламон. Заняткі праходзілі ў памяшканні сінагогі.

Пасля заканчэння навучальнага года школьнае пытанне стала абмяркоўвацца зноў. Выспела думка пра будаўніцтва асобнага будынка школы (folkschule). Зноўку быў абраны камітэт. Неўзабаве падабралі пустку каля ракі, непадалёку ад грамадскай лазні. Сродкі, якія меў камітэт, былі мізэрныя. Але ўсё ж удалося пабудаваць будынак з двух класных пакояў.

Але і гэты будынак не змог змясціць усіх жадаючых вучыцца. У трэці раз паўстала пытанне пра будаўніцтва. Вырашылі звярнуцца да землякоў, якія эмігрыравалі ў Паўночную Амерыку, і атрымалі ад іх некаторую грашовую дапамогу. Размясціўся новы будынак у раёне цяперашніх калгасных зернясховішчаў. У ім былі створаны і ўмовы для работы драматычнага гуртка. Прыбытак ад спектакляў ішоў на фінансаванне школы. Таксама пры школе быў створаны аркестр з шасці музыкантаў, які іграў на вечарынках, вяселлях, а даходы папаўнялі школьную касу.

Акрамя школы, у мястэчку дзейнічала невялікая прыватная бальніца Вэбэра. Працавала шмат крам. Напрыклад, на месцы цяперашняга комплекснага прыёмнага пункта знаходзіўся «жалезны» магазін, у якім можна было набыць любыя вырабы з металу — ад іголкі да малатарні.

Важным звяном у жыцці яўрэйскай абшчыны быў кірмаш. Кожны аўторак тут праходзілі таргі паміж яўрэямі і сялянамі. Абсалютная большасць гандлёвых месцаў належала яўрэям, некаторыя віды гандлю былі ў руках хрысціян, напрыклад, гандаль мясам. Гандлявалі ім не яўрэі: Салонка, Мажэйка, Германовіч.

Асвятляліся Дунілавічы электрычнасцю. Працавалі дзве электрастанцыі — гідра- і цеплавая. Дзейнічалі дзве вадзяныя калонкі: у цэнтры мястэчка і ў раёне дзяржбальніцы, у канцы цяперашняй вуліцы Асяненкі.

Даволі шмат увагі надавалася добраўпарадкаванню. Кожная вуліца была абсаджана дрэвамі пэўнай пароды — ліпамі, ясенямі, каштанамі. Некаторыя з іх захаваліся да нашых дзён. Тратуары вымашчаны плітkай, вуліцы выбрукаваны каменем. У мястэчку дзейнічала ліўневая каналізацыя.

## Крывавая нядзеля

Даведаўшыся пра пачатак вайны з фашысцкай Германіяй, людзі ў мястэчку захвалявaліся, але ніхто не ўцякаў.

Немцы адразу ж сталі варожа адносіцца да яўрэяў. Іх мабілізавалі на рамонт дарог, разбураных цяжкай тэхнікай. Хутка з'явіліся загады, асноўным словам у якіх было «забараняецца». А «нельга» было амаль усё: наведваць школу і бальніцу, адыходзіць больш чым на тры кіламетры ад мястэчка, з'яўляцца на вуліцы пасля пяці гадзін вечара, прымаць у доме чужога і інш... Правялі перапіс яўрэйскага насельніцтва. Кожны дарослы павінен быў прыходзіць на работу. Кожны яўрэй на спіне і на грудзях насіў жоўтую метку з літарай «J». Надзвычай жорстка абыходзілася з яўрэямі паліцыя. Сродкам здзекаў часта станавіліся возера і рака. Раніцай і вечарам людзей заганялі па горла ў халодную ваду і прымушалі паўзком выбірацца на бераг. Быў выпадак, калі ў восеньскую халадэчу змусілі праполваць дно возера да апошняй расліны. Забівалі ці расстрэльвалі за дапамогу аслабелым падчас работы, за тое, што ўзяў ежу ў мясцовых жыхароў, а іншы раз і проста так. Была створана яўрэйская паліцыя — юдэнрат; яна несла адказнасць за дзеянні членаў абшчыны.

Аб'явілі аб стварэнні гета. Загадалі сабрацца за 24 гадзіны, мець з сабой не больш чым 25 кілаграмаў маёмасці. Мэбля, каштоўныя рэчы, дамашняя жывёла былі канфіскаваны. Быў абгароджаны невялікі ўчастак мястэчка. Для ўваходу-выхаду — адзіныя вароты, побач з якімі знаходзіўся штаб юдэнрата. На гэтым пятачку месціліся каля тысячы чалавек, цеснята была неймаверная. Лічыцца, што першапачаткова ў гета трапілі 903 чалавекі. Дзіўна тое, што многія да апошняга верылі ў гуманнасць фашыстаў. Хоць частка вязняў рыхтавала сховы на тэрыторыі гета: капалі схроны, абсталёўвалі патайныя месцы на гарышчах. Людзі прадчувалі бяду. У ноч на 22 лістапада 1942 года зняволеныя зразумелі, што яны акружаны. Тых, хто набліжаўся да агароджы і спрабаваў уцякаць, зараз жа забівалі. Усе кінуліся да загадзя падрыхтаваных сховаў.

Звернемся да дакумента — Акта надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні злачынстваў, учыненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Дунілавіцкім і Пастаўскім раёнах ад 10 красавіка 1945 года. «У лістападзе 1942 года пачаўся масавы расстрэл яўрэяў. Спецыяльны атрад з 35 немцаў, што прыехалі з Глыбокага, за тры дні закатаваў і расстраляў 828 чалавек, з якіх было 300 ні ў чым не вінаватых дзяцей. Ноччу 21 лістапада 1942 года на 4 машынах да гета пад'ехалі 35 немцаў і, паставіўшы кулямёты, пачалі абстрэльваць жылыя дамы. Калі развіднелася, усіх жыхароў гета, хто застаўся ў жывых, пачалі заганяць у хлеў, там іх распраналі і ў адной ніжняй бялізне выганялі на вуліцу па 3-4 чалавекі, дзе яны расстрэльваліся з аўтаматаў п'янымі немцамі».

Многія кінуліся ратавацца праз рана замерзлае ў тым годзе возера, але яно прастрэльвалася з трох бакоў, і дабеглі нямногія: недзе адзін з трох уцекачоў. Па маіх падліках, пашанцавала 57 чалавекам. Частка ўцекачоў схавалася ў навакольных вёсках і хутарах, частка падалася на пошукі партызан. Рызыкуючы жыццём, хавалі яўрэяў некаторыя неяўрэйскія сем'і. Найбольш вядомай з'яўляецца сям'я Зямчонкаў з вёскі Гараваткі, якая выратавала яўрэйскую сям'ю Гардона. Былі такія сем'і і ў Зарэжжы, і ў Дзенькаўшчыне, і на бліжэйшых хутарах.

Гета аказалася ліквідаваным поўнасцю: дамы разбураны і спалены, забітыя — у брацкай магіле... У пасляваенны час на месцы гэтага жудаснага пахавання па ініцыятыве і на сродкі Рудэрмана быў устаноўлены помнік. Нядаўна абеліск і надмагільны помнік абноўлены. Каля абеліска можна часта ўбачыць жывыя кветкі і, згодна з яўрэйскім звычаем, дробныя каменьчыкі.

Ніводнага члена яўрэйскай абшчыны ў мястэчку не засталося, як і самога ўласна яўрэйскага мястэчка...

**Франц ХОМІЧ**

***На здымках: жылы дом з рэстаранам (будынак захаваўся); будаўніцтва грамадскай лазні, 1923 год.***

## Пераклады



Нарадзіўся ў Пёнках (Польшча) у 1951 годзе. Дэбютаваў у Любліне яшчэ ў студэнцкія гады. У снежні 2005 года атрымаў першую ўзнагароду ў конкурсе Таварыства польскіх пісьменнікаў за кнігу паэзіі "Дзесяць вершаў для Гроша", а таксама першую ўзнагароду ў катэгорыі прозы падчас Надныскіх Літаратурных сустрэч у горадзе Згажэлец. У 2006 годзе — першую ўзнагароду ў катэгорыі прозы падчас конкурсу Малыя літаратурныя формы "Любоў мае некалькі імёнаў".

Супрацоўнічае з часопісамі "Люблін", "Resursa", "Akant", "Obrzeża" і інш. Яго вершы і аповесці выйшлі ў перакладзе на ўкраінскую мову.

**Войцех ПЕСТКА**

### *Прыдарожны бар*

*На скрыжаванні з усходу на захад*
*Ад сёння на заўтра*
*Ад вядомага ўчора ўжо было,*
*На невядомае толькі будзе*
*Бар*
*Немагчыма яго абмінуць*

*Наш стасунак*
*З магчымых да ўсяго найбольш*
*асабісты*
*Наша выключнасць на аўтапартрэт*
*у люстэрку*
*Выбар наш абмежаваны.*
*З піва толькі жывец*
*З таго, што засталося —*
*халоднае кураня*
*Нашы надзеі, наш голад, які гасне,*
*Наш страх, які расце*
*Нашыя чаканні*
*І нічога больш*

*Пчала малітвы над чэрапам*

*Наша прабач*
*Пакуль што*

### *Шпацыр па стужцы*

Для Ані Б

*Не ведаю з кім ты водзішся*
*З кім спіш Аня*
*Якое гэта мае значэнне*
*Для той вечнай гісторыі*
*Пра сапраўднае каханне*

*Не ведаю*
*Ці тая зорка*
*Яшчэ свеціць*
*На начным небе*
*Поўным чорных хмар*

*Цяпер усё іншае*
*Спозненае. Празмерная*
*Занадта каштоўная*
*Кватэра ў горадзе*
*Месца ў раі*

*Аня*
*Як прайсці*
*І захаваць раўнавагу*

*Над*
*Далінамі ночы*
*Вецер*
*Тонкая стужка святла*
*З-пад зачыненых дзвярэй*

### *Спатканне*

*я выцягваю руку*
*стаю пасярод вакзала*
*меўся чакаць на пероне*
*на твой прыезд*

*спазніўся аўтобус*
*прабач*

*хтосьці побач пераступае з нагі*
*на нагу шукае пальцам, які страціў*
*цярпенне, у партманеце імгнення*

*заглядвае ў вочы*
*мудрасці, пералічвае на грошы позіркі*
*фартуны, шукае*
*знаёмы твар*

*але толькі*
*я*
*маю яблык*
*і*
*магу*
*даць яго Табе*

**Пераклаў з польскай мовы**
**Вячаслаў МАЦЮШЭНКА**

# 150 пісьменніцкіх...

(Працяг. Пачатак у № 22)

## «Еўрабабка» на «еўраабрусе»

Нядаўна сваячка распавяла пра страсці ў невялікім калектыве, дзе яна працуе, вакол прыёму важнецкіх гасцей са сталіцы ды не надта далёкага замежжа. Калектыў гэты вясковы. Раённае начальства закамандавала, каб для такіх пашанотных персон быў накрыты... еўрастол.

Бедныя вясковыя інтэлігенткі абзвоньваюць сваю гарадскую радню ды распытваюць, што ж гэта такое — еўрастол.

Па сваім уласным вопыце я мог сказаць толькі адно: еўрастол — гэта калі за паўдня табе пададуць тры не дужа апетытныя стравы і ты пакідаеш застолле з думкаю, дзе б нармальна паесці.

Дзіўна ўсё ж: маючы багаты вопыт прыгатавання нацыянальных страў, мы нібыта саромеемся ўласных унікальных традыцый і ў сваёй хлебасольнасці папросту губляем межы разумнага сэнсу. Сапраўды, ці можа хто даць дакладнае азначэнне, што ж такое "еўрастол"? Можа, шведскі? Экзатычна: паклаў сабе ў талерку сёетое — танюткіх скрылікаў каўбасы ды вяндліны — і спажывай, стоячы, як на вакзале. Наогул, у Еўропе шмат краін, і кожная мае сваю нацыянальную кухню. Якая ж з іх найбліжэй да вызначэння "еўрастол"? Для некаторых беларусаў, аказваецца, якая заўгодна, толькі не свая, беларуская. Не лічаць яны сябе еўрапейцамі, дый годзе, хоць Беларусь і месціцца ў цэнтры Еўропы.

Паказальна, што з усяго калектыву, у якім каля трыццаці чалавек, толькі тры чалавекі выступілі за тое, каб частаваць гасцей, што называецца, па-беларуску, па-вясковаму. А так як пра "еўрастол" нічога канкрэтнага ніхто не здолеў даведацца, вырашана было: той, хто прапанаваў гатаваць беларускія стравы, няхай сам гэтым і зоймецца.

І зноўку пачаліся званкі да сваякоў, маўляў, а па-беларуску — гэта як? Няўжо так, як у вёсцы, як для сябе гатуюць? Спахапіліся: а што ж мы сабе гатуем? Аказалася, што са спаконвечных нашых страў не так і шмат сёння ў шырокім ужытку: бліны, дранікі, квашаніна... Дый квашаніна не ў кожнага ёсць — яе замянілі гароднінныя кансервы на воцаце. А посуд які ў нас? Аказваецца, гліняныя гаршчкі мала ў каго засталіся. Няма льняных абрусаў ды сурвэтак, ды хлебніц з саломкі... Зрэшты, пабегалі па вёсцы, дык дзе-што назбіралі. У гліняных гаршчэчках напражылі бабкі ды купатаў са шкваркамі, напяклі вялізных бліноў, а да іх падалі гарачую верашчаку, нарэзалі сала з трайною праслойкаю, пальцам пханае каўбасы, паставілі квашаную капусту, прыпраўленую кропам, салёных агурочкаў з дубовай бочкі... Хлеб, і той быў хатні, з печы, ды вельмі ўдалы — смачны нават без анічога, сам па сабе. Іншыя стравы — смажаная рыба, вяндліна — толькі дапаўнялі гэтыя, самыя галоўныя, і да іх чарга папросту не дайшла, бо перавагу госці без падказак аддалі нацыянальным стравам: гарачым, духмяным, апетытным і дужа карысным. Гаспадары адно прадэманстравалі, як скручваць у трубку бліны ды мачаць іх у верашчаку. Пасля частавання яны доўга прымалі словы ўдзячнасці; госці запэўнівалі, што нічога смачнейшага ў сваім жыцці ніколі не елі.

Калі сваячка распавядала пра фінал так званай "аперацыі еўрастол" ды дзякавала за падказкі, падумалася, што, пераймаючы ад багацейшых краін Еўропы стыль жыцця, нам усё ж ні ў якім разе нельга забываць пра свой нацыянальны каларыт. Гэта, бадай, самае каштоўнае, што ў нас ёсць. Еўрамэбля, еўравокны, еўрадзверы, еўраінтэр'еры, еўрасантэхніка, еўрафасады — добра, бо гэта зручнасць і даўгавечнасць. Але, седзячы ў еўракватэры на еўракухні, лепш частавацца беларускімі еўрабабкай у гліняным еўрагаршчку, пастаўленым на льняны еўраабрус, чым немаведама чыім еўрабутэрбродам з тонкім скрылікам еўравяндліны і вялізным лістом еўрасалаты. А яшчэ лепш, калі інтэр'ер кухні стылізаваны пад усё беларускае. Ад гэтага ён не страчвае еўрапейскасць, а падкрэслівае яе. Дый адчуваеш сябе ў такім інтэр'еры па-сапраўднаму дома, а не ў еўрагасцініцы.

## Ах, вёска, вёска...

Усеўшыся каля акна ў дызельцягніку Брэст — Янаў-Палескі, праз якія дзесяць-пятнаццаць хвілін зірнуў у вялізнае квадратнае акно. Імжа густа заштрыхавала шыбіну кароценькімі і даўжэйшымі празрыстымі рысачкамі. З гэтага краявід за акном падаваўся велічным жывапісным палатном; рознакаляровым, але ў сцішаных танах. На зялёным, амаль бірузовым поплаве паўсюль белыя плямінкі. Прыгледзеўся: вунь сямейкамі і паасобку рассыпаныя шампіньёны; па-нашаму — пячуркі. А вунь скамячаныя белыя паперкі — смецце. Яны прыкладна аднолькавыя па велічыні; здалёк — проста белыя плямы на зялёна-бірузовым фоне. Але... як усё ж хораша, эстэтычна глядзяцца белыя грыбочкі, і як пачварна — белыя шматкі. Апошняя ніякіх асацыяцый не выклікае, а вось пячуркі... Адразу ж прыгадалася родная вёсачка і родная хата, вакол якой з трох бакоў — поплаў. На ім напрыканцы кожнага лета — у пачатку восені калгас рассцілаў ільнотрасту, каб яна "даспявала". Чамусьці пячуркі надта любілі расці якраз пад гэтымі бясконца доўгімі дарожкамі з ільну. Выскачыш на світанні, калі з чырвонага вядра выліваецца за далягляд загадкавае пунсовае варыва, і пакуль тое варыва выльецца ды расцячэцца суюем па наваколлі, у цябе поўны ўжо кошык і поўная майка, завязаная знізу і ператорваная ў торбу з ручкамі.

На шыбіне нешта заварушылася. Гэта конік! Наш конік — хутчэй руды, чым зялёны. Сядзіць і заднія "капыты" пацірае адно аб другое. Ці то не бачыў я яго з самага пачатку, ці аднекуль во толькі прыскакаў? Гэта ж мой дзіцячы лекар. Улетку на тым жа поплаве каля роднай хаты лавіў з сябрамі яго суродзічаў і яны лячылі нашыя ранкі-драпіны на руках і нагах. Рабілася гэта проста: злоўленага коніка падносілі да драпінкі і не надта моцна сціскалі ў пальцах брушка. З яго з'яўлялася кропелька рудой мікстуры, якою змазвалі параненае месца. Можа, яно і так хутка зажыло б, але мы лічылі, што гэта конікі ўсё зажыўляюць.

Паўспамінаў, палюбаваўся, можна і пачытаць. У руцэ тоўстая чорная кніга, падобная да Бібліі. Але гэта сшыткі-нататкі пісьменніка, які нарадзіўся на іншым кантыненце. Якраз натрапіў на блізкае: "...у вакзальнай кавярні. Вунь за тым круглым столікам у куце добра і доўга пасядзеў у чаканні цягніка. З ахвотаю выпіў смярдзючага рому і з'еў кавалак рыбіны. Ён кліча да сябе, гэты кут. Гэткі ён родны, гэткія цёплыя ( і свежыя) аб ім успаміны. Тут думкам і пачуццям пасля лёгкага "прычасця" зрабілася ўтульна, улагоджанаму жывату — уедна...

Часовае, часовае прыстанішча, як і родная хата, зямное жыццё..."

Асацыяцыі, аднак: ад будзённа-побытавага да вечнага. "Мой родны кут, як ты мне мілы...". Усміхнуўся пакліканай чужымі і сваімі развагамі лёгкай на ўспамін мелодыі.

— Гэй, зямляк! — паклікаў нехта ад процілеглага акна.

Я пазнаў чалавека толькі тады, калі ён нагадаў, што некалі званіў і пазямляцку прасіў напісаць пра тое і тое, абяцаў добра аддзячыць, а я не прыехаў і не напісаў. Папраўдзе, я чакаў, што ён яшчэ раз пазвоніць і назаве дату, калі мне можна пад'ехаць. Цяпер ён быў на такім падпітку, што кепка з яго дужа хісткай галавы ўвесь час злятала на падлогу, а ў яе нешта ўсё капала з носа. Дзве гадзіны ён упэўніваў сябе і ўсіх у вагоне, што вунь сядзіць пісьменнік і журналіст, які не выканаў сваё абяцанне і ўвогуле нейкі невядома які, і бацька ягоны быў у вёсцы такім недарэкам, што ўсе смяяліся і здзекаваліся з яго... Дзве гадзіны я сядзеў моўчкі, нават і не дыхаў, і ўсё думаў: гэта таксама мая родная вёска; ТАКАЯ. Я выслухаў усё, што думае пра мяне, маіх бацькоў і продкаў ТАКАЯ вёска, бо да гэтага ведаў толькі зусім іншыя думкі зусім іншай вёскі. Я нават паўтарыў мо сто разоў радкі свайго верша пра тое, нібыта я "хмурынка над роднаю хатай, // Што з цёплага коміна выйшла..."

Людзі спачатку цыкалі на п'янага, маўляў, чаго ты прыстаеш да чалавека, ці не бачыш, што абазнаўся. Пасля перасталі звяртаць увагу.

Праз дзве кашмарныя гадзіны чалавек выйшаў, і я з палёгкаю ўздыхнуў. Дваццаць хвілін пасяджу спакойна, а там і мне выходзіць.

І тут — ужо смешнае. У вагон уваходзіць даўні знаёмы, заўважае мяне і крычыць: "Гэта вы!.." Называе паважліва па імені і па-бацьку і амаль з парога абвяшчае: "А я вас па тэлевізары бачыў. Гэта ж вы ўжо такі пісьменнік, што ажно па тэлевізары паказваюць..." Я і ўбачыў, і адчуў вакол дзесяткі пар скіраваных на мяне акругленых вачэй.

Дабіў мяне гэты дабрадзей.

Перад выхадам на сваёй станцыі помным з маленства рухам злавіў на шыбіне коніка-эскулапа і беражліва перанёс яго ў торбу на нейкую паклажу. Падумаў: цяпер буду залечваць табою душэўную рану. Праўда, не прыдумаў, як, якім чынам. Толькі ступіў на перон, конік як бач выскачыў з прасторнай схованкі на асфальт. Нечая нага, здавалася, ужо прыдушыла беднае насякомае, але не, яно зноў апісала доўгую дугу ў паветры, пасля вылузнулася з-пад іншых чаравікаў, туфляў, басаножак... А я ўсё стаяў і перажываў, аж узмакрэў, каб натоўп не растаптаў такую мілую жывую істоту.

Калі ўбачыў, што конік даскакаў да травы і схаваўся ў ёй, на душы зрабілася светла і лёгка. Душэўнай раны як і не было. Конік сам знайшоў, як залячыць маю дарослую рану.

## Трохграшовыя згадкі

Ад таго часу, як Беларусь займела свае ўласныя грошы (а чаму не? Па плошчы мы пераўзыходзім Бельгію, Нідэрланды, Швейцарыю і Партугалію, разам узятыя, і каб без уласных грошай), мінула ўжо столькі часу, што здаецца, нібыта яны былі заўсёды. Але звязаныя з імі гісторыі асвяжаюць у памяці гады так званага станаўлення ўласнай грашовай сістэмы.

Дык вось, першымі былі "зайцы". Маладым асобам, якія той час не засталі, тлумачу: так называліся першыя беларускія грошы таму, што на іх змяшчаліся выявы звяроў, што насяляюць краіну — вавёркі на самай меншай намінацыі, зубры — на самай большай, а паміж імі ваўкі, ласі, рысі, бабры, зайцы...

Дык вось першая згадка з 1992 года. Раніцай неяк вызіраю з акна рэдакцыі Іванаўскай "раёнкі", а на супрацьлеглым баку вуліцы бабуля падскоквае і зрывае нешта з аголеных асенніх галін агромністага дрэва. Прыгледзеўся: ніжнія галіны таго дрэва нібыта ў лісце ўвабраныя. І гэта глыбокай восенню. Пайшоў паглядзець, што там такое дзеецца. І ўбачыў: на галінкі былі нанізаны ці не сотні купюр беларускіх грошай — пераважна з выявамі зайцоў, хоць трапляліся і ваўкі, і ласі, і нават некалькі зброў.

Трохі пазней у Пінску, непадалёку ад рынку, ледзь не спатыкнуўся аб чалавека. Брудны, зморшчаны, ён ляжаў проста на тратуары. Марасіў дождж, а ён сабе рукі "вольна ўшыркі раскінуў" і спіць. Ля ног у яго кепка. У кепцы некалькі дробных купюр з выявамі тых жа зайцоў ды ваўкоў. Некалькі такіх паперак прыліплі то тут, то там да тратуарнай плітак.

Жанчына трасе чалавека за плячо:

— Гэй, гэй, вашыя грошы рассыпаліся.

Мужычок адрывае ад пліткі галаву, моршчыцца, няўцямна варочае зрэнкамі, нарэшце абыякава адмахваецца рукой:

— А, гэтыя. Гэта ж драбяза.

І ён зноў кладзе галаву на бардзюр, заплюшчвае вочы.

Абураная жанчына нервова цьфукнула і задрабніла абцасікамі далей ад бамжа.

А вось гэтая карцінка ўжо з так званай новай грашовай эры, калі з беларускіх купюр зніклі звяры і засталася толькі архітэктура. Яна, дарэчы, была і на першых банкнотах, вартасць якіх перавышала сто рублёў — вось ім якраз і адпавядала выява зубра. Так ужо сталася, што звяры прапалі ў выніку інфляцыі.

Дык вось яшчэ адзін грашова-камедыйны сюжэцік-ілюстрацыя прыкладна дзесяцігадовай даўнасці.

Ля крамы хлапец усеўся на сметніцу і спіць, схіліўшы на грудзі галаву. У яго каля ног, на зямлі — кепка. Відаць, зляцела з галавы, покуль спаў. А ў кепцы вецярок тармошыць, трэпле жоўтыя і зялёныя купюры з выявамі велічных збудаванняў. Няйначай, нехта пажартаваў. Бачна ж, што хлопец не жабруе, а мірна адпачывае. Цікаўныя прахожыя зазіраюць у кепку і заходзяцца ад смеху. Самыя гарэзлівыя дастаюць з кашалькоў драбязу і папаўняюць змества кепкі.

Напэўна, яны ўяўляюць сабе, як хлапец ачомваецца ад сну і з пахмелля зырыцца на грошы ва ўласнай кепцы.

**Анатоль КРЭЙДЗІЧ**

***Фота Віктара Кавалёва***

# Наблізіцца да ісціны

**Чарговым госцем перадачы "Культурная прастора" спецыяльнага карэспандэнта Беларускага радыё Яны Хадоскі стаў вядомы беларускі рэжысёр і кінадакументаліст Анатоль Алай. Ён пачаў свой шлях у кінематографе з пасады асвятляльніка ў 1961 годзе, затым працаваў аператарам і вось ужо два дзесяткі гадоў стварае дакументальныя стужкі як рэжысёр. Сярод яго вядомых карцін — "Не плачце па мне", "Чырвоны д'ябал", "Салдаты Італіі", "Чарнобыльскі крыж" ды іншыя.**

**— Анатоль Іванавіч, ці праўда, што ваш новы фільм "Панцеляймон Панамарэнка", які цяпер запушчаны ў вытворчасць, з'яўляецца самым складаным у вашай творчай біяграфіі?**

— Мабыць, гэта сапраўды так, таму што гэты фільм ахоплівае жыццё нашай рэспублікі за велізарны перыяд часу. Гэта не толькі фільм пра чалавека, пра вядомага дзяржаўнага дзеяча, але і фільм-асэнсаванне старонак нашай гісторыі, якія дагэтуль выклікаюць спрэчкі. Напрыклад, рэпрэсіі трыццатых гадоў, узаемаадносіны партыі і НКУС, катастрофа сорак першага года, ацэнка партызанскага руху... Гэта значыць, што мусіць адбыцца велізарная, напружаная праца.

**— І як ідзе падрыхтоўчы перыяд?**

— Праведзена карпатлівая праца, у прыватнасці, з архівамі. Але хочацца знайсці цікавыя кадры, таму што не адзін раз рабіліся фільмы на гэтую тэму, і сказаць нешта новае сапраўды складана. Хоць цяпер напалову, калі не цалкам, адкрыліся архівы. Менавіта там засяроджана самае цікавае. Туды дабрацца не зусім лёгка, але магчыма. Я хачу сказаць, што Сталін рыхтаваў у асобе Панцеляймона Панамарэнкі свайго пераемніка. Таму ўвесь фільм будзе не простым пералікам гістарычных падзей, а пабудаваны такім чынам, каб паказаць, за што Сталін так шанаваў Панамарэнку. Бо вядома, што калі з Іосіфам Вісарыёнавічам здарыўся інсульт, то ён сказаў членам Палітбюро, каб кожны прапанаваў кандыдатуры на яго месца. Адным з пяці кандыдатаў быў Панамарэнка. Я цяпер праглядаю хроніку і нібы трапляю ў тую эпоху. Усё тут было звязана з імем Сталіна: выбарчыя ўчасткі, усюды яго партрэты, скульптуры. Гэта вельмі цікавыя матэрыялы, але вы ведаеце, вядома ж, хочацца чагосьці сенсацыйнага.

**— Ужо атрымалася нешта такое адшукаць?**

— Дагэтуль гісторыкі спрачаюцца над пытаннем: ці была абвешчана ў Нямеччыне жалоба з нагоды смерці гаўляйтэра Беларусі Вільгельма Кубэ? Я пытаў у нашых гісторыкаў: "Ці быў Гітлер на пахаванні? Ці быў такі факт?" Усе мне адказвалі — не. Але я вам скажу, што мне ўдалося знайсці такія кадры нямецкай трафейнай хронікі, якія, мабыць, стануць сапраўдным адкрыццём: жалобная працэсія, у дамавіне ляжыць гаўляйтэр, да яго падыходзіць Гітлер, схіляе галаву. Германія абвясціла жалобу. Я лічу, што гэта — знаходка. Ну і гэткіх кадраў у фільме будзе нямала. Вядома, часам адкрыцці нам шкодзяць, але хочацца нечага новага. Гэта ўсё робіцца не дзеля сенсацыі, а дзеля таго, каб наблізіцца да ісціны.

**— Вы праводзіце вялікую пошукавую працу ў Маскве. Яна ўжо дала свае вынікі?**

— У Маскве мы па крупінках збіралі звесткі. Шмат людзей, якія ведалі Панамарэнку, памерлі ўжо. Адны яго хваляць, іншыя — лаюць. Вялікай дапамогай для мяне і нашай групы было тое, што мы наведалі сям'ю Панамарэнкі ў Маскве, яго ўнучку, кватэру на Кутузаўскім праспекце. Мы ім кажам : "Нам усё цікава з вашага жыцця." А яны адказваюць: "У нас раней прыслуга была, а потым усё абарвалася... Нам усё прыйшлося рабіць самім..."

**— Гэтыя кадры таксама ўвойдуць у ваш фільм?**

— Я думаю, што сінхронныя інтэрв'ю ўвойдуць. Я хачу пабываць на лецішчы ў Панамарэнкі. Там у іх цэлы склад архіўнага матэрыялу. Каласальную дапамогу ў працы аказвае дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Селяменеў і супрацоўнік гэтага архіва Віталь Скалабан. Дарэчы, яны з'яўляюцца аўтарамі сцэнарыя фільма. Мы жадаем зрабіць фільм для жыхароў Беларусі, каб ён стаў сапраўды знакавым. Я працую з вялікай аддачай, не зважаючы ні на што.

**— Калі фільм выйдзе на вялікі экран?**

— Недзе да канца жніўня фільм будзе гатовы. Вядома, для любога кінематаграфіста, журналіста, як сказаў вялікі рэжысёр Эйзенштэйн, "кінематограф — гэта мантаж". Таму я цяпер у пошуках архіўнага матэрыялу, чакаю з нецярпеннем, калі ўсе плёнкі лягуць на мантажны стол, і я пачну манціраваць карціну. Гэта будуць самыя хвалюючыя моманты, таму што цяпер ёсць вялікая колькасць матэрыялу, але ў фільм увойдзе не ўсё.

**— Напэўна, сярод чытачоў "ЛіМа" ёсць людзі, якія ведаюць нешта цікавае аб жыцці Панцеляймона Панамарэнкі і могуць распавесці пра гэта, патрапіць у фільм?**

— Я хацеў бы звярнуцца вось з якой просьбай — дапамажыце мне як рэжысёру, у стварэнні гэтай карціны. Асабліва каштоўны фатаграфічны матэрыял, дзе Панамарэнка паўстае ў розныя перыяды свайго жыцця і дзейнасці. Я не хачу цяпер пераказваць змест карціны. Нейкія важныя моманты мне хочацца захаваць у таямніцы, каб людзі проста пайшлі на фільм, паглядзелі і адкрылі для сябе шмат новага. Велізарнае жаданне і прафесійны досвед будуць гарантыяй таго, што фільм павінен атрымацца, і яго будуць глядзець з цікавасцю. Мне, ва ўсякім разе, так хацелася б.

# Ззянне радкоў Івана Пехцерава

**У Магілёўскім абласным Палацы культуры адбыўся юбілейны вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Івана Ягоравіча Пехцерава. Яго арганізавала і правяло абласное ўпраўленне культуры.**

Запрошаныя на вечар перш чым прайсці ў глядзельную залу, падоўгу затрымліваліся ля кніжнай выставы краязнаўчага аддзела абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна "Літаратурная Магілёўшчына". На двух стэндах дэманстраваліся выданні твораў Аркадзя Куляшова, Аляксея Пысіна, Івана Чыгрынава, Алеся Пісьмянкова, Васіля Хомчанкі, Віктара Карамазава, Міхася Стральцова, Сцяпана Гаўрусёва, Леаніда Левановіча, Аляксандра Цераха-ва, Васіля Рагаўцова ды іншых літаратараў Магілёўскага краю. А на паліцах трэцяга стэнда былі выстаўлены на агляд зборнікі юбіляра Івана Пехцерава і літаратура пра яго жыццёвы шлях і творчасць. Сярод іншых вылучаліся кнігі "Святыни сердца моего", "Белый праздник берёз", "Луговые росы", "Васильковое слово полей".

Юбіляра віншавалі намеснік старшыні аблвыканкама Анатоль Глаз, які ўручыў паэту Ганаровую грамату аблвыканкама, начальнік упраўлення ідэалагічнай работы аблвыканкама Валерый Ільянкоў, старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Дуктаў — аб'явіў, што юбіляру прысуджана абласная літаратурная прэмія імя Аляксея Пысіна за кнігу "Окно во все времена", намеснік старшыні гарвыканкама Фёдар Міхеенка, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, прафесар Леанід Іваноў, старшыня камісіі па ідэалагічнай і культурна-масавай рабоце гарадскога савета ветэранаў Іван Круцякоў, дырэктар абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна Ала Васіленка, прадстаўнікі дэлегацый Клімавіцкага і Бабруйскага раёнаў і інш.

У канцэртнай праграме прынялі ўдзел ансамбль народнай музыкі, песні і танца "Магілёўцы", вакальны ансамбль "Прымакі", народны ансамбль народнай песні і танца "Субацея", народны ансамбль танца "Сувенір", узорны харэаграфічны ансамбль "Калейдаскоп", народны ансамбль эстраднага танца "Лайт-данс", аркестр народных інструментаў Магілёўскай абласной філармоніі, народны ансамбль песні і танца Бабруйскага раёна.

На вечарыне быў паказаны ўрывак з драматычнай паэмы Івана Пехцерава "Не на крови, а на любви" ў пастаноўцы народнага тэатра Палаца культуры вобласці (рэжысёр Ала Кускова).

Вершы Івана Пехцерава звонкія і меладычныя. Яны лёгка кладуцца на музыку. Кампазітары стварылі на словы паэта больш як 100 песень, якія спяваюць на магілёўскіх канцэртах, на дажынках і нават у Расіі.

**Віктар АРЦЕМ'ЕЎ**

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

*Рэдакцыйная калегія:*
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Дзмітрый Лыбін
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

*Адрас рэдакцыі:*
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

*Тэлефоны:*
галоўны рэдактар,
намеснік – 284-66-73

*Аддзелы:*
публіцыстыкі – 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі – 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі – 284-44-04
прозы і паэзіі– 284-44-04
мастацтва – 284-82-04
бухгалтэрыя – 284-66-72
Тэл./факс – 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

*Выдавец:*
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3567
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 4.06.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ – 2891

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686